WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 КАСТРЫЧНІКА 2009 г.
АЎТОРАК
№ 188
(26546)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ЗМЕНЛІВЫ НОРАЎ ВОСЕНІ

Калі ўначы на сераду да мінус 3, то ўдзень у чацвер да 22 цяпла

На працягу ўсяго тыдня ў Беларусі будзе гаспадарыць няўстойлівае надвор'е, часам з дажджамі, замаразкамі і кароткачасовай цеплынёй, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава.

Сёння ўдзень ападкаў не будзе, тэмпература 9—15. А вось у сераду атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы прынясе да нас сур'ёзныя дажджы. Уначы на 7 кастрычніка 1—6 цяпла, але ў многіх раёнах на глебе, а месцамі і ў паветры замаразкі да 0 — мінус 3, удзень 9—15, у Брэсцкай вобласці — 16—21 цяпла.

У чацвер да нас завітае мяккае і вільготнае паветра з паўднёвага захаду Еўропы і стане цяплей. Пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы 7—14, удзень 12—19, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях да 22 цяпла. У пятніцу ўначы 7—14, удзень 9—15, у Гомельскай вобласці да плюс 18.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, ужо ў суботу зноў пахаладае. Тэрыторыя краіны трапіць у зону павышанага ціску, таму ападкаў не будзе. Уначы 1—7 цяпла, месцамі замаразкі да 0 — мінус 3, удзень плюс 7—14. У нядзелю пройдуць невялікія дажджы. Удзень ад 7 на поўначы да плюс 16 на паўднёвым усходзе Беларусі.

Сяргей КУРКАЧ.

ДА ПАЧАТКУ ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў НАШАЙ КРАІНЕ ЗАСТАЛОСЯ 8 ДЗЁН

Усе пытанні, што ўзнікаюць па яго правядзенні, можна ўдакладніць па наступных тэлефонах:

8 801 100 30 30 (званкі для насельніцтва бясплатныя), а таксама ў гарадах:

г. Брэст 8 0162 20 53 90, 8 0162 20 31 88
г. Віцебск 8 0212 42 54 37
г. Гомель 8 0232 74 57 25
г. Гродна 8 0152 41 78 15
г. Мінск 8 017 294 55 45
г. Магілёў 8 0222 22 49 19

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «ФПБ павінна больш настойліва дабівацца абароны правоў працаўнікоў»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 5 кастрычніка правёў рабочую сустрэчу са старшынёй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леанідам Козікам, які праінфармаваў кіраўніка дзяржавы аб сітуацыі ў прафсаюзным руху.

Беларускія прафсаюзы актыўна працуюць сумесна з кіраўніцтвам суб'ектаў гаспадарання над выкананнем планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Нават у складаны перыяд пераадолення наступстваў сусветнага эканамічнага крызісу прафсаюзы імкнуцца зрабіць усё, каб захаваць людзям рабочыя месцы і зарплату. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў актыўнасць ФПБ у гэтым напрамку. На думку Аляксандра Лукашэнкі, прафсаюзы Беларусі «павінны яшчэ больш настойліва дабівацца абароны правоў працоўных».

Прэзідэнт закрануў пытанні кантрактнай формы найму і папрасіў кіраўніка ФПБ далажыць аб выніках дзесяці гадоў функцыянавання кантрактнай сістэмы ў Беларусі. Леанід Козік паведаміў аб адпаведным маніторынгу, праведзеным прафсаюзамі. Паводле яго звестак, сёння ў Беларусі больш за 30 працэнтаў кантрактаў заключаюцца на тэрмін больш як 3 гады, 35 працэнтаў — да 5 гадоў.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў поспехі, якіх дабілася ФПБ па аптымізацыі кантрактнай сістэмы ў краіне. Напрыклад, у свой час прафсаюзы ўнеслі прапанову, каб жанчыне, якая мае дзіця і знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску, кантракт прадаўжаўся не менш як да тэрміну дасягнення дзіцем пяцігадовага ўзросту, а таксама аб тым, каб з пенсіянерамі кантракт заключаўся не менш як за тры гады да іх выхаду на пенсію). Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў неабходнасць рухацца далей у гэтым працэсе. У прыватнасці, у выпадках, калі чалавек працуе добрасумленна, не парушаючы працоўнай дысцыпліны і актыўна ўдзельнічаючы ў жыцці калектыву, мэтазгодна прадаставіць яму права працаваць далей на кантрактнай аснове або перайсці на бестэрміновы працоўны дагавор.

Акрамя таго, Прэзідэнт падтрымаў прапанову ФПБ аб павышэнні памеру мінімальнай заработнай платы да ўзроўню бюджэту пражытковага мінімуму. Раней Беларусь займала ў гэтым плане лідзіруючую пазіцыю ў СНД (суадносіны мінімальнай заработнай платы і бюджэту пражытковага мінімуму складалі 1:1, у той час як сёння МЗП роўная 0,93 ад БПМ). У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ім будуць дадзены адпаведныя ўказанні па выпраўленню сітуацыі.

Акрамя гэтага, кіраўнік дзяржавы адзначыў неабходнасць удзяляць больш увагі перакваліфікацыі тых людзей, якія маюць няпоўны рабочы тыдзень і хацелі б асвоіць іншую прафесію.

Леанід Козік выказаў заклапочанасць становішчам на Мінскім мотавелазаводзе. Раней прафсаюзы атрымалі запэўненне ад кіраўніцтва завода ў захаванні рабочых месцаў. Аднак сёння відавочна, што працэс аднаўлення прадпрыемства ідзе вельмі марудна. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка даручыў Федэрацыі прафсаюзаў і ў далейшым кантраляваць сітуацыю і праз некаторы час далажыць, што зроблена на заводзе для стабілізацыі ўмоў працы.

Старшыня ФПБ таксама праінфармаваў Прэзідэнта аб выкананні іншых яго даручэнняў: у прыватнасці, аб будаўніцтве жылля і аб развіцці дзіцячага аздараўлення. Леанід Козік падзякаваў кіраўніку дзяржавы за тое, што летась даў даручэнне захаваць пазагарадскі аздараўленчы фонд прафсаюзаў. Прэзідэнту было даложана, што ў гэтым годзе трыма дзіцячымі аздараўленчымі лагерамі стала больш. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў неабходнасць падтрымання ўсіх дзіцячых аздараўленчых лагераў у поўным парадку.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НА ВЯЛІКУЮ РЫБУ...

ЗАРОБКІ. ТОЛЬКІ ПОТЫМ — «КАМУНАЛКА»

Своеасаблівымі «прыкметамі» гэтага года сталі меншыя тэмпы павелічэння намінальнай зарплаты плюс высокая інфляцыя. Як сведчыць статыстыка, упершыню за шмат часу адзначана замаруджванне росту рэальных заробкаў. У цэлым па Беларусі ўзровень аплаты працы не прайграў, але па сутнасці і не выйграў «спаборніцтва» з цэнамі. У сувязі з гэтым пытанне іх рэгулявання застаецца па-ранейшаму актуальным. У прыватнасці, як адзначыў падчас Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях першы віцэ-прэм'ер Уладзімір СЯМАШКА, чарговае павышэнне тых жа камунальных тарыфаў можа адбыцца толькі пры адной умове — павышэнні заробкаў.

«Рэкорд» за імпартнымі лекамі

Паводле звестак статыстыкі, у цэлым за студзень—жнівень сярэдняя намінальная зарплата ў краіне павялічылася на 15,4, а сярэдняя зарплата бюджэтнікаў — на 12 працэнтаў. Разам з тым, высокай была і інфляцыя. Як вынік, зноў жа ў цэлым па Беларусі рэальныя, з улікам змянення цэнаў, заробкі адносна аналагічнага перыяду летась узраслі ўсяго на 1,1 працэнта. А рэальныя заробкі работнікаў большасці бюджэтных галін увогуле зменшыліся.

— Сёлета захоўвалася дзяржаўнае рэгуляванне цэнаў на камунальныя паслугі, газ, паліва, электраэнергію, медыкаменты, у пэўнай ступені стрымліваліся цэны на сацыяльна значныя тавары, — кажа **намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Андрэй ЛУК'ЯНОВІЧ.** — У той жа час за студзень—жнівень у параўнанні з аналагічным перыядам летась тарыфы на камунальныя паслугі павялічыліся ў сярэднім амаль на 20, а індэкс цэнаў на харчовыя тавары склаў 16,1 працэнта. Прычым у СНД па «доларавым» эквіваленце мінімальны спажывецкі кошт, разлічаны на 1 чалавека, у сярэднім склаў 102,7 долара, а ў Беларусі — 91 долар. Сярэдні памер пенсіі ў краіне — 102,8 долара, а ў Расіі — 230, у Казахстане — 150, у Азербайджане — 120, ва Украіне — 100, у Арменіі — 80.

— Сапраўды, «мінімалка» — пытанне грошай, — заўважае **старшыня ФПБ Леанід КОЗІК.** — Але ў той жа час нельга казаць, што павышэнне мінімальнай зарплаты прыносіць выключна «страты». Не сакрэт, што многія прыватныя фірмы афіцыйна плацяць работнікам толькі той жа мінімальны заробак. А заробак асноўны выдаюць у «канвертах», прычым, зразумела, «канвертныя» выплаты не абкладаюцца падаткамі, з іх не адлічваюцца ўзносы дзяржаўнага сацыяльнага страхавання. Таму мы перакананыя: павелічэнне памеру «мінімалкі» адначасова прывядзе да павелічэння паступленняў у бюджэт і ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

Вытворца пашукае сам?

Ці ўдасца стрымаць рост цэнаў надалей — пытанне асобнае. І даволі складанае. Пакуль цэны на газ і іншыя імпартныя энерганосьбіты на наступны год невядомыя. Беларусь будзе настойваць на іх захаванні на цяперашнім узроўні, аднак не выключана, што цэны ўсё ж узрастуць. І калі гэта адбудзецца, з'явяцца ўсе падставы для павелічэння тых жа жыллёва-камунальных тарыфаў. Тым больш, што ўжо цяпер працэнт аплаты насельніцтвам сабекошту «камуналкі» атрымліваецца ніжэйшы за вызначаны прагноз.

Напэўна, адзіны варыянт у гэтых варунках — «кампенсацыя» магчымага росту цэнаў заробкамі. Паводле слоў **першага намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяны ШЧОТКІНАЙ,** ужо цяпер падрыхтаваныя прапановы па павышэнні «бюджэтнай» тарыфнай стаўкі I разраду і пенсій. Канкрэтныя лічбы тут знаходзяцца ў стадыі абмеркавання, але гаворка ідзе аб «зрухах» менавіта сёлета. Плюс да таго Міністэрства працы і сацыяльнай абароны выступае з ініцыятывай павялічыць «мінімалку» — прапановы на гэты конт таксама накіраваныя ў Савет Міністраў. Менш пэўнасці з вытворцамі.

— Па выніках студзеня—жніўня ў Беларусі адзначана зніжэнне ВУП на 0,5 %, у параўнанні з аналагічным перыядам летась зменшыліся аб'ёмы прамысловай вытворчасці, — адзначае першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка. — І ў гэтых варунках разважаць аб значным павышэнні зарплаты тым жа работнікам прамысловасці — гэта ўтопія. Калі такое адбудзецца, большасць прадпрыемстваў «праесць» фонды і паставіць пад пытанне сваю будучыню. Прычым для тых жа перспектыў важна не проста захаваць вытворчасць, але і ні ў якім разе не спыніць інвестыцыйныя працэсы. Інакш кажучы, неабходна ўкладваць сродкі ў мадэрнізацыю.

СТАР. 4

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

СУМЯШЧАЛЬНІКАМ — «ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО»?

У найбліжэйшы час плануецца разгледзець шэраг прапаноў па пашырэнні магчымасцяў для часовых заробкаў работнікам, якія занятыя ў няпоўным рэжыме па ініцыятыве наймальніка. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай КОХАНАЎ.

У прыватнасці, сёння вывучаецца пытанне аб зняцці абмежаванняў для работнікаў, якія знаходзяцца ў вымушаных водпусках па ініцыятыве наймальніка без утрымання, на занятасць па сумяшчальніцтве. Прапануецца, каб такія работнікі маглі працаваць па сумяшчальніцтве поўны працоўны дзень. Паводле цяперашняга Працоўнага кодэкса, нагадаў Мікалай Коханаў, час сумяшчальніцкай працы не можа перавышаць 20 гадзін у тыдзень.

Сяргей ГРЫБ.

МІНЧАНІН ГОДА ЎЗНАЧАЛІЎ ХАКЕЙНУЮ ЗБОРНУЮ УКРАІНЫ

Галоўны трэнер мінскага «Юнацтва» Міхаіл Захараў зацверджаны на пасаду настаўніка нацыянальнай хакейнай зборнай Украіны.

Рашэнне прынята на пасяджэнні выканкама федэрацыі хакея Украіны. Галоўны трэнер мінскага «Юнацтва» стаў пераможцам у конкурсе на пасаду галоўнага трэнера ўкраінцаў, апярэдзіўшы канадца Майка Крушальніцкі і расіяніна Уладзіміра Плюшчава. Нядаўна Міхаіл Захараў атрымаў яшчэ адну перамогу — яму было прысвоена ганаровае званне «Мінчанін года». Як паведаміў Міхаіл Міхайлавіч, ён па-ранейшаму будзе кіраваць і «Юнацтвам». Заўважым, што ўжо другі беларускі спецыяліст апошнім часам узначаліў замежную зборную. У канцы жніўня работу з хакеістамі нацыянальнай каманды Кітая пачаў былы нападаючы «Юнацтва» і зборнай Беларусі Андрэй Кавалёў.

Іван КАХНОВІЧ, «Мінск—Навіны».

МАНЕТЫ З ГАЛАГРАМАЙ

Нацыянальны банк Беларусі з учарашняга дня ўвёў у абарачэнне памятныя манеты «Дар Поможа (Dar Pomorza)» серыі «Парусныя караблі», паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка ўпраўлення галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.

Сярэбраная манета мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925, масу 28,28 г, медна-нікелевая — намінал 1 рубель. На пярэднім баку сярэбранай манеты ў цэнтры на фоне навігацыйнай марской карты размешчана стылізаваная выява ружы вятроў з нанесенай на яе галаграмай.

Манеты адчаканены на АТ «Манетны двор Польшчы» якасцю «брыльянт—анцыркулейтэд». Тыраж сярэбранай манеты — да 25000 штук, медна-нікелевай — 5000 штук.

Ігар ГРЫШЫН.

БЫКУ НА РОГІ

трапіла пастух КСУП «Колпень агра». Жывёліна нанесла смяротныя траўмы 52-гадовай жанчыне. Яна памерла ў бальніцы пасля аперацыі, не прыходзячы ў прытомнасць.

Цяпер праводзіцца праверка па гэтым факце. Пакуль што вядома, што работніца пайшла на поле не ў сваю начную змену і была апранута ў аранжавую куртку, калі здарылася трагедыя на пашы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПАДПАЛЬШЧЫЦА МУЖА ЗАТРЫМАНА

Бабруйчанка 1953 года нараджэння, знаходзячыся ў сваёй жа кватэры, паквапілася на жыццё ўласнага мужа.

— Яна абліла мужчыну растваральнікам і падпаліла, — расказвае старшы памочнік пракурора Магілёўскай вобласці Ала КУЗНЯЦОВА. — На дапамогу бацьку прыйшоў сын: затушыў адзенне, якое гарэла на ім, і выклікаў «хуткую». Пацярпелы з апёкамі шпіталізаваны. Заведзена крымінальная справа.

Надзея ДРЫЛА.

ВЫЦЯГНУЛІ З КАЛОДЗЕЖА ЮНАКА

40 хвілін прастаяў у халоднай вадзе 15-гадовы юнак, які ў Рэчыцы выпадкова перакуліўся ў звычайны вясковы калодзеж глыбінёй 10 метраў.

Калі па ваду прыйшла мясцовая жыхарка, яна ўбачыла хлопца і выклікала службу МНС. Выратавальнікі выцягнулі небараку з дапамогай пажарнай вяроўкі і выратавальнага пояса. Пераахалоджанне — такі дыягназ паставілі медыкі вымяральніку калодзежных глыбіняў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ТЕЛЕФОННАЯ ЮРИДИЧЕСКАЯ СЛУЖБА

Консультации по телефону
8 902 101 9 101
по вопросам трудового, жилищного, брачно-семейного, административного, уголовного, гражданского права оказывают адвокаты Минской городской и областной коллегий адвокатов
Стоимость минуты 1800 руб., для абонентов VELCOM 2100 руб.
Время работы
рабочие дни с 9.00 до 20.00, суббота с 9.00 до 17.00

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАВОДКА ДАКАЦІЛАСЯ ДА ІНДЫІ

У Індыі ў выніку паводкі загінулі больш за 230 чалавек.

Бяздомнымі з-за стыхіі засталіся каля 1,5 мільёна чалавек. Мацней за іншыя пакутаваў штат Карнатака. Там паводка разбурыла 200 тысяч дамоў, у сувязі з чым жылля пазбавіліся прыкладна мільён чалавек. 350 тысяч пацярпелых ужо ўладкаваныя ў 1200 часовых лагерах. У той жа час BBC News паведамляе пра значна большую колькасць бяздомных. Па іх інфармацыі, жылля ў выніку паводак толькі ў Карнатацы пазбавіліся 10 мільёнаў чалавек.

ААН ПРАДКАЗАЛА СКАРАЧЭННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА РАСІІ

Дэмаграфічны крызіс у Расіі прывядзе да скарачэння колькасці працоўных і, як вынік, тармажэння эканамічнага развіцця. Паводле справаздачы ААН, з 1993 года насельніцтва краіны скарацілася на 6,6 мільёна чалавек. Спецыялісты міжнароднай арганізацыі прагназуюць, што да 2025 года Расія страціць яшчэ 11 мільёнаў грамадзян.

Па звестках спецыялістаў, насельніцтва РФ скарачаецца з 1992 года і цяпер складае каля 142 мільёнаў чалавек. Пры гэтым расійскі паказчык смяротнасці адзін з самых высокіх сярод развітых краін, а сярэдняя працягласць жыцця мужчын не перавышае 60 гадоў. Адной з асноўных прычын смяротнасці ў Расіі названы высокі ўзровень захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы. Спецыялісты ААН лічаць, што высокія паказчыкі смяротнасці выкліканыя празмернай алкагалізацыяй насельніцтва, якая прыводзіць да росту колькасці захворванняў печані, забойстваў і самагубстваў, а таксама смяротных выпадкаў, якія адбываюцца ў выніку розных здарэнняў. Нізкая нараджальнасць і высокая смяротнасць прывядзе да скарачэння колькасці працоўных грамадзян. Паводле адзнак ААН, да 2025 года Расіі спатрэбіцца каля 15 мільёнаў працоўных мігрантаў, каб запоўніць вакантныя працоўныя месцы.

ВА УКРАІНЕ СКЛАЛІ РЭЙТЫНГ НАЙБУЙНЕЙШЫХ ХАБАРАЎ

Украінскія праваахоўныя органы склалі рэйтынг самых буйных хабараў, якія трапілі ў поле іх увагі.

Першае месца рэйтынгу займае крымінальная справа аб вымаганні старшынёй сельскай рады Нікалаеўскай вобласці 8,5 мільёна грыўняў (больш за мільён долараў). Вымагальнік быў затрыманы. На другім месцы — справа аб вымаганні старшынёй сельсавета ў Крыме 1,1 мільёна долараў. Расследаванне па гэтай справе яшчэ працягваецца. Трэцяе месца займае справа старшыні аднаго з сельскіх Саветаў пад Кіевам. Службовец вымагаў 3,95 мільёна грыўняў. Усяго міліцыянеры раскрылі 14 выпадкаў вымагання хабару, сума кожнага з іх большая за мільён.

УРУЧАНАЯ НОБЕЛЕЎСКАЯ ПРЭМІЯ ПА ФІЗІЯЛОГІІ І МЕДЫЦЫНЕ

У Стакгольме абвешчаныя лаўрэаты Нобелеўскай прэміі ў намінацыі «медыцына і фізіялогія».

Узнагарода прысуджаная Элізабэт Блэкберн, Джэку Шостаку і Кэрал Грэйдэр за даследаванне механізмаў старэння клетак і абароны храмасомаў ад дэградацыі пры дапамозе целамер і ферменту целамеразы. Сума Нобелеўскай прэміі гэтага года складае ў кожнай намінацыі 10 мільёнаў шведскіх крон (975 тысяч еўра).

ДЗЕНЬ НАРОДЗІНАЎ «ГАРБАТАГА»

49-годдзе выпуску першага ўкраінскага аўтамабіля ЗАЗ-965 адсвяткавалі энтузіясты з львоўскага аўтафан-клуба «ЗАЗ-КОЗАК».

Звыш 300 дзяцей са школ-інтэрнатаў і дзіцячых дамоў Львоўшчыны, якіх запрасілі на «Дзень народзінаў гарбатага «Запарожца», паспрабавалі перасягнуць дасягненне з «Кнігі рэкордаў Украіны» па ёмістасці салона знакамітай малалітражкі. На жаль, рэкорд трохгадовай даўнасці (тады ў аўто ўмясціліся 24 дзіцяці, агульная вага якіх была 895 кг) выстаяў.

ВА УКРАІНЕ ЁСЦЬ «БРАТ» НЯСВІЖСКАГА ЗАМКА!

Карэспандэнт «Звязды» наведаў рэзідэнцыю Радзівілаў Алыка на Валыншчыне

Фердынанд і Пелагея РАДЗІВІЛЫ выходзяць з касцёла ў Алыцы ў час свайго залатога вяселля. 1914 год.
Фота друкуюцца ўпершыню.

СТАР. 6

ЖОНКА ПАДВЯЛА

Дырэктар Баранавіцкага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Памяць» сеў з сям'ёй у службовы мінівэн «Опель — Зафіра» і паехаў адпачываць ва Украіну.

Вярнуўшыся праз 12 дзён дамоў, дырэктар напісаў заяву бухгалтару з просьбай, каб з яго зарплаты ўтрымалі 140 тысяч рублёў. Гэтым самым дырэктар хацеў пакрыць затраты за арэнду аўтамашыны.

Але супрацоўнікі дзяржкантролю вызначылі, што прадпрыемства панесла страты ў памеры 2,5 мільёна рублёў, бо выкарыстанне аўтамашыны ў паездках па горадзе каштуе 20—58 тысяч рублёў за гадзіну.

Кіраўнік «Памяці» спрабаваў даказаць, што бензін для машыны ён купляў на свае грошы. Толькі праверкай было выяўлена, што на працягу 2 гадоў на прадпрыемстве не вёўся ўлік выкарыстання гаруча-змазачных матэрыялаў. Незаконна было выкарыстана 2 тоны паліва (800 літраў у выхадныя і святочныя дні), а гэта пацягнула амаль на 4 мільёны рублёў.

Дырэктар тлумачыў, што ўзяць службовую машыну яго прымусілі абставіны, ды і жонка на гэтым настаяла. Цяпер у «Памяці» новы кіраўнік, а матэрыялы праверкі вывучаюць праваахоўныя органы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

АУКЦИОН

**ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ЗЕНИТ – БЕЛОМО»
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже следующих зданий (цены снижены на 50 %): **Лот № 1:** здание специализированное розничной торговли (пристройка к дому), об. пл. 1576,5 кв.м, **г. Вилейка, ул. Чапаева, 60. Начальная цена с НДС – 379 339 416 бел. руб.** Задаток – 35 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,1007 га. **Лот № 2:** здания специализированные складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ – здание склада ЛВЖ, об. пл. 684,9 кв.м, здание кислотного склада, об. пл. 196,5 кв.м, **г. Вилейка, ул. Красина. Начальная цена с НДС – 846 143 819 бел. руб.** Задаток – 50 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,4619 га, имеется ж/д ветка. **Лот № 3:** здание специализированное для производства электротехнического, электронного и оптического оборудования (производственный корпус № 7 с АБК), об. пл. 19605,9 кв.м, **г. Вилейка, ул. Чапаева, 26. Начальная цена с НДС – 5 521 767 668 бел. руб.** Задаток – 100 000 000 бел. руб. Земельный участок для обслуживания данного здания будет выделен из земельного участка об. пл. 10,3339 га, находящегося в постоянном пользовании ОАО «Зенит – БелОМО». Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней после проведения аукциона. **Оплата за объект производится в следующем порядке: 50 % стоимости объекта оплачивается в течение 10 дней с даты подписания договора купли-продажи, оставшиеся 50 % в течение 30 дней с даты подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором.** Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **13.10.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.10.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.**

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.10.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼1 долар ЗША	2 763,00
▲1 еўра	4 039,78
1 латвійскі лат	5 699,85
1 літоўскі літ	1 170,12
1 чэшская крона	158,63
1 польскі злоты	957,00
▼1 расійскі рубель	91,86
1 украінская грыўня	329,91

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	30,0785
UAH	35,8077
1000 BYR	10,8547
EUR	44,0259

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Канструктыўны дыялог Беларусі і Германіі будзе паспяхова прадаўжацца

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 3 кастрычніка павіншаваў Федэральнага Прэзідэнта Федэратыўнай Рэспублікі Германія Хорста Келера з нагоды нацыянальнага свята — Дня германскага адзінства.

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананне, што канструктыўны дыялог паміж дзвюма краінамі, які апошнім часам быў значна актывізаваны, будзе паспяхова прадаўжацца на аснове павагі і плённага ўзаемадзеяння для працвітання Беларусі і Германіі.

Фестываль Юрыя Башмета сцвярджае ў грамадстве высокія ідэалы духоўнасці і гуманізму

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4 кастрычніка павіншаваў удзельнікаў IV Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета з адкрыццём гэтага форуму.

«За параўнальна невялікую гісторыю свайго існавання гэты цудоўны форум ператварыўся ў адну з найбуйнейшых падзей культурнага жыцця Беларусі, заваяваў вялікі аўтарытэт і прызнанне тысяч людзей, — гаворыцца ў віншаванні. — Фестываль з гонарам выконвае важную місію сцвярджэння ў грамадстве высокіх ідэалаў духоўнасці і гуманізму, папулярызацыі лепшых дасягненняў сусветнай музычнай культуры, адкрывае маладыя таленты і дае ўсім нам унікальную магчымасць далучэння да творчага генія выдатных выканаўцаў сучаснасці».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Формула ўдачы

Пазамузычная рэчаіснасць

Галоўны альт Расіі, музыкант Юрый Башмет у Мінску ўнікаў у... рамонтныя справы. У Дзень настаўніка ён наведаў музычны ліцэй пры Беларускай акадэміі музыкі, дзе яшчэ не ўсе памяшканні дароблены пасля рамонту. І адзначыў, што любы музыкант і музыка ўвогуле пачынаецца менавіта са школы, дзе яго вучаць ствараць музыку.

Можа таму сёлета ў праграме фестывалю аддаецца шмат увагі маладым музыкантам?

— Самае галоўнае — тое, што мы нарэшце ўключылі ў праграму Моладзевую акадэмію краін СНД, — адзначыў Юрый Абрамовіч. Яна праводзіцца ўпершыню на постсавецкай прасторы. І нарадзілася тут, у Мінску, пры магутным разуменні першых асобаў нашых краін. Гэта вельмі прыемна, і вельмі каштоўны знак. Значыць, мы не толькі музыкай займаемся, а думаем пра будучыню нашых краін, пра іх культуру. Я лічу, што ўсе сродкі добрыя, каб прыцягнуць да класічнай музыкі немузыкантаў. Ведаеце, я падтрымліваю Ванэсу Мэй — дзякуючы мокрай сукенцы і электраскрыпцы людзі даведваюцца пра Вівальдзі. Калі Баха выконваюць на сінтэзатары, то гэта лепш, чым калі б яго не выконвалі зусім. Любыя сродкі добрыя, каб дзеці не сядзелі ў дыскатэках і не напіваліся.

На пытанне: што рабіць, калі не хочацца іграць, маэстра адказаў так:

— Мне гэта невядома. Апетыт прыходзіць падчас ігры. Таму што гэта сэнс жыцця. Калі іграеш, цяжка сказаць, дзе жыццё, дзе не жыццё. Калі ты злучыўся з музыкай, то рэчаіснасць становіцца іншай, а бытавыя паняцці афарбоўваюцца і становяцца лепшымі. У такі момант галоўнае — жывым пайсці са сцэны...

Але бывае, што хочацца паспрабаваць сябе ў новай ролі...

— У мяне прапаноў наконт здымкаў у кіно было шмат, — кажа Юрый Башмет. — Пачынаючы ад «Крэйцаравай санаты» Швейцара, потым «Вочы чорныя» Мікіты Міхалкова. Хацелі здымаць фільм пра Паганіні з маім удзелам. У двух праектах я прайшоў пробы. Але прыйшоў час гастроляў па Японіі. Гэта мая прамая дзейнасць. Натуральна, кіно давялося ахвяраваць. І вось Сяргей Салаўёў, мой даўні сябар, запрасіў мяне папіць кавы. Я адразу яму патлумачыў, што пра здымкі гаворкі быць не можа, бо гэта нерэальна. «Але проста папіць кавы ты можаш?..» Ён прыйшоў з маім гастрольным планам на год. Я вымушаны быў пагадзіцца на ўдзел у фільме «Аса-2». Атрымаў задавальненне ад зносінаў з акцёрамі. Там у мяне няма інтымных сцэн, але трэба было пацалаваць жанчыну, з якой я сябрую 20 гадоў, — Тацяну Друбіч. Першы раз мы пацалаваліся натуральна, хоць пацалунак павінен быў выглядаць палка. Другі дубль, трэці... Калі я потым глядзеў гэта збоку, то адчуваў, што ёсць тут ненатуральнасць. Хоць атрымаўся камерны фільм, які патрабуе канцэнтрацыі гледача...

Я заўсёды кажу, што якімі б цікавымі ні былі іншыя справы — кшталту арганізацыя фестывалю — не трэба забывацца пра тое, што тваё прызначэнне — быць на сцэне. Гэта мне аднойчы растлумачыў Мсціслаў Растраповіч. Аднойчы мы з ім рэпеціравалі ў Вашынгтоне. Ён быў у дрэнным настроі — яму не падоўжылі кантракт, паводле якога ён быў галоўным дырыжорам аркестра. Тэрмін скончыўся, але новы кантракт не заключылі. Ён мне сказаў: не кідай свой інструмент, іграй, колькі зможаш. З аркестрамі ўсялякае здараецца...

Аднак фестываль Башмета ў Мінску адчувае сябе ўтульна.

— Тут ёсць надзейнасць, — адзначыў Юрый Абрамавіч. — Ёсць бытавыя рэчы, якія маглі б быць лепшымі. Недастаткова гарачая вада, але гэта можна перажыць. Кормяць вельмі смачна. Адчуваю сілу, якая нас падтрымлівае. Заўсёды атрымліваем прывітальнае слова Прэзідэнта — гэта і ёсць тая сіла.

Хацелася б спадзявацца на тое, што дзякуючы гэтаму фестывалю мы далей зможам не толькі бачыць і слухаць выдатных выканаўцаў акадэмічнай музыкі з-за межаў, але і разумець, што музычнае мастацтва нашай краіны таксама павінна прыходзіць да людзей. Што ў Беларусі ёсць свае цудоўныя музыканты, якім патрэбная ўвага, што нашы кампазітары могуць пісаць цікавую сучасную музыку. Дарэчы, на папярэдніх фестывалях яе можна было пачуць, калі, напрыклад, на адкрыцці выконваўся беларускі твор...

Расціслаў Крымер, мастацкі кіраўнік фестывалю, патлумачыў: «Кожны фестываль прыносіць нешта новае. Гэтая ідэя будзе жыць яшчэ доўга, магчыма, у наступным годзе. Беларусь выдатна выглядае на гэтым фестывалі — 5 беларускіх музыкантаў удзельнічаюць у Міжнароднай акадэміі краін СНД. Беларусь выглядае на фестывалі цудоўна».

Ларыса ЦІМОШЫК.

Фота БЕЛТА.

НАША СВЯТЫНЯ

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

ЗА ЎСЕ ГАДЫ СВАЙГО ПРЭЗІДЭНЦТВА Я НІ РАЗУ НЕ ДАЗВАЛЯЎ САБЕ ЗАЙСЦІ Ў ПУШЧУ СА СТРЭЛЬБАЙ. І ГЭТАГА Ж ПАТРАБУЮ АД ІНШЫХ ВЫСОКІХ ЧЫНОЎНІКАЎ

3 кастрычніка ў Белавежскай пушчы прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя 600-годдзю надання пушчы запаведнага статусу.

Свята праходзіла на Царскай паляне ў глыбіні ляснога масіву. І хоць гэта далекавата ад адміністрацыйных будынкаў і туды можна было даехаць толькі на спецыяльна выдзеленым транспарце, людзей на паляне сабралася нямала. У Белавежскую пушчу прыехалі госці з розных рэгіёнаў Беларусі і суседніх краін. Самую вялікую дэлегацыю прыслала Польшча. Узначальваў яе намеснік міністра аховы прыроднага асяроддзя Януш Залескі. Сярод польскіх гасцей былі ваяводы, маршалкі, дэпутаты сейма — усяго 43 чалавекі. Гэта і зразумела, бо з польскім бокам Нацыянальны парк падтрымлівае самыя цесныя сувязі — пушча адна.

Выступленне Прэзідэнта Беларусі стала кульмінацыяй свята.

— Авеяная легендамі Белавежская пушча — апошні вялікі лес Еўропы, дзівосны помнік прыроды, які многія называюць адным з цудаў свету. І гэта сапраўды так! Гэта больш, чым цуд свету. Пушчай можна не толькі любавацца, а гэты спрадвечны свет, унікальны па біялагічнай разнастайнасці, можна выкарыстоўваць для здароўя людзей, — адзначыў кіраўнік дзяржавы, — гэта адзін з нацыянальных сімвалаў Беларусі, найвялікшы набытак і гонар народа.

У сваёй прамове Прэзідэнт падкрэсліў, што як кожны японец імкнецца пабываць на гары Фудзіяма, так і беларус хоць раз у жыцці павінен наведаць Белавежскую пушчу, бо гэта наша святыня.

І ў будучыні, напэўна, так і будзе. Паток турыстаў у пушчу расце з кожным годам, за апошні час іх пабывала тут 440 тысяч. Асабліва папулярны ў турыстаў зімовы перыяд, калі можна наведаць сядзібу Дзеда Мароза.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што запаведнік павінен служыць народу, яго будучыні, а не выкарыстоўвацца для палявання і забавы самаюўных асобаў, як гэта было ў розныя гістарычныя перыяды. Закрануўшы сённяшні дзень, Прэзідэнт падкрэсліў, што ў пушчы будаўніцтва весціся не будзе, а вось у вёсках па перыметры Белавежскай пушчы — а гэта амаль 250 км — інвестары могуць набыць зямлю на ільготных умовах для стварэння інфраструктуры.

А асноўным матывам у прамове кіраўніка дзяржавы было захаванне Белавежскай пушчы ў яе спрадвечным выглядзе для наступных пакаленняў.

Аднак Беларусь славіцца не толькі Белавежскай пушчай. Ва ўсіх рэгіёнах краіны маюцца ўнікальныя прыродныя аб'екты: нацыянальныя паркі «Нарачанскі», «Прыпяцкі», «Браслаўскія азёры», Бярэзінскі біясферны запаведнік, заказнікі «Налібоцкі», «Альманскія балоты», «Сярэдняя Прыпяць» і іншыя. Усяго налічваецца каля паўтары тысячы асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторый, якія займаюць амаль 2 млн га. Гэта больш за 8 % ад агульнай тэрыторыі краіны. «Бадай, у Еўропе няма такой дзяржавы, дзе б удзельная вага прыродных запаведных месцаў была такой значнай. Беларусь упэўнена ўтрымлівае лідарства ў гэтым плане», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ўклад сучаснай Беларусі ў забеспячэнне экалагічнай бяспекі чалавецтва недаацэньваюць. «На жаль, не ўсе нашы замежныя партнёры разумеюць і па заслугах ацэньваюць уклад сучаснай Беларусі ў забеспячэнне экалагічнай бяспекі чалавецтва, тую напружаную працу і вялізныя выдаткі па падтрымцы парадку на прыродных тэрыторыях, якія ахоўваюцца», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, для эканомікі вельмі стратна вывядзенне з актыўнага гаспадарчага абарачэння і ўтрыманне ў ахоўным рэжыме такіх вялікіх тэрыторый. «Але мы на гэта ідзём. Таму што жывём не адным днём, а клапоцімся пра непаўторнасць і прыроднае багацце роднага краю, улічваем інтарэсы не толькі свайго народа і будучага пакалення беларусаў, але і ўсяго еўрапейскага рэгіёна», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Беларускія пушчы і лясы, азёры і рэкі самым дабратворным чынам уплываюць на клімат планеты, па праву лічацца лёгкімі Еўропы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што дзяржава і надалей будзе паслядоўна развіваць усю прыродна-запаведную гаспадарку. Аляксандр Лукашэнка прыняў рашэнне, што на захоўванне і стварэнне інфраструктуры запаведных месцаў Беларусі будзе накіроўвацца 5 % сродкаў фонду аховы прыроды. Гэтыя сродкі пачнуць паступаць ужо з 1 студзеня 2010 года. «Спадзяюся, вы, як руплівыя гаспадары, з карысцю іх выкарыстаеце», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Кіраўнік дзяржавы ўзяў удзел у цырымоніі адкрыцця адміністрацыйна-эканамічнага цэнтра з музеем прыроды.

Прэзідэнт Беларусі зрабіў запіс у Кнізе ганаровых гасцей. У дзень урачыстых мерапрыемстваў, 3 кастрычніка 2009 года, быў выпушчаны ў абарачэнне паштовы блок з трох марак. Падчас свята было арганізавана памятное гашэнне марак спецыяльным штэмпелем.

Калі раніцай было даволі зябка, то бліжэй да абеду надвор'е палепшылася і пушча павесялела пад сонцам.

На сцэну падымаліся танцоры і спевакі — свята працягвалася.

Дзяржаўны акадэмічны хор імя Г. Цітовіча змяніў знакаміты літоўскі ансамбль «Ліетува», пацешылі гледачоў і «Прымакі» з Польшчы. У гэты дзень беларускія песні гучалі часта. Ансамбль «Палац», Анжэліка Агурбаш, цыганскі ансамбль нагадалі прысутным, як хораша гучаць песні на роднай мове.

З першымі акордамі песні «Белавежская пушча», якая стала гімнам Нацыянальнага парку, на сцэну падняліся Аляксандра Пахмутава і Мікалай Дабранраваў — аўтары песні. Пасля таго, як паэт эмацыйна прачытаў свой верш, «Белавежская пушча» загучэла на поўную моц.

Ніводнае свята ў нас не абыходзіцца без народных майстроў. У Белавежскую пушчу яны з'ехаліся з усёй Беларусі. Вось Наталля Клапкова з Гомеля нешта пляце з лазы, а побач працуе яе каляжанка з Полацка.

Апошні беларускі дудар з Лунінца Мікалай Ярковіч іграе на дудках, якія сам і вырабляе з крушыны. А чаму апошні?

— А таму, што са старэйшага пакалення я застаўся адзін, — сказаў майстар. — Больш няма такіх, хто вырабляў бы дудкі.

Дудку, на якой ён іграе ўжо сорак гадоў, Ярковіч ацаніў у сто тысяч, а астатнія мог бы прадаць і за трыццаць. Але каб набыць тую дудку, трэба ўмець іграць.

Разьбяры па дрэве, вышывальшчыцы, ткачыхі, ганчары, кавалі стварылі тут не адну вуліцу майстроў.

На Царскай паляне можна было сустрэць жыхароў вёскі Камянюкі — і тых, хто працуе ў запаведніку, і тых, хто ўжо на пенсіі. Пазнаёміўся з Леанідам і Валянцінай Бірыцкімі. Леанід Іванавіч трыццаць гадоў адпрацаваў вадзіцелем у запаведніку. Іх дзеці таксама не пакінулі родныя мясціны. Сын у запаведніку працуе, а дачка — у санаторыі «Белая вежа», унукі пакуль яшчэ вучацца.

А як наконт жыцця? Калі лепш — сёння ці некалі?

— Цяпер лепш, бо парадку больш... — быў адказ.

Дарэчы, калектыў нацыянальнага парку даволі вялікі — 1299 чалавек, а калі ўлічыць іх сем'і і тых, хто ўжо на адпачынку, то атрымліваецца, што з пушчай звязалі сваё жыццё некалькі тысяч чалавек.

Напэўна, чытачам будзе цікава ведаць, якое пагалоўе звяроў у Белавежскай пушчы?

Найбольш тут аленяў — іх 1684, на другім месцы дзікі — 1635, казуляў — 500, зуброў — 364, лісіц — 333, ваўкоў — 21, рысяў — 17 і 76 ласёў.

Як бачым, у пушчы ёсць каго і што ахоўваць. І не дзіўна, што ражэннем ЮНЕСКА Белавежская пушча ўключана ў спіс Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны.

А якое ўражанне зрабіла пушча на замежнага госця, які ўпершыню апынуўся ў нацыянальным парку?

— Толькі даводзілася здзіўляцца, як хутка здолелі вы падняць гэты запаведнік да еўрапейскага ўзроўню, — сказаў Франк Юнг з Чэхіі.

Свята закончылася феерверкам.

Юбілеі праходзяць, а за імі настаюць будні. Калектыву нацыянальнага парку яшчэ неабходна шмат зрабіць, каб Белавежская пушча і надалей засталася візітнай карткай нашай краіны.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

Камянецкі раён.

МУС РЭКАМЕНДУЕ НЕ ПАКІДАЦЬ ПЕРАПІСЧЫКАЎ ДОМА БЕЗ НАГЛЯДУ

Упускаючы ў дом перапісчыкаў, трэба быць пільным і не пакідаць іх без нагляду. Гэта неабходна, каб пазбегнуць выпадкаў махлярства, грабяжоў, разбою, крадзяжоў і іншых злачынстваў пры правядзенні перапісу насельніцтва. Аб гэтым расказаў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення каардынацыі і метадычнага забеспячэння службовай дзейнасці галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС Ігар ГАТАЛЬСКІ**.

Адказваць на пытанні перапісчыкаў трэба толькі пасля таго, як яны пакажуць пасведчанне. «Закон дае грамадзянам права патрабаваць ад перапіснога персаналу адпаведнае пасведчанне. А ў выпадку адмаўлення паказаць дакумент — не адказваць на пытанні, якія змяшчаюцца ў перапісным лісце», — сказаў Ігар Гатальскі. Перапісчыкі павінны строга прытрымлівацца пераліку пытанняў, што пазначаны ў перапісным лісце.

Калі ў рэспандэнтаў узнікаюць сумненні ў сапраўднасці асобаў з ліку перапіснога персаналу, неабходна патэлефанаваць у тэрытарыяльную камісію па перапісе насельніцтва. Па тэлефоне можна ўдакладніць, ці ёсць сярод афіцыйнага персаналу такія людзі.

Кацярына НЯЧАЕВА, БЕЛТА.

Спорт-тайм

Першае паражэнне Сяргея ГУРЭНКІ

У выхадныя прайшлі матчы 22-га тура чэмпіянату краіны па футболе. Галоўны прэтэндэнт на сярэбраныя медалі сталічнае «Дынама» перарваў сваю пераможную серыю, якую распачаў пад кіраўніцтвам Сяргея Гурэнкі, саступіўшы салігорскаму «Шахцёру» (0:1). Мінчане атрымалі гол на 54-й хвіліне, але адыгравацца так і не здолелі, а небяспечных момантаў у выкананні віцэ-чэмпіёна так і не стала больш. Як справядліва заўважыў трэнер мінчан Сяргей Прыходзька, яго падапечныя быццам бы заблудзіліся ў лесе, з якога так і не здолелі выбрацца. У апошніх турах «Дынама» праэкзаменуюць сур'ёзныя супернікі, ад выніку матчаў з якімі і будзе залежаць лёс сярэбраных медалёў.

Чарговую перамогу атрымаў магілёўскі «Днепр», які на сваім полі выйграў у «Гомеля» (2:0), і пакінуў за сабой трэці турнірны радок. З аднолькавым разгромным лікам 4:0 перамаглі супернікаў у гасцях жодзінскае «Тарпеда» («Мінск») і МТЗ-РІПА («Смаргонь»). Сталічныя трактаразаводцы, дарэчы, захавалі за сабой месца ў вышэйшай лізе на наступны сезон, «Тарпеда» ж не страціла шанцаў заняць месца на п'едэстале, «Смаргонь», на жаль, датэрмінова пацвердзіла свой вылет у першую лігу. Яшчэ адзін разгромны лік зафіксаваны ў матчы брэсцкіх дынамаўцаў з «Віцебскам» — 3:0 перамаглі бела-блакітныя, а «Віцебск» па-ранейшаму застаецца побач з зонай вылету. Яшчэ адзін прэтэндэнт на білет у першую лігу, мікашэвіцкі «Граніт», унічыю згуляў у гасцях у гродзенскага «Нёмана» — 0:0. Учора ўвечары адбыўся матч паміж барысаўскім БАТЭ і «Нафтанам». У выніку выйгрышу барысаўскі клуб датэрмінова становіцца чэмпіёнам — чацвёрты раз запар.

Становішча камандаў: БАТЭ — 50 ачкоў, «Дынама» (Мн) — 40, «Днепр» — 36, «Тарпеда» — 35, «Шахцёр» — 35, «Нафтан» — 32, «Дынама» (Бр) — 31, МТЗ-РІПА — 28, «Нёман» — 28, «Гомель» — 28, «Віцебск» — 25, «Мінск» — 24, «Граніт» — 22, «Смаргонь» — 10.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Абзац

◢ **У нядзелю ў Полацку ў выніку ДТЗ загінула дзіця. 35-гадовы мясцовы жыхар, кіруючы аўтамабілем «Мерседэс», наехаў на 10-гадовую дзяўчынку, якая нечакана выбегла на дарогу. Ад атрыманых траўмаў пяцікласніца памерла на месцы.**

◢ Буйную партыю мёду затрымалі беларускія памежнікі. У зоне адказнасці Брэсцкай памежнай групы быў выяўлены УАЗ без нумароў. У машыне знаходзілася 36 20-літровых вёдзер з мёдам. А непадалёк быў знойдзены джып «Гранд-Чэрокі», куды было загружана 25 вёдзер мёду і 37 рулонаў тканіны. Усяго канфіскавана 1200 л мёду. Зламыснікі нелегальна пераправілі яго з Украіны ў Беларусь.

◢ **Гібеллю жыхара Брэста скончылася рыбалка трох сяброў у Івацэвіцкім раёне. Яны рыбачылі на возеры каля вёскі Бабровічы, кожны знаходзіўся ў сваёй надзіманай лодцы. Па нявыяўленай пакуль прычыне дзве лодкі перакуліліся, і людзі апынуліся ў вадзе. Трэці рыбак схапіў аднаго за каўнер і трымаў яго да прыбыцця дапамогі. Ён пазваніў свайму сыну, які і паведаміў аб здарэнні выратавальнікам. На месца прыбыла няштатная вадалазна-выратавальная група МНС з Целяханаў і работнікі паляўнічай гаспадаркі са сваёй маторнай лодкай. Пацярпелага, якога трымаў таварыш, дасталі з вады і даставілі ў бальніцу. Цела трэцяга рыбака выявіць пакуль не ўдалося.**

◢ Грамадзянін Украіны спрабаваў зрабіць падкоп пад беларуска-польскай мяжой. Ён быў затрыманы без дакументаў. Парушальнікам аказаўся грамадзянін Украіны без пэўнага месца жыхарства. Ён расказаў памежнікам, што такім чынам спрабаваў наведаць радню, што жыве ва Украіне. Раней гэтага грамадзяніна неаднаразова затрымлівалі пры спробе перасячы мяжу. Памежнікі паведамілі, што парушальнікам, хутчэй за ўсё, зоймуцца псіхіятры, таму што яго паводзіны выклікаюць сумненні ў псіхічным здароўі.

Поўны абзац

◢ **Члены экіпажа авіялайнера, што належыць кампаніі Air India, учынілі бойку непасрэдна падчас выканання міжнароднага рэйсу. Спачатку яны пачалі сварыцца з-за абвінавачванняў у дамаганні бортправадніцы, а потым сварка перарасла ў бойку, што працягвалася ў салоне, перад вачыма ашаломленых пасажыраў. Сцюардэсе і пілоту, якія атрымалі гематомы, давялося аказваць медыцынскую дапамогу. Падчас здарэння лайнер са 106 пасажырамі і сямю членамі экіпажа на борце выконваў рэйс з Індыі ў ААЭ. Індыйская паліцыя пачала расследаванне інцыдэнту. Скаргу на паводзіны пілотаў падала сцюардэса, а тыя, у сваю чаргу, паскардзіліся на яе. Кампанія праводзіць уласнае расследаванне НЗ, а ўсіх асобаў, хто ў ім задзейнічаны, адхіліла ад палётаў.**

◢ У Чарнігаве на чыгуначным вакзале ў мужчынскім туалеце не змог дастаць руку з унітаза 47-гадовы жыхар абласнога цэнтра. Паведамленне пра гэта паступіла позна ўвечары ва Упраўленне МНС. Ужо праз 8 хвілін прыбыла дзяжурная змена аварыйна-выратавальнай часці. Як высветлілася, мужчына выпусціў з рук 200 грыўняў, грошы трапілі ва ўнітаз. Чалавек залез па локаць у адтуліну, каб дастаць купюру, аднак выцягнуць руку ён ужо не змог. Правядзенне выратавальных работ ускладняла малая прастора ў кабінцы санвузла, а таксама тое, што чыгунны ўнітаз быў забетанаваны і абкладзены кафляй. Выратавальнікам давялося выдзеўбці ўнітаз, адрэзаць частку зліўной трубы і з дапамогай гідраўлічных нажніцаў і бензарэза зняць гэты сантэхнічны выраб з рукі чалавека, не закранаўшы яе. Уся выратавальная аперацыя заняла 3 гадзіны, пацярпеламу не прычынілі ніводнай драпіны. Лёс купюры не ўдакладняецца.

ПАСТАНОВА
ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аб парадку дня трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе**:

Зацвердзіць парадак дня трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання (дадаецца).

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
У. АНДРЭЙЧАНКА

2 кастрычніка 2009 г., г. Мінск.
№ 177-П4/III

Парадак дня трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання

1. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб супрацоўніцтве ў стварэнні дзяржаўных інфармацыйных сістэм пашпартна-візавых дакументаў новага пакалення і далейшым іх развіцці і выкарыстанні ў дзяржавах — удзельніцах СНД».

2. Аб праекце Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2009 г. № 9 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 сакавіка 2002 г. № 7».

3. Аб праекце Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 жніўня 2009 г. № 10 «Аб стварэнні дадатковых умоў для інвестыцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

4. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пагаднення аб заахвочванні і ўзаемнай абароне інвестыцый у дзяржавах — членах Еўразійскай эканамічнай супольнасці».

5. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пратакола аб унясенні змянення ў Пагадненне аб асновах гарманізацыі тэхнічных рэгламентаў дзяржаў — членаў Еўразійскай эканамічнай супольнасці ад 24 сакавіка 2005 года».

6. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па асобных пытаннях банкаўскай дзейнасці».

7. Аб праекце Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2009 г. № 8 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 сакавіка 1998 г. № 3».

8. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях адукацыі».

9. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях выкарыстання атамнай энергіі».

10. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб асновах транспартнай дзейнасці».

11. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб статусе вайскоўцаў».

12. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Камітэце дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь і яго тэрытарыяльных органах».

13. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Сербія аб часовым працаўладкаванні грамадзян Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Сербія і грамадзян Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь».

14. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь».

15. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб гандлі».

16. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Консульскай канвенцыі паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай».

17. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Рамачнага пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Камісіяй Еўрапейскіх супольнасцяў».

18. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе».

19. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю».

20. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дэкларавання фізічнымі асобамі даходаў, маёмасці і крыніц грашовых сродкаў».

21. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі пагадненняў да Артыкулаў пагаднення Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця».

22. Аб праекце Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

23. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у законы Рэспублікі Беларусь «Аб ветэранах» і «Аб статусе Герояў Савецкага Саюза, Герояў Сацыялістычнай Працы, поўных кавалераў ордэнаў Славы, Працоўнай Славы».

24. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі».

25. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб парадку і ўмовах накіравання грамадзян у лячэбна-працоўныя прафілакторыі і ўмовах знаходжання ў іх».

26. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзейнасці органаў пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь».

27. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі».

28. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спынення дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання».

29. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь».

30. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ветэрынарнай дзейнасці».

31. Кадравыя пытанні.

Заўвага. У адпаведнасці з часткай другой артыкула 103 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адно пасяджэнне ў месяц рэзервуецца для пытанняў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і адказаў членаў Урада Рэспублікі Беларусь.

Дадатак
да Пастановы Палаты прадстаўнікоў
Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
02.10.2009 № 177-П4/III

ПРА ПАЛІТЫКУ СА СМАКАМ

Праца — першая страва, хатні ачаг — другая?

Дэпутат Марыя БІРУКОВА ўпэўнена: калі працуеш з поўнай аддачай — сям'я нечага недаатрымоўвае..

Сёння наша парламенцкая кухня прапануе вам найсмачнейшыя клёцкі, прыпраўленыя смятанай і шчырай гутаркай. А расказвае Марыя Міхайлаўна гэтак алейна, са смакам, — слова гонару, слінка цячэ ад аднаго толькі аповеду! Самі словы «масліца», «клёцкі», «падсольваць», «цыбулінка» — хочацца смакаваць і смакаваць... Аднак давядзецца памучыцца — страва гатуецца дастаткова доўга. Ну, не ўсё адразу — многіх прыемных рэчаў у жыцці даводзіцца нецярпліва чакаць, як дня нараджэння ў дзяцінстве.

Дык вось, абіраем бульбу, дзяром на дробнай тарцы. Наша гаспадыня, дарэчы, карыстаецца для гэтага камбайнам. «Муж на 8 Сакавіка падарыў, — кажа. — Там розныя насадкі, ёсць спецыяльная і для бульбы, надзіраць вельмі зручна».

З мужам яны паспелі ўжо справіць жамчужнае вяселле, іх сям'і больш за 30 гадоў. Дачку выхавалі. Пытаюся, як атрымліваецца быць майстрыхай на ўсе рукі — і гаспадыняй, і жонкай, і маці, і палітыкам.

— Быць выдатным кіраўніком, — кажа былы намеснік губернатара Гродзеншчыны, — і выдатнай гаспадыняй — гэта вельмі і вельмі цяжка. Сям'я не атрымлівае ўсяго таго, што яна павінна атрымліваць. Гэта трэба прызнаць. І думаю, кожная жанчына, якая займае пасаду, гэта прызнае. Бо калі з поўнай аддачай ставіцца да справы, па сабе ведаю, столькі сфер — як гэта ўсё паспець зрабіць... Надзейная сям'я павінна быць, якая цябе зразумее, дапаможа і возьме кавалачак сваёй работы на сябе — без гэтага ніяк.

Аднак сённяшнім амбіцыйным дзяўчатам Марыя Бірукова раіць не бярэцца:

— Тут агульнага рэцэпту няма. Калі сапраўды любімая справа, цяжка ад яе адмовіцца... Але ж цяпер час іншы, сёння моладзь можа спакойна і няньку наняць, і хатнюю работніцу — калі зарабляе дастаткова... Раней, па-першае, было цяжка знайсці тую няньку, а па-другое, гэта негатыўна ўспрымалася навакольнымі — казалі, от ужо белыя ручкі...

Рукі — люстэрка душы?

Кідаю позірк на рукі суразмоўніцы, — яна так спрытна адціскае бульбу праз марлю, складзеную ў два слаі. Такія ўпэўненыя, адпрацаваныя, ладныя ў яе рухі. Яна ўмее і любіць гатаваць, каб парадаваць блізкіх. Аднак апошнім часам робіць гэта нячаста: сям'я засталася ў Гродне, а яна жыве ў службовай кватэры ў Мінску. Затое як возьмецца, дык ужо пачастунку хапае ўсім з лішкам.

— Не будзеш жа гатаваць па дзве клёцачкі, — слушна заўважае Марыя Міхайлаўна. — Хочацца, каб ужо ўся сям'я наелася. Гэта ж так смачна! (Ахвотна верым! — **Аўт.**).

І да працы ў яе такі ж грунтоўны падыход. Як намеснік старшыні пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Марыя Бірукова адказная за падрыхтоўку законапраекта. Гэта ратыфікацыя Пагаднення аб супрацоўніцтве ў стварэнні дзяржаўных інфармацыйных сістэм пашпартна-візавых дакументаў новага пакалення, падпісанага дзевяццю краінамі— удзельніцамі Садружнасці. Свае намаганні ў стварэнні адзінага банка звестак аб грамадзянах гатовыя аб'яднаць Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Малдова, Расія, Таджыкістан, Узбекістан і Украіна. Марыя Міхайлаўна знаёміла калег са «сваім» законапраектам у Авальнай зале ўжо на першым пасяджэнні восеньскай сесіі. Дэпутаты ратыфікавалі пагадненне.

Што ўяўляюць сабой пашпарты новага пакалення? Гэта дакументы, якія засведчваюць асобу грамадзяніна за межамі краіны і ўтрымліваюць яго біяметрычныя звесткі (што характарызуюць пэўныя фізіялагічныя асаблівасці чалавека і на аснове якіх можна ідэнтыфікаваць яго асобу).

— Мне падаецца, што гэта тая прававая база, якая забяспечыць супрацоўніцтва і гарманізацыю ўсіх працэсаў краін СНД у стварэнні інфармацыйных сістэм пашпартоў новага пакалення, — кажа Марыя Міхайлаўна. — Злачынны свет, на жаль, не слабее. Увядзенне пашпартоў з біяметрычнымі звесткамі — гэта абарона краіны, яе грамадзян. Будзе выкарыстоўвацца самая сучасная апаратура, пры дапамозе якой ідэнтыфікуюцца дакументы, выяўляецца падробка пашпартоў. Гэта ўскладніць доступ злачынцам у нашу краіну ці ад нас у іншую дзяржаву.

Якія канкрэтна ідэнтыфікатары трапяць у беларускія пашпарты, сказаць пакуль цяжка. Некаторыя заходнія краіны выкарыстоўваюць адбіткі пальцаў, іншыя — выяву радужнай абалонкі вока... У нас схіляюцца да таго, каб ідэнтыфікаваць усё ж па адбітках пальцаў. Рукі — люстэрка душы?..

— У нас пакуль размова ідзе пра тое, каб у пашпарце былі лічбавы фотаздымак, электронны подпіс і адбіткі пальцаў, — кажа Марыя Бірукова. — Дактыласкапічная рэгістрацыя асобных катэгорый грамадзян, якія падлягаюць воінскаму ўліку (мужчыны ва ўзросце ад 18 да 55 гадоў) прынесла вялікі плён. З 960 тыс. асобаў, якія былі добраахвотна дактыласкапіяваныя ваеннымі камісарыятамі Міністэрства абароны сумесна з органамі ўнутраных спраў, у амаль 1,5 тысячы выяўлена супадзенне адбіткаў пальцаў з тымі, што былі пакінутыя на месцах раней учыненых злачынстваў — забойстваў, згвалтаванняў, нанясення цяжкіх цялесных пашкоджанняў, крадзяжоў і іншых. Таму ў закон аб дактыласкапічнай рэгістрацыі будуць уносіцца папраўкі — яна стане абавязковай для кожнага, хто прызываецца ў войска.

Наша суразмоўніца не думае, што гэта стане карт-бланшам для праваахоўнікаў у фальсіфікацыі матэрыялаў справы, яна лічыць, што «прышыць» злачынства ні ў чым не вінаватаму чалавеку нельга будзе...

Пакуль мы гутарым, адціснуты бульбяны сок адстойваецца. Пачынаем рыхтаваць цеста для нашых цуда-клёцак:

— Так, хвілін 15 адстаялася, дадаём крухмал у наша цеста бульбяное, — расказвае гаспадыня, чаруючы над будучымі клёцкамі. — Крышку падсольваем, добра размешваем, каб крухмал з цестам сталі аднароднай масай.

Клёцкі — страва досыць папулярная не толькі ў беларусаў: чэхі з задавальненнем ласуюцца кнэдлікамі, літоўцы — цэпелінамі...

А як у нашай краіне з'явіцца біяметрычныя пашпарты і пачне дзейнічаць пагадненне ў межах СНД, то, каб пакаштаваць замежных клёцак, давядзецца здаць «пальчыкі» ...

— Біяметрычны пашпарт будзе афармляцца на добраахвотнай аснове, паводле заявы. У такіх грамадзян будзе два пашпарты, — тлумачыць Марыя Бірукова, — звычны ўжо — для ўнутраных патрэбаў, а біяметрычны — для выезду ў краіны СНД. Новыя пашпарты пачалі ўжо выкарыстоўваць у Расіі, Казахстане і Малдове. Пагадненнем прадугледжаныя сумесныя навучальныя семінары і мерапрыемствы па ўзаемным тэсціраванні гэтых дакументаў, распрацоўцы прапаноў па арганізацыі трансмежнага інфармацыйнага ўзаемадзеяння, выкарыстанні тэхналогій вырабу і паліграфічнай абароны біяметрычных і іншых інфармацыйных тэхналогій.

Дарэчы, абароне інфармацыі надаецца вялікая ўвага ў пагадненні — мяркуецца сумесна паклапаціцца пра тое, каб абароненым быў абмен інфармацыяй, каб выключыць магчымасці несанкцыянаванага яе счытвання з пашпарту, каб забяспечыць канфідэнцыйнасць звестак, якія ўтрымліваюцца ў дзяржаўнай сістэме. Пры гэтым самі грамадзяне будуць мець доступ да інфармацыі пра іх, якая знаходзіцца ў банку звестак. Калі нехта звернецца, яму будуць абавязаныя даць гэту інфармацыю.

Начынка для задэкараванага

Пагадненне ўвойдзе ў сілу праз 30 дзён пасля ратыфікацыі. А вось рэальнае напаўненне задэкараванага — з'яўленне саміх пашпартоў у нашай краіне — перспектыва куды больш аддаленая...

— Гэта залежыць ад таго, як справяцца кампетэнтныя органы, — кажа Марыя Міхайлаўна. — Сярод такіх мы вызначылі найперш Міністэрства ўнутраных спраў. Мерапрыемствамі, распрацаванымі МУС на аснове наяўнай канцэпцыі, адводзіцца 2—2,5 года. Год ужо прайшоў, падрыхтаваны доследны ўзор пашпарта, аднак ці зацвердзяць яго пакуль невядома...

На чарзе ў нас фарш, якім будзем начыняць цеста для нашых клёцак:

— Вядома ж, смачней калі гэта свежае мяса — свініна, ялавічына, — кажа Марыя Міхайлаўна, — пракруцім, робім фарш, падсольваем, прыперчым. Цыбулю ледзь-ледзь пасіруем — не да залацістасці. Фарш у клёцках любіць цыбулю, — дзеліцца кулінарнымі сакрэтамі гаспадыня. — На паўкіло фаршу цыбуліны дзве немалыя такія спатрэбяцца. Цяпер фаршам начыняем цеста. Надаём форму — каму як больш падабаецца — прадаўгаватую ці круглую. І кідаем у падсоленую ваду, якая кіпіць.

Закіпаюць часам і эмоцыі... Ёсць у краіне асобная катэгорыя вернікаў, якія адмаўляюцца атрымліваць нават наяўныя пашпарты — з-за таго, што там ім прысвойваецца нумар. Што ўжо казаць пра біяметрычныя звесткі, тут можа знайсціся куды больш нязгодных...

— Мы абмяркоўвалі — а што калі саступіць? Здаецца, гэтых людзей не так і шмат, — разважае Марыя Бірукова. — Аднак разважылі, што сёння мы зробім адно выключэнне, заўтра — другое, а ў выніку і не застанецца нічога агульнага — для каго мы тады наогул рашэнні прымаем? Нумар не дадасць духоўнасці, калі не няма, а калі ёсць — не забярэ. Людзі, якія адмаўляюцца атрымліваць пашпарт — самі выключаюць сябе з жыцця. У перспектыве біяметрычны пашпарт можа стаць абавязковым...

Сама наша суразмоўніца не супраць афарміць такі дакумент: «Чаму не? І быць спакойнай, што выехаць я ці ўвезці з сабой у пашпарце нейкую забароненую літаратуру, наркотыкі ці зброю не атрымаецца, — гэта толькі плюс. Ды і ў змаганні з тэрарызмам, з міжнароднай злачыннасцю, з незаконным абаротам наркотыкаў гэта будзе вельмі важны крок. Ды і ў барацьбе з нелегальнай міграцыяй таксама. Ведаю, што ў Еўропе ёсць краіны, якія ўжо ўвялі ў пашпарты біяметрычныя звесткі, і ніякіх праблем з гэтым не ўзнікае. Ды і ў нас, калі ўзгадаць, ніхто не пратэставаў, калі ўводзіліся новыя пашпарты з фотаздымкам, з'явіліся ўкладышы, а потым і ўсе пашпарты сталі ламінаваныя. Ніхто не пратэставаў, калі ўводзіліся пашпарты з электронным подпісам. Ніхто не пратэставаў, калі ўводзіліся пашпарты з электронным носьбіт

У РАСКЛАДЗЕ — НОВЫЯ ЗМЯНЕННІ

12 кастрычніка электрацягнік Мінск-Пасажырскі — Асіповічы адпраўленнем у 14.03 прызначаецца ў рух па маршруце Мінск-Пасажырскі — Рудзенск, а электрычка Асіповічы — Мінск, Інстытут культуры адпраўленнем у 14.53 — па маршруце Рудзенск — Мінск, Інстытут культуры.

13 кастрычніка электрацягнік Мінск, Інстытут культуры — Баранавічы адпраўленнем у 11.54 пойдзе па маршруце Мінск, Інстытут культуры — Койданава. У гэты ж дзень здымаецца электрычка Стоўбцы — Мінск адпраўленнем у 11.46. 13 кастрычніка прызначаюцца электрацягнікі: Койданава — Мінск, Інстытут культуры адпраўленнем са станцыі Койданава ў 13.05, прыбыццём у Мінск на станцыю Інстытут культуры ў 13.55; Стоўбцы — Баранавічы — Брэст адпраўленнем са станцыі Стоўбцы ў 13.41, адпраўленнем са станцыі Баранавічы ў 14.55, прыбыццём на станцыю Брэст у 18.45.

14 кастрычніка ў раскладзе руху будуць наступныя змяненні: электрычка Мінск, Інстытут культуры — Асіповічы адпраўленнем у 11.50 пойдзе па маршруце Мінск — Пухавічы; Асіповічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем у 12.57 — па маршруце Пухавічы — Мінск-Пасажырскі; Мінск-Пасажырскі — Асіповічы адпраўленнем у 13.17 — па маршруце Мінск-Пасажырскі — Пухавічы; Асіповічы — Мінск, Інстытут культуры адпраўленнем у 14.53 — па маршруце Пухавічы — Мінск, Інстытут культуры. У гэты ж дзень здымаюцца электрацягнікі: Мінск, Інстытут культуры — Барысаў адпраўленнем у 12.09 і Барысаў — Мінск-Усходні адпраўленнем у 10.17. 14 кастрычніка электрычка Мінск-Усходні — Орша адпраўленнем у 13.13 пойдзе згодна са зменены раскладам і прыбудзе ў Оршу ў 17.02.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЕЛАРУСЫ НЕ СОЧАЦЬ ЗА СВАІМ ЗДАРОЎЕМ

На першым пасяджэнні трэцяй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання, перад парламентарыямі выступіў міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО.

Ён агучыў актуальныя праблемы развіцця медыцынскай галіны. Па словах Васіля Жарко, зніжэнне смяротнасці сярод насельніцтва працаздольнага ўзросту ад знешніх прычын (32 працэнты па звестках за мінулы год) і хваробаў сістэм кровазвароту (31 працэнт) з'яўляецца найбуйнейшай сацыяльнай і медыцынскай праблемай і патрабуе кансалідацыі ўсіх дзяржаўных і грамадскіх структур для яе вырашэння. Так, толькі ў выніку выпадковага атручвання алкаголем летась наша краіна страціла 2594 чалавекі. Найбольш высокая смяротнасць — сярод прадстаўнікоў дужай паловы. Як заўважыў міністр, сярэдняя працягласць жыцця мужчын Беларусі на 12 гадоў меншая, чым у жанчын (для параўнання — гэта розніца ў свеце складае каля 5 гадоў). Як адзначае Сусветная арганізацыя аховы здароўя, на фізічны стан чалавека найперш уплываюць сацыяльна-эканамічныя ўмовы (на 50 працэнтаў) і толькі 15—20 працэнтаў прыпадае на навакольнае асяроддзе, спадчыннасць і дзейнасць сістэмы аховы здароўя. Звесткі сацыялагічных даследаванняў паказваюць, што толькі 10—15 працэнтаў насельніцтва на практыцы выкарыстоўваюць рэкамендацыі спецыялістаў па захаванні і ўмацаванні свайго здароўя.

Нягледзячы на прынятыя летась падчас правядзення Года здароўя акцыі і мерапрыемствы па барацьбе з курэннем, сярод якіх забарона паліць ва ўстановах і арганізацыях адукацыі, здароўя, культуры, стварэнне абмежаваных зон для курэння ў месцах масавага знаходжання людзей, парках, скверах, зонах адпачынку і грамадскага харчавання, гасцініцах і іншых грамадскіх месцах, Беларусь належыць да ліку краін з найбольш шырокай распаўсюджанасцю прыхільнасці да цыгарэт. Курцамі ў нас з'яўляецца палова мужчын і адна шостая частка жанчын. Узнятая міністрам праблема, якая заключаецца ў тым, што добрая доля насельніцтва не сочыць за сваім здароўем, падштурхнула аднаго з парламентарыяў Аляксандра Зянькова, загадчыка аддзялення сардэчна-сасудзістай хірургіі Віцебскай абласной клінічнай бальніцы, задаць міністру пытанне пра неабходнасць увядзення страхавой медыцыны: «Летам я пабываў у вядучых кардыялагічных цэнтрах у Бельгіі, Бруселі, Германіі і пабачыў, як зладжана працуе страхавая медыцына, якая падштурхоўвае пацыента да таго, каб ён сам сачыў за сваім здароўем. Калі чалавек курыць і выпівае, яму трэба больш грошай укладаць у сваё лячэнне. Можа, трэба развіваць штосьці падобнае і ў нашай краіне?»

— Безумоўна, у гэтым ёсць сэнс, — заўважыў міністр. — Але пакуль мы не можам ukараніць такую сістэму, прычына ва ўзроўні даходаў нашага насельніцтва. Для прыкладу: Расія ўжо пайшла на такі крок, на 50 працэнтаў іх медыцына — страхавая, але людзі там не сталі больш здаровымі.

Яшчэ адна з праблем, якія ў сваім выступленні агучыў Васіль Жарко, датычыцца медыцынскіх кадраў: у 2009 годзе ў краіне не хапала больш за чатыры тысячы ўрачоў і правізараў, а сярэдняга медыцынскага персаналу — каля пяці тысяч. Штогод медыцынская галіна губляе толькі па натуральных прычынах (выхад на пенсію, інваліднасць, смерць) каля 900 чалавек. Міністэрства аховы здароўя прымае адпаведныя захады, каб палепшыць сітуацыю, за апошнія тры гады прыём у медыцынскія ўстановы павялічыўся на 26 працэнтаў, альбо на тысячу чалавек. Так, у 2009 годзе ў вышэйшыя медыцынскія ўстановы адукацыі было прынята 3709 чалавек, з іх 2730 — за кошт рэспубліканскага бюджэту. Каб замацаваць медыкаў за вёскамі, малымі і сярэднімі гарадамі, тэрыторыямі, забруджанымі ў выніку аварыі на ЧАЭС, да 500 чалавек у год павялічана колькасць навучэнцаў, якія будуць атрымліваць адукацыю на кантрактнай аснове за кошт дзяржзаказу.

Зразумела, вырашэнню кадравага пытання магло б спрыяць і павелічэнне заробкаў медыцынскіх работнікаў, ці чакаецца яно, цікавіліся члены Савета Рэспублікі. Па словах міністра, ужо больш чым дзве з паловай тысячы медыкаў атрымліваюць павялічаныя заробкі, і гэта лічба будзе расці. «Мы асобным спецыялістам пачынаем павялічваць заробкі. Зараз мы працуем над тым, каб больш высокія зарплаты сталі ў лабарантаў, тых, хто працуе ў анкадыспансэрах і рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтрах. Бо заробкі ў іх нізкія, а ім даводзіцца выконваць тэхналагічна складаную працу. Міністэрства працы і Мінфін ідуць нам насустрач», — паведаміў Васіль Жарко.

Не пакінулі парламентарыі без увагі і платную медыцыну. «Мы разумеем, што трэба цяпер развіваць платныя паслугі, і гэта правільна, але існуюць пэўныя перагібы. Напрыклад, сёння цяжарным жанчынам неабходна плаціць за планавае даследаванне. Хіба гэта добра, што мы вымушаем насельніцтва плаціць за планавыя медмерапрыемствы, такія, напрыклад, як ультрагукавое даследаванне сэрца маці, ці арганізма дзіцяці? Абсталяванне, набытае за кошт бюджэту рэспублікі альбо саюзнага бюджэту, прызначанае для таго, каб аказваць сацыяльныя паслугі насельніцтву, а ўжо пасля працаваць на платныя паслугі. Але на практыцы атрымліваецца не зусім так»,— заўважыў Віктар Аверын, дырэктар Рэспубліканскага навукова-даследчага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут радыялогіі». І атрымаў адказ, паводле якога гэта сапраўды перакосы, праблема кіраўніцтва ўстаноў, і з ім трэба разбірацца на месцах.

Міністру давялося даваць парламентарыям адказ на пытанні аб леках. Так, Лілія Мароз агучыла актуальную для пажылых людзей, удзельнікаў вайны і інвалідаў, праблему з ільготным набыццём лекаў. Так, Міністэрства аховы здароўя штогод зацвярджаецца пералік асноўных лекавых сродкаў, якія грамадзяне могуць атрымаць на льготнай аснове, ён складаецца з 440 найменняў (у Расіі ў такі спіс уваходзіць усяго 250 найменняў, ва Украіне —200, па рэкамендацыі сусветнай арганізацыі аховы здароўя гэта павінна быць 400 найменняў). Па словах міністра, гэты пералік складаецца з найбольш значных прэпаратаў, неабходных для аказання медыцынскай дапамогі. Міністр таксама адзначыў, што айчынных лекаў на рынку рэспублікі становіцца больш (штогод засвойваецца выпуск 25—30 новых лекавых сродкаў). І на сёння 22—23 працэнты прэпаратаў, што прадаюцца ў нашай краіне, айчыннай вытворчасці, але калі глядзець на гандаль, каля 50 працэнтаў рэалізаваных аптэкамі ўсіх формаў уласнасці упаковак з лекамі зроблены ў Беларусі.

Дарэчы, нягледзячы на тое, што агульная вага выдаткаў на ахову здароўя па сістэме Міністэрства аховы здароўя да УВП знізілася з 4,22 працэнта ў 2006 годзе да 3,31 працэнта з улікам скарачэнняў у 2009 годзе, у сумарным выглядзе яна павялічылася і склала ў 2009 годзе 5 127 мільярдаў рублёў. Так, мінімальны нарматыў бюджэтнай забяспечанасці выдаткаў на ахову здароўя на аднаго жыхара рэспублікі складае 503 тысячы рублёў.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

І РЫБКУ З'ЕСЦІ, І ПРЫРОДЗЕ НЕ НАШКОДЗІЦЬ

Парламенцкі дзённік

Экалагічны кодэкс можа быць распрацаваны ў Беларусі

Свае ўзаемаадносіны з прыродай чалавек будуе спакон вякоў. І калі раней гэта была пазіцыя гаспадара, то цяпер — разумнага карыстальніка. Экалагічныя праблемы на парадку дня ва ўсім свеце, зусім няпростая сітуацыя і ў нашай краіне. На пераадоленне наступстваў аварыі на ЧАЭС дагэтуль ідзе мноства матэрыяльных і нематэрыяльных рэсурсаў. Тым больш асэнсавана нам трэба падыходзіць да аховы і рацыянальнага выкарыстання прыродных багацця. А саму гэту сістэму варта закласці заканадаўча — як ідэальны злепак таго, што трэба ў рэальнасці. Як гэта зрабіць — абмяркоўвалі парламентарыі падчас семінару на Віцебшчыне. Дзе ж гутарыць пра прыроду як не ў Паазер'і — воднай і лясной скарбніцы Беларусі.

У ніжняй палаце парламента цяпер знаходзіцца праект закона аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе. Пры ўдзеле профільнай камісіі (па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні) распрацоўваюцца законапраекты, што будуць рэгуляваць адносіны ў галіне функцыянавання біясферных рэзерватаў і нацыянальнай экалагічнай сеткі, нармаванні антрапагеннай нагрузкі на прыродныя комплексы, размешчаныя на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях. Работа над гэтымі дакументамі фактычна з'яўляецца генеральнай падрыхтоўкай да распрацоўкі Экалагічнага кодэкса, — падкрэсліў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА (дарэчы, у маршруце дэпутацкай вандроўкі былі і мясціны ў выбарчай акрузе спікера, дзе створана належная інфраструктура для разумнага прыродакарыстання). У гутарцы з журналістамі ён назваў у якасці магчымага тэрмін да 2011 года.

— Экалагічны кодэкс зможа ўрэгуляваць не толькі прыродаахоўныя праблемы, але і дасць магчымасць скарэктаваць усе законы, якія так ці інакш маюць дачыненне да прыродакарыстання. Гэта задача на перспектыву, да якой трэба імкнуцца, — адзначыў палітык.

Ён звярнуў увагу ўдзельнікаў семінару на неабходнасць далейшага развіцця прыродаахоўнага заканадаўства ў адпаведнасці з айчыннымі рэаліямі і міжнароднымі прыярытэтамі. Гэта дазволіць больш эфектыўна выкарыстоўваць унікальныя багацці беларускай прыроды, інтэнсіўна развіваць аграэкатурызм, прапаноўваць больш паслуг — не толькі мясцовым жыхарам, але і замежным гасцям.

Сярод слушных ініцыятыў удзельнікаў семінару старшыня Палаты прадстаўнікоў вылучыў прапанову выключыць з пераліку адміністрацыйных працэдур норму аб аплаце дзяржаўнай пошліны за кожны год дзеяння пасведчання на права паляванне, канфіскоўваць прылады і забароненыя сродкі збору прыпарушэнні правілаў нарыхтоўкі, збору грыбоў і ягад, даць права службовым асобам Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў складаць пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях у такіх выпадках.

Дырэктар дэпартамента па меліярацыі і воднай гаспадарцы Мінсельгасхарча Анатоль Булыня расказаў пра кітайскі досвед рыбаводства. Там яно ўключана ў спіс дзяржаўных прыярытэтаў. І працуюць яны па прынцыпе «ў кожным вадаёме павінна быць рыба». Такая стратэгія прыносіць плён: сёння Кітай лідзіруе ў сусветным экспарце асятровых. У Беларусі ж пакуль развіццё асятровых і ласасёвых відаў трымаецца на прывазным рыбапасадачным матэрыяле. Выдаткі на яго набыццё нярэдка даходзяць да паловы кошту вырашчанай рыбы, зразумела, гэта стрымлівае развіццё галіны. Аднак пасля 2011 года рыбгасы пачнуць самі забяспечваць свае патрэбы ў рыбапасадачным матэрыяле асятровых, — запэўніў А. Булыня.

Закранулі падчас дыскусіі і магчымасці фермерскага рыбаводства. Прыватнікі арандуюць не больш за 390 натуральных вадаёмаў Беларусі — адсоткаў 60 ад агульнай колькасці прыдатных для вядзення гаспадаркі. Чаму ж не знойдуць гаспадароў астатнія 40 адсоткаў? Старшыня Палаты прадстаўнікоў выказаў здагадку, што прычына і ў заканадаўчым забеспячэнні. Маўляў, трэба заахвочваць людзей да фермерскага рыбаводства.

Анатоль Булыня ў сваю чаргу прапанаваў, якім чынам гэта можна рабіць: «у людзей не хапае сродкаў на арэнду, таму сістэму крэдытавання трэба зрабіць больш даступнай». Гэтую ідэю трэба закласці ў будучы закон аб рыбагаспадарчай дзейнасці, які ў цэлым павінен быць скіраваны на тое, каб максімальна задзейнічаць патэнцыял вадаёмаў, прыцягнуць інвестыцыі ў гэту галіну. Так атрымаецца злавіць адразу дзвюх рыбаў: і харчовую бяспеку краіны падтрымаць, і занятасць забяспечыць. І ў нас з вамі ёсць надзея, што мы зможам у хуткім часе ласавацца айчыннай фарэллю ў большых колькасцях і па ніжэйшых коштах.

Магчымыя змяненні не толькі ў рыбаводстве, але і ў рыбалоўстве. Як заўважыў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Уладзімір Цалка, у многіх заходніх краінах аматарская лоўля рыбы вядзецца платна — там нароўні з пасведчаннем на права паляванне ёсць спецыяльны дакумент і для рыбакоў, накшталт карты рыбалова. На думку міністра, патрабуе разгляду пытанне аб платным аматарскім рыбалоўстве і ў нашай краіне.

Свае нюансы і ў паляўнічых. У іх «паслугах» прырода мае патрэбу, калі істотна павышаецца аптымальная колькасць дзікіх жывёл. Цяпер, напрыклад, «засілле» дзікоў — іх колькасць у паўтара раза большая за аптымальную.

— Толькі ў 2008 годзе дзікі нанеслі ўрон сельскагаспадарчым культурам на суму каля трох млрд рублёў, — паведаміў міністр.

Шкоднічаюць і бабры. Пры колькасці каля 60 тыс. без шкоды для папуляцыі можна здабываць 8,8 тыс. баброў на год. На думку міністра, аптымальная колькасць паляўнічых жывёл павялічана з-за невыканання карыстальнікамі паляўнічых угоддзяў сваіх абавязкаў па яе падтрыманні. Прапануецца ўвесці матэрыяльную адказнасць за гэта. Прапануецца таксама заканадаўча замацаваць заахвочванне паляўнічых да здабычы непажаданых відаў жывёл (у тым ліку пашкоджаных шаленствам). Ёсць задумы развіваць таксама і вальернае паляванне. Як паказвае замежная практыка, фермы дзікіх жывёл прыносяць значны прыбытак: вальернае паляванне складае сур'ёзную канкурэнцыю трафейнаму паляванню ў натуральных паляўнічых угоддзях. Паводле меркавання міністра, гэта трэба ўлічваць і ўносіць адпаведныя змяненні ў Правілы вядзення паляўнічай гаспадаркі і паляванне.

Парламентарыі наведалі музей прыроды Бярэзінскага біясфернага запаведніка, Бягомльскую міжнародную інспекцыю аховы жывёльнага і раслінага свету, паляўніча-рыбалоўную базу «Камайск» і многія іншыя аб'екты. Яны адведалі найсвяжэйшай юшкі і нават сталі сведкамі паказальнага паляўнічага.

Ала МАЧАЛАВА.

Фота БЕЛТА.

5 кастрычніка ў Гродне адбылося адкрыццё сучаснага дзіцячага садка на 190 месцаў у мікрараёне Вішнявец-4. Яслі-садок «Васілёк» — соты дзіцячы садок у Гродне.

Ацяпленне ў дамах Мінска могуць уключыць 8 кастрычніка

Ацяпленне ў жылых дамах Мінска, магчыма, падключаць 8 кастрычніка, паведаміў журналістам **начальнік аддзела энергетыкі Мінгарвыканкама Анатоль ЛАЎНІЧУК**.

«Спажыўцам 2-й катэгорыі (жылфонд, інтэрнаты, гасцініцы) цяпло падаецца, калі сярэдняя тэмпература паветра звонку на працягу пяці дзён не перавышае 8 градусаў. У папярэднія дні сярэднясутачная тэмпература была ў межах 9—9,5 градуса. Таму ёсць верагоднасць, што ацяпленне ў дамах сталіцы будзе ўключана ў чацвер», — сказаў Анатоль Лаўнічук.

Паводле яго слоў, жыллёвыя службы горада гатовы да працэсу падачы цяпла. Пашпарты гатоўнасці атрымалі ўсе дамы, за выключэннем дамоў пяці таварыстваў уласнікаў. «Цеплакрыніцы гатовы, сеткі гатовы. Адзіная задача для камунальных службаў — запоўніць сістэмы ацяплення», — адзначыў прадстаўнік Мінгарвыканкама, патлумачыўшы, што ў перыяд запуску ацяплення ў сетку трэба ўкінуць вялікі аб'ём вады. «Гэту работу мы праводзілі на працягу тыдня дзеля таго, каб усе сістэмы ацяплення былі запоўнены цепланосьбітам», — дадаў ён.

Спецыяліст патлумачыў, што цяпло падаецца ў дамы паэтапна. Працэс расцягваецца на тыдзень, таму што пастаўшчыкі цяпла («Мінсккамунцепласетка» і «Мінскія цеплавыя сеткі») не ў стане адначасова ўкінуць у сетку вялікі аб'ём вады. Пасля ўключэння цяпла сістэмы ацяплення адрэгулююць. На гэта пойдзе яшчэ прыкладна два тыдні.

Як паведамлялася, з сённяшняга дня да цяпла пачнуць падключаць спажыўцоў 1-й катэгорыі — школы, дзіцячыя садкі, бальніцы, паліклінікі і іншыя сацыяльныя ўстановы.

Аксана ШЫКУЦЬ, БЕЛТА.

«Бяспраўнаму» не месца за рулём

За выхадныя на дарогах рэспублікі загінулі два кіроўцы, якія селі за руль аўтамабіляў без пасведчання, і два іх пасажыры.

У нядзелю вечарам 31-гадовы жыхар Іванава на мікрааўтобусе «Фальксваген» выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з аўтамабілем «Сканія». «Бяспраўны» кіроўца мікрааўтобуса і яго 25-гадовая пасажырка загінулі на месцы здарэння, якое адбылося ў Іванаўскім раёне. 31-гадовы кіроўца «Сканіі» з Гродна змешчаны ў бальніцу.

Яшчэ два няшчасныя здарэнні адбыліся на тэрыторыі Рэчыцкага і Дзяржынскага раёнаў. 25-гадовы кіроўца «Мерседэса» і 47-гадовы кіроўца «Лексуса» выехалі за межы праезнай часткі і перакуліліся. У выніку 21-гадовы пасажыр, які ехаў разам з кіроўцам «Мерседэса», загінуў. Загінуў таксама і кіроўца «Лексуса», а яго 25-гадовы пасажыр з траўмамі змешчаны ў бальніцу.

— За 8 месяцаў гэтага года па віне кіроўцаў, якія не маюць права кіравання транспартнымі сродкамі, здзейснена 404 ДТЗ, — паведаміў **начальнік службы прафілактыкі і прапаганды бяспекі дарожнага руху спецыяльнага падраздзялення ДПС «Страла» Яўген ЛАПЕЦ**. — Прычым 172 з іх — у стане алкагольнага ап'янення. У выніку гэтых здарэнняў 72 чалавекі загінулі і 495 атрымалі раненні. Нагадаю, што за кіраванне без пасведчання, а таксама за перадачу кіравання асобе, якая не мае правоў, прадугледжаны штраф у памеры ад 175 да 700 тысяч рублёў.

Надзея ДРЫЛА.

АДЗІН ДОБРА, А ДВА — ЛЕПШ

Пад такой назвай да канца года ЗАТ «Атлант» будзе праводзіць сваю рэкламную гульню для фізічных асобаў, што пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Яе ўмовы вельмі простыя: купі пральную машыну гэтага завода — і выйграй халадзільнік, купі халадзільнік — і выйграй пральную машыну. Прызавы фонд складаюць па 150 пральных машын і халадзільнікаў ад «Атланта», а таксама 10 суперпрызоў па 5 мільёнаў рублёў кожны. Розыгрыш будзе праводзіцца штомесяц. Пасля набыцця бытавой тэхнікі ў любой краме на тэрыторыі нашай краіны трэба будзе запоўніць анкету ўдзельніка акцыі на сайце прадпрыемства або, атрымаўшы купон зваротнай сувязі ў краме, запоўніць яго і дасласць поштай на адрас завода.

Сяргей РАСОЛЬКА.

МАЛЫ БІЗНЭС ПАВЯЛІЧЫЎ ДОЛЮ Ў РЭАЛІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ПРАДУКЦЫІ З 3 % ДА 7 %

Пра функцыянаванне створаных пляцовак аптовага і дробнаптовага гандлю таварамі беларускіх вытворцаў расказалі журналістам на прэс-канферэнцыі ў Міністэрстве эканомікі.

Перш за ўсё гаворка ішла пра прадстаўніцтвы прадпрыемстваў Беллегпрама на Мінскім аптовым рынку, рэпартаж з якога мы друкавалі. Аляксандр Ліхачэўскі, дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтве Мінэканомікі, расказаў, што на выдзеленых Мінскім аптовым рынкам 850 кв. метрах зараз размешчана 12 прадпрыемстваў канцэрна Беллегпрам, якія плоцяць за арэнду 1 кв. метра 1 еўра. Зараз на рынку ёсць аддзяленне Беларусбанка, ёсць прадстаўнік Беларускай гандлёва-прамысловай палаты, каб можна было аператыўна афарміць сертыфікат паходжання тавару, а таксама вырашаецца пытанне з Дзяржпагранкамітэтам аб магчымасці афармлення на месцы міжнароднай таварна-транспартнай накладной. Сёння на Мінскім аптовым рынку знаходзіцца прадукцыі Беллегпрама на 1,5 мільярда беларускіх рублёў. Таксама Аляксандр Ліхачэўскі расказаў, што цяпер вядуцца перамовы з Мінгандлем пра выдзяленне яшчэ адной гандлёвай пляцоўкі на базе ДА «Белрэсурсы»: там зараз вядзецца капітальны рамонт гандлёвых плошчаў, і ў выніку можа быць выдзелена для арэнды прадпрыемствам 3000 кв. метраў гандлёвых плошчаў, плюс 4000 тыс. кв. метраў складоў без ацяплення.

Вядзецца праца і па стварэнні аптовых пляцовак і ў рэгіёнах рэспублікі. Прынамсі, у Магілёве такая пляцоўка створана на базе выставачнага комплексу «Прыдняпроўскі». Як расказала Вольга Яшына, намеснік начальніка ўпраўлення прадпрымальніцтва камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама, прадпрыемствам выдзелена 1300 кв. метраў гандлёвых плошчаў пры стаўцы арэнднай платы, крыху большай за 7 тыс. бел. руб. за 1 кв. метр. Зараз там размешчана прадукцыя больш як 50 прадпрыемстваў. Дарэчы, магіляўчане гатовыя выдзяліць месца ў выставачным комплексе і прадпрыемствам з іншых рэгіёнаў.

У Гродзенскай вобласці плануецца выдзяліць месцы пад аптовыя пляцоўкі на рынку «Гроднагандальсэрвіс» і на лідскім рынку-складзе, у Гомельскай вобласці — на вялікай пляцоўцы ў 26 тыс. кв. метраў УП «Аблгандальсаюз».

Аляксандр Ліхачэўскі адзначыў, што пастаянна вядзецца маніторынг удзелу суб'ектаў малога прадпрымальніцтва ў разгрузцы складоў і што ў гэтай справе ёсць пэўныя зрухі:

— Калі яшчэ тры тыдні таму я казаў, што ступень удзелу малога бізнэсу ў рэалізацыі айчынных тавараў была не большай за 3 % ад агульнага аб'ёму рэалізацыі айчыннай прадукцыі, то зараз гэтая доля паднялася да 7 %.

Па словах Таісы Гапеенкі, начальніка аддзела гандлю і маркетынгу канцэрна «Белдзяржхарчпрам», калі ў агульным па канцэрне доля рэалізацыі прадукцыі малому бізнэсу складае 7,1 %, то па асобных прадпрыемствах, напрыклад, Беллакт, Крыніца і Чырвоны харчавік, яна даходзіць да 27 %. Валерый Навумовіч, начальнік аддзела знешняй эканамічнай дзейнасці і маркетынгу канцэрна «Беллеспаперапрам», паведаміў, што доля ўдзелу малога бізнэсу ў рэалізацыі прадукцыі прадпрыемстваў Беллеспаперапрама складае 8 %, і такі нізкі ўзровень звязаны са спецыфікай прадукцыі — мэблі, шпалераў, сшыткаў і запалак.

Павел БЕРАСНЕЎ.

АМБІЦЫЙНЫЯ ПЛАНЫ

Еўракамісія прэзентавала ў Беларусі ініцыятыву «Усходняе партнёрства»

Новы фармат узаемадзеяння, прапанаваны ўсходнім краінам — суседкам ЕС (Азербайджану, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Малдове і Украіне), трымае курс на паляпшэнне і паглыбленне ўзаемаадносінаў. Грунтуецца ён на чатырох платформах — па-першае, дэмакратыя і дзяржкіраванне, правы чалавека, па-другое, эканамічная інтэграцыя, па-трэцяе, энергабяспека, па-чацвёртае, кантакты паміж людзьмі. Каб максімальна шырока азнаёміць грамадскасць з сутнасцю, магчымасцямі, механізмамі і ўмовамі супрацоўніцтва, Еўрапейская камісія правядзіць выязныя прэзентацыі ва ўсіх шасці краінах-«партнёрках».

У Беларусі замежныя госці сустрэліся з прадстаўнікамі ўладных структур (у тым ліку мясцовых органаў улады), грамадзянскай супольнасці, апазіцыйных партый і журналістамі.

— Беручы ўдзел ва Усходнім партнёрстве, мы ставім перад сабой амбіцыйныя мэты, да якіх трэба імкліва рухацца, — адзначыў **Джон О'РУРК, кіраўнік аддзела Еўрапейскай палітыкі добрасуседства Генеральнага дырэктарата Еўракамісіі па знешніх сувязях**.

Ён адзначыў, што рэалізацыя праграмы скіраваная на тое, каб зблізіць краіны-партнёры з Еўрасаюзам, дамагчыся іх большай эканамічнай і палітычнай інтэграцыі з ЕС. У эканамічным плане акцэнт робіцца на падтрымку ўсходніх краін у гарманізацыі іх рынкавых сістэм з еўрапейскімі стандартамі. Што да гэтага канкрэтнага візіту, то прадстаўнік Еўрапейскай камісіі асабліва падкрэсліў шырокае залучэнне ўрадавых чыноўнікаў, няўрадавых арганізацый.

— Мы таксама выявілі тут, у параўнанні з іншымі краінамі, якія наведалі, што як грамадзянская супольнасць, так і прадстаўнікі ўладаў прыбылі вельмі добра падрыхтаванымі, — дадаў выступоўца. — Яны сапраўды зацікаўленыя ў нашых прапановах, а гэта абнадзейлівы знак таго, што мы можам спадзявацца на правядзенне дыялогу ў рамках Усходняга партнёрства.

Джон О'Рурк расказаў аб прапановах ЕС па праектах-флагманах у галіне кіравання межамі, падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, рэагавання на прыродныя і тэхнагенныя катастрофы, энергетычнай бяспекі. Ён таксама выказаў спадзяванне, што ўсе дзяржавы-ўдзельніцы змогуць атрымаць выгаду ад іх рэалізацыі. Нагадаем, што Усходняе партнёрства прадугледжвае праекты не толькі на двухбаковай аснове, але і ў шматбаковым фармаце.

Наладжванню міжкультурных кантактаў, натуральна, паспрыяла б лібералізацыя візавага рэжыму. **Рэйнальд БРЭНДАР, намеснік кіраўніка аддзела па супрацоўніцтве з Беларуссю, Малдовай, Украінай і краінамі Паўднёвага Каўказа Генеральнага дырэктарата Еўракамісіі па знешніх сувязях**, падкрэсліў зацікаўленасць з боку ЕС «паглядзець, што можна зрабіць з абодвух бакоў, каб грамадзяне Беларусі маглі свабодна наведваць краіны Еўрапейскага Саюза». Сапраўды сувязь «чалавек — чалавек» — самы прамы і самы кароткі шлях да супрацоўніцтва.

Ала МАЧАЛАВА.

«СПЕЦЫЯЛІСТ» ПА БЕНЗАПІЛАХ

З гандлёвага месца на «Цэнтральным рынку» ў Брэсце нехта ўкраў бензапілу «Партнёр». Мінула некалькі тыдняў, і на гэтым жа рынку скралі яшчэ адну бензапілу «Штыль». Аператыўнікі затрымалі беспрацоўнага.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

В СВЯЗИ С ПРОЦЕССОМ ЛИКВИДАЦИИ УП «ЛАНДЫШ» ЛИКВИДАЦИОННАЯ КОМИССИЯ

ВЫСТАВЛЯЕТ НА ПУБЛИЧНЫЕ ТОРГИ НЕПРОМЫШЛЕННОЕ ЗДАНИЕ:

Лот 1. Туалет кирпичный об. пл. 27,8 кв. м, по адресу: **г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 57 а.** Начальная стоимость с НДС — 6 861 613 бел. руб. (снижена на 20 %). Задаток — 10 % от указанной стоимости. Зем. участок для обслуживания непромышленного здания будет выделен из земельного участка об. пл. 1,6491 га, (около 0,2 га), находящегося в постоянном пользовании УП «Ландыш». Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **16.10.09 г.** в 10.00 по адресу: **223610, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 57 а.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **15.10.2009 г.** по адресу: 223610, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 57 а.

Контактный тел. 801795 2 43 26, моб. тел. 8029 670 96 63.

УНП 600154422

В СВЯЗИ С ПРОЦЕССОМ ЛИКВИДАЦИИ УП «ЛАНДЫШ» ЛИКВИДАЦИОННАЯ КОМИССИЯ

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН СЛЕДУЮЩИХ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ:

Лот 1. Склад для топлива об. пл. 68,6 кв. м, производственный цех об. пл. 272,6 кв. м, котел КСИ-0,09Т, забор чугунный, туалет кирпичный, **Слуцкий р-н, д. Греск, ул. Минская, 1.** Начальная стоимость с НДС — 50 205 240 бел. руб. (снижена на 20 %). Задаток — 10 % от указанной стоимости. Зем. участок для обслуживания объектов будет выделен из земельного участка об. пл. 0,3272 га, находящегося в постоянном пользовании УП «Ландыш».

Лот 2. Здание цеха об. пл. 3406,5 кв. м, ограждение (кирпичное; ж/б), таль электрическая ТЭ-050, котел КСТ-25, котел КСВ-0,09Т, **г. Слуцк, ул. М. Богдановича, д. 57 а.** Начальная стоимость с НДС (снижена на 30 %) — 573 299 839 бел. руб. Задаток — 10 % от указанной стоимости. Зем. участок для обслуживания объектов будет выделен из земельного участка об. пл. 1,6491 га, находящегося в постоянном пользовании УП «Ландыш». Объекты продаются без условий. Задаток перечисляется на р/с 3012200130017 в ОАО «Белагропромбанк» г. Слуцк, МФО 153001921, УНП 600154422 УП «Ландыш».

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **29.10.09 г.** в 12.00 по адресу: 223610, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 57 а. Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **28.10.2009 г.** по адресу: 223610, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 57 а.

Контактный тел. 801795 2 43 26, моб. тел. 8029 670 96 63

УНП 600154422

ЗАРОБКІ. ТОЛЬКІ ПОТЫМ — «КАМУНАЛКА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усё пачынаецца... з гандлю

Як падкрэслівае Уладзімір Сямашка, вырабіць пэўныя аб'ёмы прадукцыі сёння не складана — у краіне ёсць вытворчыя магутнасці, кваліфікаваныя кадры, абаротныя сродкі, у рэшце рэшт, магчымасці крэдытавання. Але праблема — прадукцыю прадаць. Насамрэч, апошнім часам статыстыка адзначае некаторае змяншэнне запасаў на складах, аднак пакуль гэта поспех адносны. Таму з'явіліся рашэнні аб у нечым беспрэцэдэнтных мерах. Адна з іх — ільготаванне банкаўскіх ставак пакупнікам беларускіх тавараў за мяжой. Па сутнасці, заўважае Уладзімір Сямашка, іншага выйсця тут няма, прычым сістэма льготавання павінна запрацаваць ужо ў найбліжэйшы час.

Адметны напрамак падтрымкі айчынных вытворцаў — і прапанова лізінгавых схем продажу. У гэтым плане пакуль мы рэальна прайграем замежным канкурэнтам, аднак беларуская лізінгавая кампанія плануе распачаць дзейнасць зноў-такі неўзабаве. Нарэшце, **у планах — змяншэнне падатковага цяжару на прадпрыемствы. Пры гэтым застаецца адкрытым пытанне наконт павелічэння падаткаў на дабаўленую вартасць. «Мінус» такога кроку — павелічэнне цэнаў на ўнутраным рынку. Аднак, канстатаваў Уладзімір Сямашка, рост ПДВ не закране інтарэсы «экспартных» прадпрыемстваў, да таго ж падобная мера разглядаецца як своеасаблівая абарона ўнутранага рынку — тавары на «ўваходзе» стануць даражэй.**

— Ёсць два варыянты наступнага развіцця падзей, — зазначыў першы віцэ-прэм'ер. — Паводле адна

ШЛЯГЕРЫ АБАВЯЗАНЫ БЫЦЬ!

На канцэртах «Залатога шлягера» ў Магілёве выступілі «зоркі» эстрады. Навінамі свайго творчага і асабістага жыцця яны дзяліліся з журналістамі ў фестывальным прэс-цэнтры. Увазе чытачоў «Звязды» прапануюцца самыя цікавыя моманты.

САПРАЎДНАЯ «ЗОРКА»

Кацярына Шаўрына ўразіла сваім знешнім абліччам. Модная прычоска і малады падцягнуты твар артысткі ў гадах — гэта зразумела. Але фігура і стыль адзення! Стройная мадам з'явілася ў прэс-цэнтры ў чорных легінсах, упрыгожаных актуальным пірацкім чэрапам з касцямі, і белым батніку з барочнымі ўзорамі і надпісам «noblesse oblige», у перакладзе з лацінскай «становішча абвязвае». Што ж, прафесія сапраўды абавязвае артыстку быць у форме, і Кацярына Шаўрына ахвотна яе прадэманстравала: не сальта, вядома ж, як у маладыя гады, але нахілы ўперад — так, да падлогі.

Аднак усё ж найбольшае ўражанне засталося ад стылю стасункаў артысткі, дружалюбнага і вясёлага. Сапраўдная «зорка» дорыць людзям выдатны настрой.

— Я не хачу спяваць на канцэрце фірмовае «Гляджу ў азёры сінія», — адразу заявіла Кацярына. — Хачу што-небудзь вясёлае, аптымістычнае, нават калі для гэтага давядзецца пасварыцца з рэжысёрам.

Яна расказала, што шмат зарабляе, але ўсё робіць сама — і кватэру прыбірае, і водзіць аўтамабіль.

— Не, я не бедная, магу наняць дзясятак хатніх працаўніц, — пераконвала артыстка. — Проста не магу даверыць свой дом чужым рукам. І, зразумела, трэба рабіць самой, каб больш рухацца. Тады не спатрэбяцца і трэніроўкі, якія забіраюць шмат сілаў. Я не разумею таксама, навошта дзецям наймаюць нянек. У маёй дачкі на двое дзяцей тры нянькі і хатні доктар. Навошта? Жанчына павінна выхоўваць і даглядаць сваё дзіця: яно павінна адчуваць яе мацярынскае цяпло.

Кацярына Шаўрына маляўніча распавядала, як з дзяцінства была ўпэўненая ў сваім артыстычным прызначэнні, як трэніравалася ў акрабатыцы на адзіным на ўсю таежную вёску незатопленым у паводку пагорку, як пераехала ў 15 гадоў у Маскву і вучылася ў інтэлігентаў усё рабіць прыгожа і ціха, як прызвычаілася цярпець боль у спіне — вялікія абцасы на сцэне не праходзяць бясследна...

Але найбольш цікава, што вялікая частка прэс-канферэнцыі была прысвечаная Але Пугачовай, з якой Шаўрына сутыкалася ў розныя моманты свайго жыцця.

— І стварыў жа Бог генія: усё, да чаго яна дакранаецца, становіцца геніяльным, — прызнае Кацярына. — Аднойчы з маёй прычоскі выпусціла рукой адну пасму, і я стала зусім па-іншаму выглядаць. На калядных сустрэчах яна падышла да яшчэ малавядомага за тым часам Мікалая Растаргуева і сказала: «А я бачу вас у гімнасцёрках!» З таго часу ў «Любэ» з'явіўся свой твар, адрозны ад іншых. Пугачова — сапраўдная Прымадонна, і за гэта ёй можна дараваць што заўгодна.

Нячаста ад артыста можна пачуць такія добрыя словы ў адрас калег.

— Паміж нармальнымі артыстамі няма ніякага суперніцтва, — пераконвала журналістаў Кацярына. — Калі вам нехта будзе казаць пра зайздрасць калег, значыць — гэта не артысты, а рамеснікі. Я — Шаўрына, мне чужога не трэба, і маё ніхто не адбярэ. Але я схіляюся перад талентамі і працаголікамі.

МАЛАДОСЦЬ ЦІ ГРОШЫ?

Кампазітар і спявак Ігар Нікалаеў прыехаў у Магілёў з Лос-Анджэлеса. Ён сказаў, што яму падабаецца Беларусь, дзе ўсё проста і добра.

Шмат песень, напісаных Нікалаевым, сталі шлягерамі. Аднак ён прызнаўся, што рэцэпта напісання шлягераў так і не адкрыў: гэта заўсёды цуд і нечаканасць. Яго «Айсбергу», «Камарова», «Дзвюм зоркам» — чвэрць стагоддзя. Пакаленні змяніліся, але людзі ведаюць словы і матыў.

— Гэта феномен: народ сам выбірае, што яму спяваць, — лічыць Ігар. — Якасная рэтра-музыка паранейшаму гучыць крута.

Ён мог бы напісаць кнігу пра тое, як правінцыялу прыехаць у сталіцу і не разгубіцца. Але лічыць, што яна ўжо напісана Аляксандрам Дзюма.

— Гэта вечны сюжэт, — сказаў Нікалаеў. — Ты малады і хочаш заваяваць свет, але ў цябе ёсць толькі сціплы арандаваны пакой і кайф ад таго, што ўсё жыццё наперадзе. Але маладосць — гэта плюс, які з цягам часу праходзіць. Замест гадоў у цябе з'яўляецца крыху грошай. Як у Шэкспіра: усё тое ж сонца ўзыходзіць нада мной, але і яно не блішчыць навізной...

Разам з маладымі гадамі Ігар узгадаў і мастацкія саветы.

— Цяжка было прайсці праз дзядзькаў, якія там засядалі, але яны былі прафесіяналамі і рабілі сваю працу больш сумленна, чым цяпер, — упэўнены кампазітар. — Сёння ёсць тыя ж саветы, але цынічныя, заснаваныя толькі на грошах. «Стары, гэта не фармат...» Шчыра кажучы, я за мастацкія саветы. Калі б там сядзелі Пугачова, Співакоў, Круты, то іх меркаванню можна давяраць. Такія сходы ёсць і ў Амерыцы: прафесіяналы вырашаюць, варты артыст альбо не, каб выдаткаваць на яго грошы.

Ігар Нікалаеў ненадоўга прыляцеў на наш кантынент: ён хутка вернецца ў Амерыку, дзе працуе над музыкай у кіно. Першая яго праца ў фільме «Say it in Russian» атрымала нават нейкія прызы.

— Гэта больш рэальна, чым нашы вечныя размовы пра вялікую будучыню расійскага кіно, — лічыць кампазітар. — У Амерыцы людзі жывуць і робяць сваю справу — ціха і без пафасу.

ГРУЗІНСКІ МІР

Сасо Паўліяшвілі выступаў у Магілёве ў дзень нараджэння сваёй маці. Ён павіншаваў яе яшчэ ў цягніку ў поўнач. А журналістам паведаміў пра асаблівы поспех яго малодшай дачкі Сандры: малая ў гэты дзень зрабіла першы дарослы ўчынак — схадзіла на гаршчок.

У грузіна журналісты лагічна цікавіліся алкагольнымі напоямі і тостамі.

— Я практычна не п'ю алкаголь: аддаю перавагу келіху сухога чырвонага віна, да піва стаў абыякавы, можна крыху віскі ці пярцоўкі, але яшчэ лепей — крынічная вада, — паведаміў Сасо. — А галоўны і самы патрэбны тост — «За мір!», і з яго пачынаецца кожнае грузінскае застолле.

— Культура — гэта самае галоўнае, — дадаў яшчэ Сасо. — Мастацтва, спевы, тэатр — гэта тое, што нас аб'ядноўвае.

Ён расказаў, як на Алімпіядзе ў Калгары на плошчы спяваў галоўны грузінскі шлягер «Суліко»: яго слухачамі быў натоўп людзей у каўбойскіх ботах і стэтсанах. Ён любіць спяваць шлягеры, аднак апрацоўвае іх у нацыянальнай грузінскай манеры. Можа, гэткая доля напаткае і самы любімы шлягер Паўліяшвілі — «My way» Фрэнка Сінатры?

— Шлягеры — гэта песні, якія любяць людзі, — проста сказаў ён. — Маладыя цяпер любяць старыя песні ў сучасных апрацоўках, але сярод новых песень абавязкова ёсць і будуць шлягеры. Шлягеры абавязаны быць.

ТАТАРСКАЯ ЧЫСТКА

Рэнат Ібрагімаў размаўляў на прэс-канферэнцыі ціха: увечары яму трэба было спяваць «жыўцом» з прастуджаным горлам.

— Я не выбіраў музыку справай свайго жыцця: гэта Алах мяне такім стварыў, вось я і спяваю, — сказаў Рэнат.

Ён прыхільнік самых розных музычных жанраў. У дзяцінстве сядзеў у аркестравай яміне опернага тэатра, у бабулінай вёсцы слухаў народныя песні, поп-музыкай ён цяпер зарабляе на хлеб, а ў аўтамабілі настройвае прыёмнік на джаз і рэлакс-хвалю.

— А маё сапраўднае расслабленне — гэта лазня, — прызнаўся Рэнат. — Насамрэч лазню, якая сёння вядомая як руская, вынайшлі цюркі. У нас, татараў, ёсць такая традыцыя: перш чым узвесці дом, трэба пабудаваць лазню.

Прыгатаванне ежы — гэта таксама творчасць, лічыць спявак. Праўда, татарская кухня — гэта ў асноўным спалучэнне мяса і цеста, а такую ежу Ібрагімаў лічыць цяжкай для арганізма і аддае перавагу вегетарыянскім стравам.

Хоць ён спрабаваў навучыць журналістаў гатаваць сапраўдную шурпу. Цікаўнасць да рэцэпта знікла яшчэ на першай умове: маўляў, трэба узяць мяса менавіта маладога ягняці, каб мяса пахла яшчэ малаком... На базары ў Магілёве такога мяса дакладна няма.

Ібрагімаў збіраецца выхоўваць малодшую дачку ў традыцыях ісламу, таму што ўпусціў за працай і канцэртамі рэлігійнае выхаванне старэйшых дзяцей. Ён не ходзіць на тусоўкі, таму што лічыць іх «неэкалагічнымі» — сам артыст не п'е і не курыць. У вольны час песціць сябе прыродай. Не ўжывае хімічных лекаў, а аддае перавагу натуральным сродкам.

— Трэба чысціць свой арганізм, — вучыў ён. — Зрабіце «муку жыцця»: у кавамолцы памалоць грэчку, сухую шыпшыну і зялёную сачавіцу. Прымайце па сталовай лыжцы кожную раніцу, можна з вадой і мёдам. Вельмі добра таксама проста есці грэчкую кашу, але без солі і з аліўкавым алеем першага адціскання. Ад такой ежы шмат хваробаў сыходзіць.

«БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА» Ў РЫНГТОНЕ

«Беларускія песняры» ў суботу далі канцэрт у Маскве, у нядзелю — у Магілёве. Яны вельмі хваляваліся за якасць гуку, але вынік перавысіў усе чаканні магілёўцаў. Паводле меркавання многіх, гэта быў лепшы фестывальны канцэрт за мінулыя гады.

Перад выхадам на сцэну яны не выконваюць спецыяльныя рытуалы, а проста імкнуцца не лаяцца. Хоць прызнаюць, што амаль усе артысты — людзі прымхлівыя.

— Маладыя спевакі звычайна моляцца і шэпчуць, хоць часта спяваюць пад плюсавую фанаграму — што ж тут маліцца? — расказалі музыканты. — А аднойчы адна вядомая артыстка малілася і хрысцілася за сцэнай. «Навошта? Будзе ж фанаграма...» — «А калі не ўключыцца?..» І сапраўды аднойчы не ўключылася.

Вясёлай атрымалася размова пра незвычайныя падарункі: «Беларускім песнярам» у Туле падарылі пернік памерам з пісьмовы стол, Уладзіславу Місевічу прыхільнікі паднеслі драўляную булаву, Алегу Аверыну аднойчы прывезлі ў дом халадзільнік у якасці ганарару за выдатную песню.

— У маёй дачкі запісана на тэлефоне «Зачараваная», — паведаміў Валерый Дайнэка ў адказ на пытанне пра рынгтоны. — А ў мяне адным часам была «Белавежская пушча», прычым яна не была запісана, а набрана. Я з гэтым тэлефонам у руцэ трапіў у двайную аварыю: мы перакуліліся, зарыліся ў зямлю. І я сяджу ў шоку, мне балюча, я нічога не бачу і неўзабаве пачуў мелодыю «Белавежскай пушчы» з тэлефона. Толькі тады зразумеў, што сапраўды жывы!

Канцэрт «Беларусіх песняроў» на фестывалі адрозніваўся гасцямі, сярод якіх былі і лаўрэаты конкурсу ВІА імя Уладзіміра Мулявіна. Пераможцам яго стаў казахскі гурт «Достар». Казахі, сярод іншага, уразілі ўсіх добрым беларускім вымаўленнем: гавораць, наймалі дзеля гэтага спецыялістаў. На песню «Ля замкавай гары» музыканты хочуць зняць кліп: прычым адзін куплет будзе на беларускай мове, а другі — на казахскай.

— Гэта ўдалая ідэя — падвесці моладзь да музыкі Мулявіна, — прызналі «Беларускія песняры».

— Магілёву пашанцавала з «Залатым шлягерам»: тут убачылі Магамаева, Абадзінскага і іншых знакамітых савецкіх спевакоў, — лічаць музыканты. — У нас ёсць цудоўнае мінулае, а ў «Залатога шлягера» сапраўды ёсць будучыня. Павінны з'явіцца новыя творы. Уявіце сабе, тут некалі адзначыць сваё 70-годдзе Іна Афанасьева: спяе пра жэмчугі, і нехта заплача настальгічнымі слязьмі.

Ілона ІВАНОВА.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Зварот у карпункт

І ГАРАЧАЙ ВАДЫ НЯМА, І СМЯРДЗІЦЬ

Укарэспандэнцкі пункт «Звязды» па Віцебскай вобласці звярнуўся па дапамогу жыхар абласнога цэнтра Уладзімір Аляксандравіч Ададзіч. Ён ад імя жыхароў пяціпавярховага цаглянага дома №10 па вуліцы Лазо вельмі папрасіў журналіста рэспубліканскай газеты неяк паўплываць на прадстаўнікоў камунальнай службы, якія не вельмі аператыўна вырашаюць камунальныя праблемы жыхароў.

Паабяцаюць прыйсці, а калі — невядома. Даводзіцца гадзінамі сядзець у кватэры і чакаць. А бывае, даходзіць да таго, што па тэлефоне прымаюць нейкую заяўку, а потым гавораць, што ніхто з жыхароў не тэлефанаваў. І так не адзін раз. А на некаторыя ўжо прынятыя заяўкі ўвагі не звяртаюць.

— Я жыву ў пад'ездзе № 2. Увечары, бліжэй да ночы, прыходжу з працы, дык дамафон не працуе, бо электрычнасці няма. Падняцца па лесвіцы вельмі цяжка па той жа прычыне — без электрычнасці адпаведна не гараць лямпачкі. Наколькі я памятаю, з жыллёва-эксплуатацыйнага ўчастка перыядычна павінны прыходзіць і правяраць, ці спраўна працуюць розныя «камунікацыі», — расказвае чытач. — Прыходзіш у кватэру, хочацца, зразумела, памыцца. Дык няма гарачай вады. А ўсё таму, што не працуе прыбор падагрэву вады, што стаіць у падвале.

Паводле слоў чытача, прадстаўнікі ўчастка ў гэтым абвінавачваюць... самі жыхароў. Маўляў, нехта самастойна падключаецца і фактычна крадзе электрычнасць. Таму і праблемы з электрычнасцю ўзнікаюць: дамафон той жа самы не працуе, лямпачкі не гараць і вада не грэецца.

Каб больш падрабязна разабрацца ў сітуацыі, аўтар гэтых радкоў выехаў на месца. Суседзі па доме Уладзіміра Аляксандравіча яшчэ шмат чаго дадалі да ўжо вядомых мне праблем.

— А ў падвале двух пад'ездаў смярдзіць фекаліямі, — расказвае пенсіянерка Таццяна Дзмітрыеўна. — Стаякі ў ванных пакоях памяняць трэба. Колькі тэлефанавалі, пісалі — ніякай рэакцыі, нічога не робіцца. Добра, што хоць пачалі мяняць бітае шкло на лесвічных пляцоўках.

Мне, калі мы размаўлялі з жыхарамі ў двары, адразу кінулася ў вочы, што тэхнічныя калодзежы на вялікай глыбіні ад узроўню асфальту. Машына паедзе — лёгка можа трапіць у «пастку».

— Гэта так у нас асфальт у двары на дарозе мянялі, паглядзіце! — у адзін голас гавораць жыхары. — Нехта ж прымаў такую няякасную работу, распісаўся ў адпаведным акце. Тут і пешаход, калі ў цёмны час сутак пройдзе, можа лёгка зачапіцца за асфальт. А калі маці з дзіцячым вазком ідзе гуляць, як вазок праедзе?

Каб атрымаць каментарый па праблемных пытаннях, папрасіў кіраўніцтва ЖЭУ ўсё растлумачыць.

Начальнік жыллёва-эксплуатацыйнага ўчастка № 14 Васіль Мікалаевіч Зянькоў на сваёй пасадзе працуе нядаўна.

— Што датычыцца якасці асфальтавання дарогі, я на той час гэты жыллёва-эксплуатацыйны ўчастак не ўзначальваў, — кажа ён. — Безумоўна, трэба агледзець калодзежы, і потым можна на люкі паклясці пліты.

Што датычыцца праблем з электрычнасцю, там стаяў слабы па магутнасці аўтамат. Нехта, відаць, самастойна падключаўся, але даказаць гэта цяжка. Ёсць у нас сярод жыхароў умельцы. У вячэрні час аўтамат «выбівала», таму і не падаравалася вада. Да мяне падыходзілі людзі, і мы праблему вырашылі. Больш скаргаў пасля ўсталявання новага магутнага аўтамата не паступала. Будуць далей скардзіцца — разбярэмся.

Наконт фекалій. Людзі розныя жывуць, і агуркі ва ўнітаз выкідваюць, і іншае. А некаторыя, што жывуць ніжэй, бачаць, што пачынаецца падтапленне, дык ідуць у падвал і выцягваюць спецыяльныя заглушкі. Жыхароў першага паверха можна зразумець: усё пойдзе праз унітаз проста ў кватэру. Пытанне пра фекаліі вазьму на кантроль. Сам схаджу ў падвал. Праблемы, пра якія вы расказалі, безумоўна, возьмем на кантроль.

Як жыхар звычайнага дома-«хрушчоўкі» добра разумею крыўду жыхароў дома па вуліцы Лазо на камунальнікаў. Бывала, таксама траціў цэлы дзень, пакуль чакаў спецыялістаў з ЖЭУ. Пра якасць выкананага — асобны артыкул напісаць можна. Але ў апошні час заўважыў, што больш старанна працуюць.

Наконт прыёму заявак па тэлефоне. Зразумела, кіраўніцтву ЖЭУ, што абслугоўвае гэты дом па вуліцы Лазо, трэба разбірацца. Адразу і не верыцца, што выслухаюць і не запішуць скаргу ў спецыяльны журнал. А калі так, мо даўно трэба замяніць «прыёмшчыка скаргаў»? Пісаў раней, што на ўзроўні пракуратуры ў свой час разбіраліся з тым, як камунальнікі рэагуюць на скаргі. Так што можна за дрэнную працу і перад пракурорам адказаць.

Праз дзень, калі падрыхтаваў тэкст, я звязаўся з чытачом. Той сказаў, што праблем з дамафонам і падагрэвам вады ўжо няма. Праз тыдзень сказаў, што, калі з асвятленнем і гарачай вадой усё добра, узроўнем якасці дарожнага пакрыцця ніхто не займаўся.

Мо і насамрэч праблемы жыхароў не хутка вырашацца? А хочацца адразу. Журналісцкая практыка паказвае, што больш эфектыўныя не тэлефонныя звароты ў камунальныя структуры і скаргі ў рэдакцыі мясцовых і іншых газет, а заказныя лісты, пасланыя камунальнаму начальству, дзе падрабязна напісана пра ўсе цяжкасці пражывання ў канкрэтным доме.

Купіце паштовы канверт, напішыце ліст, пашліце яго заказным. Калі адказ не спадабаўся (нічога не зрабілі, спасылаючыся на фінансавыя і іншыя праблемы), пашліце копію адказу і яшчэ адзін ліст у іншыя інстанцыі — начальству раўнадушных камунальнікаў. Адтуль, натуральна, яго адправяць на рэагаванне «ўніз» — апошнім. Замкнёнае кола? А што зробіш? Лёгка нічога не даецца.

Вось нядаўна дапамагаў жыхарам іншага дома «змагацца за правы». Дапамагло. Праходжу міма — рабочыя нешта рыхтуюцца зрабіць па рамонце. Але гэта ўжо зусім іншая камунальная гісторыя з больш вясёлым канцом.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«Залаты шлягер» пераязджае на вёску

Першыя чатыры дні кастрычніка Магілёў літаральна гудзеў ад шматлікіх канцэртаў і забаў XI Міжнароднага музычнага фестывалю «Залаты шлягер». Вялікі канцэрт адкрыцця, дзе бралі ўдзел беларускія і расійскія «зоркі» эстрады, юбілейныя канцэрты «Любэ» і «Беларускіх песняроў» і іншыя — усе прайшлі з аншлагамі.

Аднак фестываль на гэтым не завяршаецца. «Залаты шлягер» працягнецца ў сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці. У аграгарадках і раённых цэнтрах пройдуць канцэрты артыстаў і мастацкіх калектываў рэгіёна. Фестываль распісаны да 16 кастрычніка: ён завершыцца выступленнямі Прэзідэнцкага аркестра з творчым праектам «Маладыя галасы Беларусі» ў Шклове, Быхаве, Бабруйску і Асіповічах.

Ілона ІВАНОВА.

З ЧЫГУНКОМ І ХВАТАМ...

Бегалі з каромыслам і вёдрамі з вадой, бегалі з бочачкай, забівалі цвікі на хуткасць, калолі дровы, ездзілі вярхом – усё гэта і не толькі рабілі мужы. І іх жонкам таксама не было сумна: яны пабегалі з чыгункам з вадой і хватам, з яйкамі на скаварадзе, на хуткасць чысцілі цыбулю, дзерлі бульбу…

Усе гэтыя і іншыя нестандартныя конкурсы правялі для маладых сем'яў у аграгарадку Копці Віцебскага раёна. Тут прайшоў абласны этап сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла». Мужы і жонкі разам распілоўвалі дровы, пракатвалі колы… Разам афармілі «сямейны куточак», паўдзельнічалі ў конкурсе сямейных візітак…

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным камітэце БРСМ, у конкурсах бралі ўдзел пераможцы і прызёры раённых этапаў праекта «Уладар сяла». Да гэтага ў адборачных этапах у раёнах бралі ўдзел 105 сем'яў. Нагадаю, што ўпершыню праект стартаваў у пазамінулым годзе ў Глыбоцкім раёне і цяпер папулярны ва ўсёй краіне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«ПАМЕЖНЫЯ» ЖУРАВІНЫ

Пры набліжэнні членаў рэйдавай групы грамадзяне кінулі сабраныя ягады і збеглі на сумежную тэрыторыю...

Падчас сезона збору журавін такія здарэнні паблізу мяжы з Украінай робяцца ці не традыцыйнымі. Двойчы ў такіх выпадках супрацоўнік Тураўскай міжрайінспекцыі сумесна з памежнікамі і работнікамі Мілашэвіцкага лясгаса канфіскавалі агулам больш за паўтоны ягад. Дарэчы, пазней гэтыя журавіны былі знішчаны, паколькі экспертыза прызнала іх непрыдатнымі да ўжывання з-за высокага ўтрымання радыенуклідаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НА НАС ДРЭВА ПАВАЛІЛАСЯ!

У вёсцы Мазалава Віцебскага раёна а дзясятай гадзіне вечара фактычна заложнікамі дрэва сталі людзі. Мясцовы жыхар паведаміў па тэлефоне пажарнай аховы, што ў дварыдома, дзе жывуць дзве сям'і, павалілася топаля, ды з такой сілай, што знішчыла гаспадарчую пабудову (плошчай 8 квадратных метраў) і пашкодзіла лінію электраперадач. На месца здарэння выехалі пажарныя, медыкі, электрыкі з аварыйнай службы.

Добра, што ніхто з жыльцоў, а на той час у доме знаходзіліся чатыры чалавекі, паранены не быў. Супрацоўнікі электрасетак адключылі ток. Дрэва дыяметрам каля 70 сантыметраў распілавалі. Страты падлічваюцца.

А ў Віцебску ў той жа дзень на вокны кватэры дома, што на першым паверсе, па праспекце Фрунзэ таксама ўпала дрэва. Аконны блок мог разбурыцца. Пажарныя паспелі своечасова і не дапусцілі гэтага.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Крымінал, здарэнні

ВЫРАТАВАЛЬНІКІ ЗНАЙШЛІ 9-ГАДОВАГА ХЛОПЧЫКА

1 кастрычніка ў Клічаўскі раённы аддзел надзвычайных сітуацый паступіла просьба дапамагчы ў пошуку хлопчыка 2000 года нараджэння, які знік без вестак. Малодшы школьнік 30 верасня пасля ўрокаў пайшоў са школы, але дадому не вярнуўся. На той час хлопчыка не бачылі ўжо болей за суткі.

Як паведамілі ў Магілёўскім абласным упраўленні МНС, міліцыянеры і выратавальнікі Клічава (усяго паўсотні чалавек) пачалі пошукі. У 17 гадзін супрацоўнікі аддзела па надзвычайных сітуацыях Аляксандр Серада і Сяргей Юневіч знайшлі малога, які сядзеў на супрацьлеглым ад іх баку ракі Ольса ў лодцы. Аднак, убачыўшы людзей у форме, дзіця спужалася і кінулася на ўцёкі па завадзі. Сяргей Юневіч не разгубіўся: выратавальнік распрануўся, пераплыў халодную рэчку і дагнаў хлопчыка. Выратавальнікі пераапранулі ўцекача ў сухую вопратку і даставілі ў раённую бальніцу. Медыкі не знайшлі ў пацыента пераахаладжэння: хлопчык прызнаўся, што начаваў у стозе сена. Цяпер ён вярнуўся ў апякунскую сям'ю.

Ілона ІВАНОВА.

РАЗВАРОТ ДАЧНАГА ЖЫЦЦЯ...

Пад коламі аўтамашыны «ВАЗ-2108», якой кіраваў 24-гадовы жыхар Чачэрска, загінуў 23-гадовы гамяльчанін, паведамляе прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама.

Малады мужчына сядзеў на лаўцы ля дачнага дома ў вёсцы Аляксандраўка Буда-Кашалёўскага раёна, калі аўтамабіль пачаў разварочвацца. Пацярпелы быў дастаўлены ў раённую бальніцу з закрытай чэрапна-мазгавой траўмай і пераломам костак таза, але праз некалькі гадзін памёр.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ГЭТА СПІРТНОЕ ПІЦЬ УЖО НЕЛЬГА

Супрацоўнікі міліцыі пры праверцы крамаў спажывецкай кааперацыі ва Ушацкім і Віцебскім раёнах канфіскавалі 61 літр пратэрмінаваных спіртных напояў. Канфіскаваныя бутэлькі пацягнулі па цане на больш чым 530 тысяч рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ХТО ПАКІНУЎ «ТРАЎКУ»?

Спробу ўвозу амаль кілаграма наркотыкаў спынілі аператыўнікі Мазырскай мытні сумесна з памежнікамі. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта.

Трохлітровая пластыкавая ёмістасць са здробненай расліннай масай цёмна-зялёнага колеру агульнай вагой больш за 990 грамаў была схаваная ў батарэі ацяплення аднаго з вагонаў цягніка, які кіраваўся па маршруце «Хмяльніцкі—Санкт-Пецярбург». Прычым праведзеная пазней экспертыза засведчыла, што раслінная маса з'яўляецца наркатычным сродкам — марыхуанай. На гэты момант, адзначылі ў прэс-службе ДМК, вядуцца пошукі гаспадароў гэтага тавару. Распачатая крымінальная справа.

Сяргей ГРЫБ.

ТУІ ОПТАМ

Раніцай з клумбы на перакрыжаванні вуліц Кастрычніцкай і Бажэнава ў Лунінцы было ў адкрытую знесена 14 туй. Пра гэта паведаміла ў міліцыю вартаўнік райпа. А ўкраў тыя туі 25-гадовы беспрацоўны. Узбуджана крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗАЯЦ? ЗАЯЦ, ЗАЯЦ...

Фальшывае пасведчанне супрацоўніка КУП «Гарэлектратранспарт» паказаў 32-гадовы грамадзянін замест талончыка аплаты ў аўтобусе 12-га маршруту ў Гомелі.

Але ж пільнасць не падвяла сапраўднага рэвізора, а ў дачыненні да фальсіфікатара ўзбуджана крымінальная справа.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ШТО ВЫРОШЧВАЎ, ТОЕ І СКРАЎ

Пры затрыманні за крадзеж сажалкавай рыбы рыбавод ААТ «Рыбгас «Волма» прайвіў непадпарадкаванне работнікам Мінскай аблінспекцыі.

Транспартны сродак інспектары прыпынілі для праверкі пры выездзе з тэрыторыі рыбгаса. За непадпарадкаванне законным патрабаванням работнікаў абласной інспекцыі рыбаводу давядзецца заплаціць штраф у памеры 875 тысяч рублёў. А матэрыялы адносна крадзяжу рыбы перададзеныя ў суд Чэрвеньскага раёна.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЯРНІ ДОЎГ, ГІМНАЗІСТ!

У Віцебску ў міліцыю па дапамогу звярнулася мясцовая жыхарка, якая паведаміла, што ў яе сына, вучня 9-га класа, невядомыя асобы патрабавалі вярнуць доўг, якога няма.

Прыходзілі неаднаразова ў гімназію і з пагрозамі пабіць патрабавалі аддаць ім 140 амерыканскіх долараў. Грошы хлопец аддаў. «Рэкецірамі» былі два браты: 20-гадовы навучэнец ліцэя і 19-гадовы рабочы. Узбуджана крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Хочаце — верце...

Лепшы сродак супраць імпатэнцыі?.. Лёд!

І ніякія дарагія лекі і «стымулятары» патэнцыі могуць не спатрэбіцца, калі «ўзнімаць мужчынскія настрой і моц» звычайным лёдам. Холадна? Затое «мужчынскі гадзіннік» заўсёды, пры неабходнасці, будзе паказваць «на поўнач».

Гэтым даволі нечаканым і нестандартным рэцэптам падзяліўся з чытачамі «Звязды» **спецыяліст па нетрадыцыйных метадах лячэння з Віцебска Анатоль ЗАХАРАНКА.**

Паводле слоў спецыяліста, які шмат ведае старадаўніх народных спосабаў лячэння ад розных хваробаў, лёд, безумоўна, лепш браць натуральны, у чыстых месцах, далёкіх ад дарог і прадпрыемстваў.

Праўда, праблема можа ўзнікнуць з тым, як яго данесці (давезці) да дома. Чаму б не выкарыстаць «міні-халадзільнік»? Напэўна, па чысты лёд гарадскім мужчынам давядзецца адправіцца да сваякоў у вёску.

А самы лепшы лёд — безумоўна, ля крыніц з карыснай вадой. Хоць і з хатняга халадзільніка штучна прыгатаваны лёд у прынцыпе не горшы.

Лёд трэба пакалоць, загарнуць у марлю ў некалькі слаёў і прыкласці на хвіліну на заднюю частку галавы, потым — на такі ж час у вобласць сэрца. І аналагічна — на хвіліну да машонкі. Рэкамендуецца паўтараць гэтую працэдуру па некалькі разоў штодня — мінімум дзесяць. Курс — да двух тыдняў.

Безумоўна, нельга прымяняць гэты спосаб тым, хто пакутуе ад сардэчных хваробаў, ды і наогул тым, у каго алергічная рэакцыя на холад.

Ёсць яшчэ больш просты халодны спосаб лячэння і прафілактыкі імпатэнцыі. Па чарзе трэба будзе пасядзець у тазе з халоднай і гарачай вадой. Усяго па хвіліне. І так разоў дзесяць мінімум. Лепш за ўсё лячыцца перад сном.

Улічваючы, колькі каштуюць усякія аналагі «Віягры», мо і варта для лячэння паспрабаваць лёд і ваду? Ужо пахаладала, хутка лёду будзе шмат. Натуральна, самы лепшы сродак быць «заўсёды гатовым» — старацца весці здаровы лад жыцця і мець стасункі з добрай, клапатлівай, гарачай жанчынай.

Аляксандр ПУШАНСКІ.

ЖЫЛЬЦОЎ ДОМА ЭВАКУЯВАЛІ

У Полацку пажарным давялося эвакуяваць жыльцоў пяціпавярховага панэльнага дома, што на вуліцы Камуністычнай.

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным упраўленні МНС, а восьмай гадзіне вечара жыльцы дома патэлефанавалі ў службу «101». Гарэла адна з кватэр. Пажарныя выратавалі гаспадара кватэры — 41-гадовага гандляра «Полацкага калгаснага рынку». Самая верагодная прычына пажару — неасцярожнасць пры курэнні ў нецвярозым стане. Жыльцоў з вышэйшых паверхаў дома давялося эвакуяваць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Жаночыя сакрэты

ГНУТКАЯ, ВЫТАНЧАНАЯ, ПРЫВАБНАЯ...

Калі ваша шыя менавіта такая, то любое дэкальтэ — якраз для вас

Забудзьцеся аб жаданні прыкрыць шыю шалікам або надзець блузку з высокім каўнерыкам. Ні ў якім разе нельга ісці на повадзе абставінаў — пастарайцеся (і гэта пад сілу кожнай з нас!) зрабіць сваю шыю «лебядзінай».

СІЛА ЗВЫЧКІ

Выпрацоўвайце з маладосці звычку хадзіць з высока ўзнятай галавой.

Не сутульцеся.

Не чытайце лежачы.

Не спіце на высокай падушцы. Пастарайцеся абыходзіцца зусім без яе.

Сонца — вораг шыі-«арыстакратак». І гаворкі быць не можа пра тое, каб падстаўляць шыю сонечным праменям. Свабодныя радыкалы, што ўтвараюцца пад іх уздзеяннем, сушаць скуру, правакуюць утварэнне маршчын. Моцна змазвайце шыю, грудзі і дэкальтэ сонцаахоўнымі крэмамі не толькі на пляжы, дачы, паўднёвых курортах, але і штодзень адпраўляючыся на працу.

Не злоўжывайце салярыем.

МЫЛІМ ШЫЮ!

Рабіце гэта старанна і абавязкова кожны дзень. Можна звычайным мылам. А лепш далікатнай пенкай або іншымі спецыяльнымі сродкамі для ўмывання твару.

Кругавымі рухамі знізу ўверх злёгку памасіруйце намыленую шыю мяккай шчоткай і падушачкамі пальцаў.

Каб змякчыць скуру шыі, апалясніце яе пасля густога намыльвання вадой з дабаўленым лімонным сокам.

Калі яна вельмі сухая і ўжо добра відаць прыкметы завядання, выкарыстоўвайце для ачышчэння шыі касметычныя вяршкі або малачко.

Прымаючы душ, абавязкова накіроўвайце халаднаватыя струмені вады на шыю з усіх бакоў. Гэта ўзмацняе кровазварот.

ПЕСЦІМ І СІЛКУЕМ!

Хочаце даць шыі сапраўднае задавальненне? Пасля ачышчэння нанясіце на яе спецыяльны крэм з пазнакай для скуры бюсту, зоны дэкальтэ і шыі. Як правіла, ён павінен быць тлустым і пажыўным, утрымліваць экстракты танізавальных і змякчальных траў, якія рэгулююць страту вільгаці і ўзмацняюць засцярогу скуры.

Няма спецыяльнага крэму з маркіроўкай «для шыі»? Вам падыдуць і тыя, што адрасаваныя нармальнай і сухой скуры твару.

Прызвычайцеся пасля нанясення крэму рабіць лёгкі (10—15 хвілін) масаж — тыльным бокам далоняў папляскайце па шыі з бакоў, а падбародак масіруйце хуткімі рухамі — пастуквайце пальцамі, як піяністы па клавішах.

Працягнуць маладосць шыі дазваляюць маскі — не забывайце ўдзяляць ім хоць бы 20 хвілін на тыдзень. Існуе мноства гатовых масак. Калі ёсць жаданне, можаце скарыстацца «бабулінымі рэцэптамі». Аднак, пускаючыся ў эксперыменты, не забывайце сачыць за рэакцыяй скуры — яна не павінна раздражняцца, чырванець, лушчыцца...

ГУЛЬНЯ КАНТРАСТАЎ

Асвяжыць і танізаваць скуру шыі дапамагаюць не толькі маскі, але і кампрэсы. Калі ў вас няма праблем са шчытападобнай залозай, зрабіце звычайнай «гульню» ў кантрасныя працэдуры — хоць бы 3-4 разы на тыдзень. Намачыце махровы ручнік у гарачай вадзе або наст

ЗВЯЗДА 6 кастрычніка 2009 г.

«У нас няма Калізея, у нас ёсць Гальшанскі замак!»

На Гродзеншчыне ўпершыню прайшоў фестываль «Гальшанскі замак»

Дзеянне на галоўнай сцэне свята не спынялася ні на хвіліну.

Фестываль, які на гальшанскай зямлі ладзіўся першы раз, плануе стаць штогадовым. Сёлета ён прымеркаваны да 10-годдзя гурта «Стары Ольса», у наступным годзе чакаецца 400-я гадавіна Гальшанскага замка...

Пачатак фэсту асабліва не ўражваў: пасля шэсця моладзі ў стылізаваных касюмах эпохі Сярэднявечча, на сцэну выйшлі мастацкія калектывы. Хораша спявалі: пра «Купалінку» і пра тое, «як цячэ вада ў ярок». Мяне, прынамсі, адразу на ўспаміны пацягнула: поле, жніво, каня ля крыніцы плача... Толькі вось ненадоўга хапіла беларускага фальклору, перайшлі на рускі: пра «степной бурьян» і «раскудрявый клён зелёный». Слова «зелёный» з такой асіміляцыйнай мяккасцю вымаўлялася, што станавілася сумна...

Людзі на пляцы варушыліся, як мурашы ў жніўні: гандляры ўладкоўвалі апошнія тавары, з нагі на нагу пераступалі журналісты... Туды-сюды сноўдалі скамарохі ў характэрным адзенні, паціху на машынах пад'язджалі наведвальнікі: з Мінска, Ашмянаў, Астраўца, Варнянаў... На гэтым фоне са сцэны даносіліся абрыўкі «Кацюшы», а праз колькі хвілін заспявалі «День Победы». Гэта, відаць, у падтрымку таго, што фестываль сёлета ладзіцца ўпершыню, і «Стары Ольса», які будзе яшчэ выступаць, адзначае сваю маленькую перамогу — 10 гадоў з моманту заснавання...

ТУРЫСТЫЧНЫ ЗАМАК ГАЛЬШАНСКІ

— Сёння ў Гальшанах працуюць 3 агрэсядзібы, яшчэ пяць — на стадыі афармлення, — расказвае пра Гальшаны **старшыня Ашмянскага райвыканкама Юрый АДАМЧЫК**. — Ёсць гасцініца на 15 месцаў. Але трэба працаваць над тым, каб усе турысты: ад маладой сям'і да карпаратыўнага аўтобуса атрымлівалі добрыя і якасныя паслугі, пачынаючы ад побытавых і заканчваючы шашлыком, лазняй і пейнт-болам. І каб славіць кола турыстычных інтарэсаў, такіх «фішак» павінна быць не менш за сто. У нас няма Калізея, у нас няма пірамідаў, але ў нас ёсць Гальшанскі замак. Пакуль мы спрабуем — і ў нас атрымліваецца — эксплуатаваць ідэю прывідаў. Выкарыстоўваць сам брэнд «Гальшанскі замак» і легенды, якія з ім звязаныя. Сёння мы не вядзём гаворку пра ўзнаўленне замка ў першапачатковым выглядзе, але ёсць вельмі добрыя ідэі па кансервацыі замка і стварэнні экспазіцыі пад адкрытым небам: прычым руіны можна выкарыстоўваць у тым выглядзе, у якім яны захаваліся да сёння.

— Тут вельмі своеасаблівая аўра, вельмі слынная і багатая гісторыя, — дадае **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валянціна ЛУЗІНА**. — Разглядаецца пытанне пра аднаўленне сістэмы сажалак ля Гальшанскага замка. У кастрычніку пачнуцца работы па вынасе высакавольтных ліній электраперадач з тэрыторыі, якая прылягае да аб'екта. У работы плануецца ўкласці ад 210 да 250 млн. Тым больш, што наступны год — знакавы для Гальшанскага замка, 400-годдзе з моманту пабудовы. І я думаю, што ў 2010-м наш фэст стане самым цікавым з тых, якія ладзяцца сёння ў Беларусі. Налета плануем зрабіць фэст прывідаў...

Сёлетні фестываль, на думку Юрыя Адамчыка, — выдатная магчымасць рэкламы для Гальшан. Таму прапанову прымеркаваць падзею да 10-годдзя гурта «Стары Ольса» ўспрынялі з радасцю. Нават сумесна з іншымі спонсарамі дапамаглі з арганізацыяй. **Газета «Звязда» таксама не засталася ўбаку — мы выступалі як інфармацыйны спонсар.**

— Увогуле, я б назваў гэты фэст фестывалем анамальнага турызму: тут усё разлічана на прывіды, здані і г.д., — смяецца **заснавальнік і кіраўнік гурта «Стары Ольса» Зміцер САСНОЎСКІ**. — Але з гэтым брэндам можна раскруціцца вельмі ўдала. На фэст мы запрасілі нашых сяброў — таксама гурты сярэднявечнай музыкі. Таксама пастараліся сабраць усіх удзельнікаў нашага гурта розных гадоў (звычайна змяняліся толькі флейтысткі).

— Мы ўвогуле вырашылі выступаць як мага больш на дабрачынных канцэртах, не выстаўляючы высокіх ганарараў. І як пастанавіў калектыў, для сваіх людзей, якія з'яўляюцца непасрэднымі нашчадкамі тых, чыю музыку мы выконваем, гэта варта зрабіць бясплатным. Сярэднявечнай музыкі ў Еўропе цяпер шмат, але ў кожнай краіне яна развіваецца па-свойму. У Літве сюды, — прызнаецца Ян Матулай з Варнянаў. — Усё падабаецца, вось, сына на кані пакатаў. Арганізацыя добрая, адзіная нязручнасць — гэта арганізацыя месцаў для паркоўкі.

— Мы тут першы раз, — дзеліцца ўражаннямі сям'я Мордаль з Мінска. — Убачылі па тэлевізары рэкламу пра фестываль і вырашылі прыехаць. Натуральна, чулі і пра легенду Гальшанскага замка. Паспелі, дарэчы, і сувеніры тут набыць. Адзін з іх — фігурка дзедабарадзеда.

— Турыстаў прыязджае шмат, асабліва па нядзелях, — расказала карэспандэнту «Звязды» **мясцовая жыхарка ВАЛЯНЦІНА**. — І каля замка ўсё ходзяць. А Гальшаны? Кароў у статку ўжо мала, але на пашу яшчэганяем, хоць холадна, але што рабіць. Вуліцаў у нас шмат, кароў мала, дык мы па дзве вуліцы адразу. Людзі не хочуць кароў трымаць, усё больш на козаў перайшлі — зручней. А што да фестывалю, то мне ўсё падабаецца, вельмі добра выступаюць.

І СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ, І НА ГАСЦЕЙ ПАГЛЯДЗЕЦЬ

Пазначаныя ў праграме «атракцыёны» ўяўлялі сабой забавы ранняга Сярэднявечча: «амерыканскія горкі» ў іх былі заменены на ліцвінскія дзіды і лукі. Першыя можна было пакідаць, а з другіх пастраляць. І адно, і другое за сімвалічную плату ў тысячу беларускіх рублёў. Толькі вось наведвальнікі нейкія ўсе скрозь «касавокія» былі: ніводзін не пацэліў.

Страляць з лука — цэлая навука.

Асабіста маю ўвагу прыцягнулі неверагодная прыгажосці дудачкі. Памятаецца, вясной нешта падобнае я бачыў у Вільнюсе, дзе яны прадаваліся за 10 літаў.

— А колькі ў вас гэтая дудка каштуе? — пытаю пра размаляваную дудачку ў гандляркі.

— 6 тысяч. Ручной работы.

Гэтыя гандляры прыехалі на свята са Слоніма, дзе трымаюць адмысловую студыю па вырабе ўсяго такога. Увогуле «восеньскі кірмаш», акрамя дудак, прапаноўваў таксама сплеценую з саломы розную драбязу, тыпу кулонаў, фенечак, закладак і аплікацый.

Меламаны ж маглі набыць дыскі з беларускімі казкамі-калыханкамі (ваша дзіця будзе пад іх засынаць, калі не пашкадуеце 15 тысяч), дыскі «Вясковая лірыка» з дзіўнымі птушкамі-кветкамі на вокладцы, аўдыёкнігі Караткевіча, Някляева і іншых. Аматары беларускага рэпу (трапляліся і такія) ахвотна пыталіся пра альбом «Пачатак» рэпера Vincenta. Карацей, купляць — не перакупляць: абы было за што.

Апроч дыскаў, саламяных фенечак, бурштынавых пацерак і драўляных рэчаў у стылі канструктывізму можна было набыць і міні-пірог з яблыкамі. Амаль за тры тысячы. Чым карэспандэнт «Звязды» разам з калегамі і скарыстаўся. Разам і танней, і весялей.

Хоць яблыкамі ў тым сочыве толькі пахла, але мы запівалі яго гарачай гарбатай, і нам мроілася, нібыта за стогам сена ў Сапегаўскім двары сядзім: рабілася цяплей і хацелася танчыць.

Не ведаю, колькі людзей падсілкавалася гэткім жа чынам, але, мяркуючы па моладзі, якая, прытанцоўваючы пад сцэнай, махала рукамі, яблычны водар зацанілі многія.

Вулічныя тролі, блазны і паненкі (такіх стылізавана апранутых гасцей на свяце было шмат) станавіліся ў кола і зладжаным тэмпам падскоквалі ў такт музыцы. Гэта было прыгожа і самабытна. Але пасля да іх далучаліся навічкі-аматары — у вязаных швэдрах, прыталеных джынсах і спартыўных штанах — і тады ўсё разам стала нагадваць школьны выпускны баль...

Гурт «Унія», які быў на сцэне, словамі сваіх песень здзіўляў. Прынамсі, некаторыя з іх песень падаліся мне двухсэнсоўнымі. Узяць хоць бы гэтыя радкі: «Любі мяне, кавалёк, падарую вугалёк...»

Апагеем такой эклектыкі стала рокавая песня гурта «Унія». Трэба было бачыць, як калбасіліся пад яе паненкі ў стылізаваных сяредняевечных строях! Ды мяне б за такія танцы ды пад сценамі замка ў XV стагоддзі на вогнішчы спалілі б! І паненак тых, напэўна, таксама. Ці, можа гэта падэспань так адаптавалі?

Як бы там ні было, галоўнае — што весела. І цёпла. Бо ў такое надвор'е, калі ногі прымярзаюць да глебы, а рукі без пальчатак падобныя на хадулі ў цырку, трэба было неяк грэцца. Сапраўды ж сваёй шчырасцю і непасрэднасцю публіку сагрэлі дзве маленькія дзяўчынкі гадоў сямі. Стоячы ў эпіцэнтры, малыя трымалі ў руках тыя самыя пафарбаваныя дудкі за 6 тысяч, пра якія ўзгадвалася вышэй. Ды не проста трымалі, а прысядаючы ў такт з музыкай, з усёй моцы ў іх дулі, стараючыся прычыніцца да агульнай справы. Вось дзе пакаленне падрастае!

— Гандаль — дрэнь, слабы вельмі, — прызналася «Звяздзе» прадавачка саламяных шкатулак і пластмасавых бірулек, якіх навалам на кожным базары. — Гэта ў білетах прычына: такія кошты заламалі! Дваццаць тысяч з чалавека, а з дзіцяці да васьмі гадоў — пятнаццаць... Трэба было, каб дзеці бясплатна ішлі, а з дарослых тысяч па пяць...

ІГРАЛІ «МАРАЗУЛЬКУ», НАЗІРАЛІ ЗА ТАНЦУЛЬКАЙ

А пасля былі зноў спевы, зноў ігралі на дудзе. Таму калі надышла чарга імянінніка, вечар ужо патанаў у цемры. Асабліва «вынаходлівыя» ўсцягнулі на галовы цацачныя рогі, якія ззялі чырвоным святлом. Вельмі арыгінальна на фоне абрысаў Гальшанскага замка!

А справа ад уваходу на пляцоўку, дзе дзяжурылі ахоўнікі (уваход — толькі па білетах), сваю «службу» неслі мясцовыя хлапчукі, якім не хапіла на білет. Сцэна адсюль хоць і была не надта бачная, але затое за гук беларускай дуды, які сюды добра далятаў, плаціць не патрабавалася.

На сцэне стаялі ўдзельнікі «Старога Ольсы». У адаптаваным адзенні, у смешных чаравіках, з шыкоўнымі па гучанні музычнымі інструментамі, яны больш паходзілі на казачных эльфаў... Песня заканчвалася, і лідар гурта пытаўся ў публікі, што яна хоча пачуць зараз. Выбар сапраўды быў: за плячыма гурта восем альбомаў...

«Ружу давай! Ружу!», «У карчме!!!», «У карчме!!!» Многія добра ведалі рэпертуар музыкаў. Таму з першых нот песня падхоплівалася, і народ пачынаў спяваць. Прычым паралельна з танцамі. Асабліва дападобны прыйшоўся спеў «Слаўся, князь Вітаўт, гаспадар стагоддзяў», калі ў скокі пусціліся літаральна ўсе: ад старога да малога. Скажу шчыра, у гэты момант я адчуў сябе жыхаром сапраўднага ВКЛ. І навошта вучыць нейкія там ірландскія танцы, калі ёсць свае, беларускія, не менш цікавыя і не менш прыгожыя. Са сваёй гісторыяй, традыцыяй, са сваім непаўторным беларускім духам!

Наколькі ж багатая на традыцыі наша зямля, як шалёна мы можам любіць сваю родную зямлю і сваю родную мову, калі захочам! Чаму ж мы так рэдка гэта робім?

На сцэне тым часам музыкі пачалі іграць «Маразульку». Аднайменны танец быў падхоплены вулічнымі тролямі і паненкамі ў сяредняевечных строях. У момант да іх далучыліся ўсе астатнія, у вязаных швэдрах, прыталеных джынсах і спартыўных штанах, і ўсё разам гэта глядзелася так прыгожа і так самабытна, што нават не верылася, што гэта такое ў нас, у Беларусі дзеецца...

І прызнацца, нават там, дзе не танчылі, людзей было шмат, і ніхто не разыходзіўся. І хоць не на жарт пачынала марозіць, усе чакалі працягу.

Гарачую кропку ў першым фестывалі «Гальшанскі замак» павінны былі паставіць у фаер-шоу артысты калектыву «Крэсіва», на заканчэнне чаго гледачам абяцаўся святочны салют.

Акрабаты смела махалі кеглямі з вогненнымі наканечнікамі, бясстрашна глыталі агонь, а затым, як драконы, дулі гэтым полымем... Ды так відовішна, што ва ўсіх прысутных аж захоплівала дух: яшчэ з часоў Сярэднявечча людзі так і не навучыліся падпарадкоўваць сабе гэтую стыхію. Адаптавалі — так, а вось перамагчы — так і не змаглі.

А абяцанага салюта ў канцы свята так і не было. Але і сутнасць у іншым: відаць, ён усё ж адбыўся, толькі непрыкметна — унутры кожнага з нас.

Ілья ЛАПАТО.
Фота аўтара і Анатоля КЛЕШЧУКА.

За сімвалічную плату можна было адчуць сябе сапраўдным рыцарам.

Дзяўчаткі даказалі ўсім: сапраўдныя музыкі не цураюцца ніякіх інструментаў — нават дэкаратыўных дудачак.

ВА УКРАІНЕ ЁСЦЬ «БРАТ» НЯСВІЖСКАГА ЗАМКА!

Карэспандэнт «Звязды» наведаў рэзідэнцыю Радзівілаў Алыка на Валыншчыне

ГАВОРАЧЫ пра князёў Радзівілаў, мы ўяўляем найперш Нясвіжскі замак. Больш абазнаныя назавуць іншыя беларускія маёнткі роду — Паланечку, Манькавічы, Радзівілімонты, Альбу. Гэтыя палацы альбо ўжо загінулі альбо, закінутыя, знаходзяцца ў працэсе. Даследчыкі пералічаць таксама еўрапейскія ўладанні князёў — у Варшаве, Вільні, Парыжы, Ніцы, Рыме... Паглядзець гэта зможа ўжо далёка не кожны. Але часта па-за ўвагай застаецца ўкраінская вотчына Радзівілаў — найперш гэта мястэчка Алыка на Валыншчыне. Між тым, даехаць туды лёгка нават сваёй машынай (візы ж не трэба!): ад Брэста да Алыкі ўсяго 250 кіламетраў, ад Мінска — 550. Абедзьве лічбы супастаўныя з вандроўкай па Беларусі!.. Выехаўшы рана-раненька, пад ноч рэальна вярнуцца назад. Па дарозе можна пабачыць найцікавейшыя помнікі ўкраінскага дойлідства: старыя часткі Роўна альбо Луцка, замкі ў Дубне, Клевані, Крамянцы, вежу ў Астрогу...

МОКРЫЯ МАТРАЦЫ І ВЕКАВЫЯ БАСТЫЁНЫ

Прыехаўшы ў Алыку, ты адчуваеш лёгкае хваляванне. Такія грунтоўныя людзі, як Радзівілы, былі даволі паслядоўныя. Замак у Алыцы пабудаваны ў адным стылі з Нясвіжскім, нават мае такую ж самую афарбоўку. Дэкору відавочна бракуе — верагодна, ён проста не захаваўся. Але замак стаіць цалкам, са старой дахоўкай — прычым, у адрозненне ад Нясвіжскага, да нас дайшлі нават мураваныя бастыёны. Калі паглядзець на план Алыцкага замка — ён супадае з нашым: квадратны, з унутраным дварочкам, чатырма бастыёнамі, мастком...

Сёння ў Алыцкім замку Радзівілаў размешчаная Валынская псіхіятрычная лякарня № 2. У прысадах, дзе некалі шпацыравала шляхта, цяпер сохнуць матрацы з характэрнымі мокрымі плямамі. У двары цябе ветліва сустракае абарыгенка — відаць, пацыентка лякарні:

— Што, б...ць, зноўку прыпёрліся фатаграфаваць?! Калі вы ўжо, б...ць, нафатаграфуецеся?!

Ты стараешся нічога ёй не адказваць і ўвогуле не заўважаць. Гэта самы слушны спосаб паводзінаў з вар'ятамі.

Заходзіш у адчыненыя дзверы аднаго з карпусоў і разглядаеш таблічкі з надпісамі «9 аддзяленне», «8 аддзяленне». На лесвіцах — сеткі, каб вар'яты не скакалі. Далей ходу няма. Ты выходзіш і патрасаеш галавой, вяртаючыся ў думках да былых уладальнікаў палаца.

Цікава збярацца ў бастыёны, дзе захаваліся сцены таўшчынёй у некалькі метраў. Ды што «захаваліся» — паспрабуй такія зруйнуй!.. У бастыёнах шмат падземных адтулін і памяшканняў — проста рай для аматараў даўніны і таямніц. Паглядаеш на замураваную нішу ў склепе — і ўяўляеш радзівілаўскія скарбы за ёй. У найбольш захаваных падзямеллях кіраўніцтва вар'ятні трымае... бульбу для харчавання пацыентаў. А калісьці тут ляжалі гарматныя ядры для адпору ворагам...

Па-за замкам адкрываецца чароўны краявід — рэчка, лес... Радзівілы мелі тонкі густ!..

Пры самым замку захаваўся Траецкі касцёл сярэдзіны XVII стагоддзя. Ягоныя рысы падазрона нагадваюць табе нясвіжскі Касцёл Божага цела. Магчыма, прычына тут не толькі ў адным стылі — барока. І не толькі ў тым, што абодва храмы будавалі італьянскія дойліды...

Ты паглядаеш на касцёл, трымаючы ў руках старадаўняе фота 1914 года, на якім Фердынанд і Пелагея Радзівілы выходзяць з яго ў дзень свайго залатога вяселля... Ты шкадуеш, што фота не каляровае. Інакш ты мог бы голасна паабурацца разам з тагачаснымі мастацтвазнаўцамі наконт таго, што ў XIX стагоддзі мясцовыя жыхары расфарбавалі фігуры святых на фасадзе касцёла ва ўсе колеры вясёлкі. Ты паглядаеш сёння на пацьмянелыя фарбы і адно пасміхаешся.

Апошняе падабенства Алыкі і Нясвіжа дабівае цябе і пераконвае, што гэта ўсё — не супадзенні. Варта ўслухацца. У Нясвіжы ёсць СЛУЦКАЯ брама, а тут — ЛУЦКАЯ брама. Абедзьве названыя ад гарадоў, куды выводзіла дарога. І ў абедзвюх цяпер — крама!!! Праўда, у нашай Слуцкай браме хаця б сувенірная (у памяшканні колішняй капліцы), а ў Луцкай браме — брутальная харчовая, з гарэлкай і «чарнілам»...

«ЦУДОЎНЫ КАСЦЁЛ, ЗАМАК І РАТУША...»

Сёння Алыка — гэта пасёлак гарадскога тыпу Ківерцоўскага раёна Валынскай вобласці Украіны. Тут жыве, паводле звестак апошняга перапісу, 2865 чалавек. У час знаходжання ў Алыцы ты сустрэў максімум тузін тубыльцаў. Яшчэ чытаючы інфармацыю пра Алыку ў даведніках, ты адчуваў лёгкае дэжа вю: як і ў нашым Нясвіжы, усё тут нагадвае пра Радзівілаў, усё прасякнута духам гэтай вялікай Сям'і.

У найлепшых традыцыях Радзівілаў не абышлося без міфаў і загадак. Гэтым разам — адносна назвы мястэчка. Пэўнасці і адзінадушша ў гэтым пытанні ў даследчыкаў няма. Паводле адной версіі, Алыка — ад «лыка», з якога плялі лапці. Паводле іншай — ад вольхі (ва ўкраінскім варыянце). Паводле трэцяй — назва паходзіць ад цюркскага слова «aloka» — «яр». Адно вядомае дакладна: спачатку была рэчка Алыка, ад якой і назвалі паселішча.

У 1856 годзе польскі «Tygodnik ilustrowany» захоплена апісваў дарогу да Алыкі з боку Роўна: *«...цудоўны касцёл, замак і ратуша, беленькая царква, наўкол ахайныя, аточаныя садочкамі хаткі мяшчаноў, сярэбныя люстры спакойных сонных сажалак, пагоркі, а між імі пакручастыя рачулкі найпекны ствараюць від»*.

Паўтара стагоддзя таму, мажліва, так і было — Алыка квітнела, тут праходзіў гандлёвы шлях з Азіі ў Еўропу. Сёння хаткі месцічаў ужо не цешаць настолькі вока, адчуваецца пэўнае запусценне.

Але цікавіць цябе, безумоўна, не гэта, а спадчына нашых Радзівілаў, «філія» Нясвіжа.

ПЕРШАЕ КАХАННЕ МАРСЭЛЯ ПРУСТА

Радзівілы атрымалі Алыку амаль пяць стагоддзяў таму. У тую пару валадаром Алыкі быў літоўскі гетман, троккі ваявода Пятро Белы. Ягоны сын загінуў у баі, у 1500 Алыка адышла да дачкі Ганны, пасля яе раптоўнай смерці — да ўнучкі Ганны з Кішкаў, якая ў першым шлюбе пабралася з Янам Радзівілам Барадатым. З тае пары тут кіравалі Радзівілы. У 1547 годзе Ян Мікалай Чорны атрымаў ад імператара Карла V для сябе і брата спадчынны тытул «князь на Алыцы і Нясвіжы». Гэты тытул у 1549 годзе зацвердзіў кароль Жыгімонт Аўгуст.

У 1586 годзе (тады, дарэчы, Нясвіж атрымаў Магдэбургскае права) вядомы нам Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка стварыў тры ардынацыі: нясвіжскую, алыцкую і клецкую. Гэта значыць, што з таго часу маёнтак павінен быў пераходзіць ад бацькі да старэйшага сына і не мог быць падзелены альбо прададзены. У 1656 годзе, калі памёр і не пакінуў спадкаемцаў вялікі канцлер літоўскі Альбрэхт Станіслаў Радзівіл (ён, між іншым, фундаваў касцёл у Алыцы), замак перайшоў да нясвіжскага князя Міхаіла Казіміра — і ажно да XIX стагоддзя ардынацыя была «нясвіжская і алыцкая». Пакуль царскія ўлады не канфіскавалі ўсе маёнткі Дамініка Радзівіла, які перайшоў на бок французаў і стаў ад'ютантам Напалеона. Вярнуць Алыку ўдалося Антонію Радзівілу — таму самаму, які напісаў оперу «Фаўст», лібрэта для якой стварыў сам Гётэ. У час напалеонаўскай вайны ў замку зрабілі шпіталь, які быў там ажно да 1837 года.

Старыя жыхары Алыкі і сёння перакажуць вам пачутыя ад бабак і дзядоў гісторыі пра Фердынанда Радзівіла, ягонага сына Міхаіла, які ажаніўся з расіянкаю Марыяй Бернардакі, першым каханнем Марсэля Пруста, якая стала прататыпам Жыльберты ў творы «У пошуках страчанага часу».

Апошнім ардынатам Алыкі быў Януш Радзівіл, буйны палітык польскага сената, кіраўнік камісіі замежных спраў Польшчы ў 1935-39 гадах, лідар уплывовай кансерватыўнай партыі. У 1939 годзе Януша арыштавалі і кінулі ў канцлагер. Берыя прапаноўваў Радзівілу супрацоўніцтва, але арыстакрат не пагадзіўся.

Станіслаў РАДЗІВІЛ з жонкай Лі Буўе — роднай сястрой Жаклін КЕНЭДЗІ.

Сын Януша Эдмунд узяў у жонкі Ізабэлу Радзівіл — дачку Караля Радзівіла з нашых Манькавічаў (што пад Столінам). Гэта была распаўсюджаная з'ява ў магнацкіх родах — жаніцца з далёкімі сваякамі іншай лініі. У міжваенны час сужэнцы паспелі збудаваць у Алыцы маленькі завод, дзіцячы садок і лякарню. Родны брат Эдмунда Станіслаў у Амерыцы пабраўся з Каралінай Лі Буўе — роднай сястрой Жаклін Кенэдзі. Прэзідэнт Джон Кенэдзі нават быў хросным бацькам іх дачкі Ганны Крыстыны, а Станіслаў, у сваю чаргу, — хросным бацькам сына Кенэдзі...

P.S. *Ты стаіш ля старой вартоўні ў парку Алыцкага замка і паглядаеш на магутныя сцены Радзівілаўскага дома, на вытанчаны, але занядбаны касцёл. Усё захавалася тут так, як і паўтара стагоддзя таму, калі і замак, і касцёл малявaў непараўнальны Напалеон Орда. Ты нават не перажываеш асабліва, што цяпер у замку вар'ятня. Гэта, прынамсі, гарантуе, што ён будзе жыць і падтрымлівацца ў большменш належным стане. Ты нават крыху радуешся, што Украіна не знайшла пакуль 70 мільёнаў долараў на рэканструкцыю. Бо Беларусь знайшла — але неразумнае іх выкарыстанне прывяло да таго выніку, што з Нясвіжскага замка, пакуль што, лічу, зрабілі сучасны катэдж, гопнуўшы к чорту ўсе напаміны даўніны.*

Ты прыхавана хочаш, каб вар'яты на Валыншчыне не перавяліся.

Беларусу лёгка пазнаць у сённяшняй Алыцы рысы Нясвіжскага замка.

Касцёл у Алыцы, як і нясвіжскі, збудаваны італьянскімі майстрамі ў стылі барока.

Залатое вяселле Фердынанда і Пелагеі Радзівілаў (у цэнтры). Дэлегацыя з Нясвіжа — Марыя Браніцкая (злева ад Фердынанда), прабабуля пані Эльжбеты; Станіслаў Радзівіл (трэці шэраг, пяты злева), ад'ютант Пілсудскага, стрыечны дзядуля пані Эльжбеты; Дарота Радзівіл (трэці шэраг, у цэнтры), мама пані Эльжбеты; Тэрэса Радзівіл (трэці шэраг, шостая справа), цётка пані Эльжбеты; Вольга Радзівіл (верхні шэраг, у цэнтры) і справа ад яе Леон Радзівіл — дзядзька і цётка пані Эльжбеты; крайні правы ў верхнім шэрагу — Караль Радзівіл з беларускіх Манькавічаў, дзядзька пані Эльжбеты. 1914 год.

КАМЕНТАР РАДЗІВІЛАЎ

«Паміж Нясвіжам і Алыкай было даўняе супрацьстаянне...»

Распавесці крыху пра Алыку я папрасіў 91-гадовую князёўну Эльжбету Радзівіл, якая зараз жыве ў Варшаве, а гэтым летам двойчы наведвала родны Нясвіж.

— Я ні разу не была ў Алыцы... — распаўляла «Звяздзе» па тэлефоне пані Эльжбета. — Гэта звязана з тым, што адносіны між дзвюма ардынацыямі былі напружанымі. Так павялося, што галаву сям'і выбіралі ў Нясвіжы. Напрыклад, мой бацька Альбрэхт быў галавой сям'і. А алыцкія Радзівілы, у прыватнасці Януш, зайздросцілі, ім таксама хацелася!.. Бацька толькі мудра пасміхаўся на гэта ў свае геніяльныя вусы і казаў: «А, мне ўсё адно! Хай кажа, што ён галава сям'і! Але генеалагічна і юрыдычна — гэта я».

Супрацьстаянне сягае яшчэ ў XIX стагоддзе. Апошнім супольным ардынатам быў мой прапрапрадзядуля Антоні. Ягоныя сыны — Вільгельм і Багуслаў падзялілі ардынацыю на Нясвіжска-Клецкую і Алыцкую, першы атрымаў першае, другі — другое. І ад Вільгельма далей галава сям'і быў заўсёды з Нясвіжа.

Аднак супрацьстаянне заціхала, калі прыходзіў нейкі юбілей ці вяселле — тады ўся сям'я збіралася разам — ці ў Нясвіжы, ці ў Алыцы. Тады ўсе згадвалі, што незалежна ад рэзідэнцыі, мы, Радзівілы — адзіная Сям'я!

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара і з прыватнага архіва сям'і Радзівіл.

Алыка—Мінск.

ЛЕГЕНДЫ ЗУСІМ БЛІЗКА АД НАС!

Рэальныя гістарычныя падзеі лёгка пераплятаюцца з легендамі. Асабліва калі казаць пра тое, што адбылося сотні гадоў таму. І як правесці мяжу паміж праўдай і выдумкай? А можа, яна зусім непатрэбная? Легенды — гэта не навуковыя факты, легенды — гэта яскравае праяўленне адметнай культуры людзей, якія жылі ў свой час на сваёй зямлі.

Ісціна дзесьці побач

Заходзячы ў кніжныя крамы, заўсёды звяртаю ўвагу на паліцы з паштоўкамі. Часта даводзіцца канстатаваць сумны факт — выбар у нас не вельмі багаты. Нацыянальная бібліятэка, касцёл святых Сымона і Алены, праваслаўны Кафедральны сабор, Цэнтральны чыгуначны вакзал — гэта амаль усё, што можна пабачыць. Часам з'яўляецца нешта неардынарнае, але гэта адзінкавыя выпадкі. А так хочацца чагосьці незвычайнага...

Праўду кажуць: калі нечага вельмі-вельмі хочаш, то яно абавязкова спраўдзіцца? У газетным шапіку натыкнуўся на нешта новае. Увагу прыцягвала як нестандартнае каляровае афармленне камплекта паштовак, так і назва — «Легенды старога Мінска», выдадзены кампаніяй «Артыя Груп». Проста сысці я, безумоўна, не мог. Нібы нейкая таямніца, яны прыцягвалі да сябе. Напэўна, інакш і не можа быць, калі гаворка ідзе пра гісторыю горада, старэйшага за Маскву і Варшаву, Вільню і Берлін. Горада, які дзясяткі разоў быў зруйнаваны бясконцымі войнамі. У такога месца проста не можа не быць цікавых, нават містычных гісторый.

І паштоўкі толькі пацвердзілі гэтыя думкі. Прычым яны самі па сабе незвычайныя: з аднаго боку, выява, апрацаваная пад стары фотаздымак, з іншага — легенда, звязаная з гэтай мясцінай. Яны падарылі мне не толькі эстэтычнае задавальненне, але і старажытныя паданні, чуць пра якія раней не даводзілася. А вы шмат ведаеце пра Мінск? Давайце праверым!

Прывід у цемры лістападаўскай ночы

Кажуць, позняй восенню, у канцы XIX стагоддзя, хавалі ў Мінску маладую прыгожую паненку. Сваякі паклалі яе ў труну, адпелі і пахавалі ў склепе на Кальварыйскіх могілках. Але як выявілася, дзяўчына проста заснула ў летаргічным сне. Прачнуўшыся ўжо ў труне, яна не здолела выбрацца і памерла ў пакутах. З таго часу яе прывід пачаў з'яўляцца на могілках у цёмныя ночы лістапада. Многія з тых, хто праходзіць ноччу каля могілак, кажуць, што тут блукае белая здань.

Дарэчы, пачатак Кальварыйскім могілкам даў Кальварыйскі касцёл, пабудаваны ў 1745 годзе на жмені зямлі, прывезенай з месца распяцця Хрыста — Галгофы (Кальварыі — на лацінскай мове). Ёсць гістарычныя сведчанні, што тут пахаваныя Радзівілы і Панятоўскія. Пазней тут хавалі салдатаў напалеонаўскай арміі, палонных аўстрыйцаў часоў Першай сусветнай вайны, ахвяраў бальшавіцкага тэрору, тры тысячы яўрэяў з мінскага гета падчас Вялікай Айчыннай вайны...

Прарочы сон ратуе ад халеры

У 1631 годзе Мінск не абмінула эпідэмія халеры. Адзін мінчанін убачыў прарочы сон: горад ад поўнага вымірання выратуе статуя Святога Роха, захаваная пад руінамі Касцёла баніфатараў (міласэрных братоў). Даведаўшыся пра гэта, гараджане неадкладна пачалі шукаць статую, і праз некаторы час яна была знойдзена. Статую ўрачыста пранеслі па горадзе і ўстанавілі ў драўлянай капліцы на Залатой Горцы. Пасля гэтага эпідэмія пайшла на спад, а потым і зусім спынілася.

Касцёл Святога Роха быў пабудаваны ў 1861—64 гадах. Асноўнымі славутасцямі храма з'яўляюцца старажытная ікона Багародзіцы з Ісусам, а таксама цудадзейная статуя Святога Роха.

Прагнасць да Камароўскага балота давядзе

У XV стагоддзі на ўскраіне Мінска стаяў манастырскі сабор. Прасіў міласціну на яго паперці юродзівы Федзька Камар. Аднойчы ў саборы пад каменнай плітою знайшоў стары манах золата. Убачыў гэта Федзька Камар, які начаваў у храме, і пачаў дакучаць манаху: «Дай палову!» Спужаўся манах, што Федзька ўсё настаяцелю раскажа, і згадзіўся аддаць таму палову золата. Пайшлі яны ў лес, за Троіцкую гару, золата хаваць. Асляпіла іх золата, пабіліся яны паміж сабою і патанулі ў балоце.

З таго часу пачалі называць гэта балота Камароўскім. Потым узнікла на яго месцы вёска Камароўка, якая да 1812 года належала князям Радзівілам. Пазней вёска ўвайшла ў межы горада. У 1911 годзе тут была адкрыта Балотная станцыя — адзін з цэнтраў вывучэння і практычнага выкарыстання балотаў Расіі. На пачатку XX стагоддзя Камароўка лічылася адной з самых заняпалых працоўных ускраін, якую насяляла рамесная беднота. На палігоне, які знаходзіўся на месцы сучаснага рынку, 24 і 25 мая 1911 года выконваў палёты на аэраплане славуты расійскі авіятар Сяргей Ісаевіч Утачкін. Убачыць гэты цуд тады сабраўся ўвесь горад.

У 20-я гады XX стагоддзя балота асушылі. Камароўскую плошчу, якая знаходзілася на месцы легендарнай вёскі, у 1956 годзе перайменавалі ў плошчу Якуба Коласа. А ў 1972 годзе ў цэнтры плошчы ўзвялі помнік народнаму паэту. У 1979 годзе адчынілі цэнтральны калгасны рынак — самы вялікі ў нашай краіне...



Маленькая парада на заканчэнне

Вас закранулі гэтыя легенды, якія прайшлі праз дзясяткі пакаленняў? Спадзяюся, што так. Тады вы яшчэ паспееце набыць «Легенды старога Мінска» і даведацца пра астатнія містычныя і рамантычныя гісторыі. Толькі трэба паспяшацца, тыраж не вельмі вялікі! Не ўспрымайце гэтыя словы як рэкламу. Хутчэй — гэта шчырая парада. Яно сапраўды таго варта!

Яўген ВАРАКСА.

У матэрыяле выкарыстаны выявы паштовак з камплекта «Легенды старога Мінска».

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-6

Працягваем гэты класіфікацыйны конкурс заданнем № 7 — камбінацыйнай праблемай:

Белыя: a1, d2, e1, e3, f2, g3, g5 (7). **Чорныя:** a3, b6, e5, f4, h2, h6 (6). Выйгрыш.

Заданне праверана на супадзенне і дакладнасць рашэння нашым кансультантам з Літвы Антанасам Гімбутасам — па электроннай пошце.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

ДАМАЧНЫЯ КАНЦОЎКІ

Наш актыўны аўтар Леанід Вітошкін прапануе для прыхільнікаў шашак-100 бліц-50/6:



Белыя: 21, 22, 33, 34, 43, 47, дамка 27 (7). **Чорныя:** 8, 9, 10, 11, 16, 20, 37, дамка 28 (8). Перамога белых.

Па-за конкурсам развяжыце і такую яго дамачную канцоўку:



Белыя: 12, 17, 22, 25, 33, 34, 39, дамка 45 (8). **Чорныя:** 6, 16, 28, 35, 37, дамкі 26, 30 (7). Перавага белых.

Таксама будзем рады вашым рашэнням.

РАЗБЯРЫЦЕ КАНСТРУКЦЫЮ

Мікалай Вяргейчык, як і педагог Л. Вітошкін, жыве ў Гомелі, працуе апаратчыкам на хімзаводзе. Іх аб'ядноўвае шашачная кампазіцыя. Выносім на ваш суд творы на 64-клетачнай дошцы, дасланыя ім у рэдакцыю:

№ 1. **Белыя:** a1, b6, c7, d6, e1, f2, f4 (7). **Чорныя:** a5, b2, c3, d8, h2, h4, h6 (7).

e7, e5, g3 (f2A) g3, d8, d8:d2:g5, g3x. A(f4) d8, d8:d2:g5 (f6B) g7, d2/f2x. B(f4) g3, g3x.

№ 2. **Белыя:** b6, c1, c5, d4, d6, e3, g7 (7). **Чорныя:** a7, b8, d2, d8, f4, g3, g5 (7).

dc7, c5, f8, d4, d8:f2:e7, e7x.



№ 3. **Белыя:** b6, c5, d4, e5, g5, h4, h6 (7). **Чорныя:** a7, d2, e7, f2, f6, g3, h8 (7). Аматары вострых пачуццяў застануцца задаволенымі, калі самастойна разбяруць гэтую канструкцыю 7 на 7.

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў:

«Пагода ў доме»-6/5 (М. Грушэўскі): 1. ab2 2. gh6 3. h:f8 4. e:g7 h:f6 5. fg7! 6. h:f6x

Бліц-50/4 (М. Грушэўскі): 14, 20, 8, 4, 6, 50x.

«Рашаем, удакладняем»(А. Кацоцька): № 2 — 1. cd8 a:c7A 2. d:a5 3. a:c7 4. c:a1x. A1...h:f2 2. de7 3. ed6 4. d:a1x.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания продаваемого недвижимого имущества

Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	Лот № 1
	Капитальное строение инв. № 450/С-1714, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Слоним, ул. Гнидаша, д. 3, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 425450100001006857 площадью 0,1339 га сроком на 50 лет
Начальная цена предмета аукциона – 244 298 896 руб., сумма задатка - 24 429 000 руб.	
Продавец недвижимого имущества: Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, контактные телефоны: (8 0152) 41 78 96	
Характеристика объектов недвижимого имущества: производственный корпус с двумя пристройками 1949 г. площадью 684,1 кв. м, фундамент бутобетонный, перекрытия деревянные, стены и перегородки кирпичные, кровля шиферная, полы бетонные; **асфальтовое покрытие** 2000 г. площадью 253 кв. м; **водопроводная сеть** 1949 г. протяженностью 42,5 п. м	
Условия использования недвижимого имущества: вовлечение в хозяйственный оборот в течение 2-х лет с момента регистрации перехода права собственности на объекты	
Условия использования земельного участка, ограничения по использованию: получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; осуществление строительства объектов в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок	
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гродноблимущество»), 230023, г. Гродно, ул.17 Сентября, 39, тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней)	

1. Аукцион состоится **9 ноября 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона **по 5 ноября 2009 года** до 16.00, по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, **кабинет 6.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549;

- юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

- иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

- представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия. Представителям юридических лиц просьба иметь при себе учредительные документы.

4. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения; имеет право снять предмет аукциона с аукциона в любое время до объявления его проданным.

6. Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся, если:

- заявление на участие в нем по конкретному предмету аукциона подано менее чем двумя участниками;

- ни один из его участников после трехкратного объявления первой цены не поднял аукционный номер;

- ни один из его участников в соответствии с решением комиссии по проведению аукциона не был признан победителем.

7. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику (далее – претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

8. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на него, а затем в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

9. Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

10. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

11. Оплата стоимости приобретенного предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством порядке: победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся резидентом Республики Беларусь, в рублях; победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся нерезидентом Республики Беларусь, в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа. Срок оплаты недвижимого имущества – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

12. В случае невыполнения условий продажи объекта приобретателем имущества договор купли-продажи расторгается в одностороннем порядке без компенсации затрат.

Аэробус А320 авіякампаніі «Аэрафлот» гатовы да вылету ў Маскву

Самалёт Аэробус А320 расійскай авіякампаніі «Аэрафлот», які зрабіў аварыйную пасадку ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск» 4 кастрычніка, гатовы да вылету. Пра гэта паведаміў кіраўнік прадстаўніцтва «Аэрафлота» ў Мінску Аляксандр СУШКО.

«Пасажыры рэйса «Прага — Масква» адпраўлены ў Маскву на рэзервовым самалёце. Што датычыцца аэробуса А320, то ён гатовы да вылету, мы чакаем дазволу авіяцыйных уладаў», — сказаў Аляксандр Сушко.

Нагадаем, самалёт А320 расійскай кампаніі «Аэрафлот», які ляцеў па маршруце Прага — Масква, 4 кастрычніка ў 15.53 зрабіў аварыйную пасадку ў Мінску. Паводле даных «Аэрафлота», на борце знаходзіліся 120 пасажыраў і шэсць членаў экіпажа. Прычына вымушанай пасадкі — няправільна спрацавала сігналізацыя аб адчыненні дзвярэй. Як паведамілі ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск», пасадка прайшла паспяхова і пацярпелых у выніку інцыдэнту няма.

БЕЛТА.

Супрацьпухлінныя парады

Інфарм-укол

ХАРЧАВАННЕ

1. Імкніцеся істотна абмежаваць ужыванне вэнджанага, смажанага, марынадаў, кансерваў, саленняў.

2. Ніколі не ўжывайце прадукты з цвіллю.

3. Для пітця і гатавання страў выкарыстоўвайце ваду, ачышчаную з дапамогай побытавых фільтраў.

4. Прадукты лепш ужываць варанымі або тушанымі.

5. Ежа і піццё не павінны быць гарачымі.

6. Колькасць алкаголю, ужытага за адзін прыём у дзень, не павінна перавышаць чарку гаролкі, або шклянку сухога віна, або бутэльку піва.

7. Вытрымлівайце закон памяркоўнасці: колькасць энергіі, якая паступае з ежай, павінна адпавядаць колькасці той, што вы расходуеце.

8. Павялічце колькасць прадуктаў, якія валодаюць супрацьпухлінным, антыканцэрагенным дзеяннем: жоўта-зялёная, аранжавая гародніна і садавіна, цытрусавыя, крыжакветная гародніна, ягады, цыбуля, часнок, бабовыя, чай, сухафрукты, малочныя прадукты, морапрадукты.

9. Штодня ў рацыёне павінны быць харчовыя валокны з цэльных зярнят або вотруб'я злакавых.

ФІЗІЧНАЯ НАГРУЗКА

Рэгулярныя заняткі спортам, нават элементарная штодзённая зарадка, дапаможа захаваць здароўе. Не думайце, што такая нагрузка патрэбна толькі для прыгажосці, маўляў, «мяне і такую любяць». Паніжаная фізічная актыўнасць спрыяе парушэнню работы сасудаў, эластычнасці мышц, з'яўленню лішняй вагі, а гэта — прамы шлях да развіцця не толькі сардэчна-сасудзістых, але і анкалагічных хваробаў.

ПСІХАЛОГІЯ

Шукайце плюсы нават у негатыўных сітуацыях. Не расцэньвайце выпадковую непрыемнасць як жыццёвую катастрофу. Любіце сябе і сваё цела. Паўнацэнны адпачынак (а не на адно вока), змена дзейнасці, прыемныя фізічныя нагрузкі, любімыя заняткі дапамогуць спраўляцца са стрэсамі.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

«УЯЎЛЯЕ АСАБЛІВУЮ НЕБЯСПЕКУ...»

Вярхоўны суд разгледзеў касацыйную скаргу па справе Васіля Юзэпчука, якога 29 чэрвеня Брэсцкі абласны суд прыгаварыў да расстрэлу за забойствы 6 адзінокіх пенсіянерак у Драгічынскім раёне.

Як выявіла следства, дзвюх жанчын Юзэпчук забіў сам, а чатырох адправіў на той свет разам з 28-гадовым братам сваёй грамадзянскай жонкі Сяргеем Гучэнкам (апошняга суд прыгаварыў да пажыццёвага зняволення з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі спецыяльнага рэжыму). Абодва родам з Украіны, пражывалі на тэрыторыі Драгічынскага раёна. Абодва не мелі пастаяннага месца працы. На рахунку Юзэпчука, акрамя таго, два рэальныя тэрміны ў месцах пазбаўлення волі.

«Я не забіваў», «Я не вінаваты», «Я не змог бы гэтага зрабіць» — падобныя фразы гучалі з вуснаў 30-гадовага Васіля Юзэпчука ў зале Вярхоўнага суда неаднаразова.

— А чаму вы прызналі падчас папярэдняга расследавання сваю віну?

— Мяне прымусілі гэта зрабіць драгічынскія міліцыянеры. Хацелі за мой кошт павысіцца ў званні. Я іх памятаю візуальна, але прозвішчаў не ведаю. Яны гвалтоўна прымушалі даваць паказанні супраць самога сябе. Збівалі мяне, давалі таблеткі. Білі са словамі, «рабі тое, што будзем табе казаць». Я не адмаўляю, што ведаў гэтых бабак. Я ім дапамагаў з дровамі, бульбай. І Гучэнка іх таксама ведаў. Ён у іх таксама працаваў. Усе людзі з вёсак ведалі, што мы працавалі ў іх. Пра смерць бабуляў я даведаўся ад суседкі па тэлефоне. Я не мог гэтага зрабіць, таму што ў той момант мяне там не было, знаходзіўся на тэрыторыі іншай вобласці. Я ім дапамагаў, але не забіваў. Я не вінаваты. Асабіста я ніколі не краў там, дзе працаваў. Маю невінаватасць могуць пацвердзіць сведкі, якіх Брэсцкі абласны суд не выклікаў. У прыватнасці, мая маці.

Адвакаты Юзэпчука таксама прасілі апраўдаць свайго падабароннага і прыпыніць у дачыненні да яго крымінальную справу. Яны адзначылі, што прыгавор вынесены на аснове паказанняў асуджанага, якога прымусілі нагаварыць на самога сябе. Гучэнка ж з прычыны непрыязнага стаўлення абгаварыў свайго сваяка. Усе астатнія доказы пабудаваны на аснове дапушчэнняў. «Мы жывём у XXI стагоддзі, і галоўнай мэтай крымінальнага пакарання з'яўляецца не кара за здзейсненае злачынства. Мэта яго, перш за ўсё, выпраўленне чалавека, — звярнуўся да Вярхоўнага суда адвакат. — Асуджаны непісьменны чалавек, без пастаяннага месца жыхарства, не мае працы. Больш за тое, эксперты прызналі Юзэпчука разумова адсталым, таму ён не можа ў поўнай ступені правільна ўспрымаць навакольны свет. Яму не патрэбна прымусовае лячэнне, бо ён знаходзіцца ў стане свядомасці, аднак разумовая адсталасць уздзейнічае на яго ацэнку сваіх учынкаў. Мы просім аб змякчэнні пакарання, бо смяротнае пакаранне — незваротнае. І калі праз месяц ці два будзе выяўлена, што крадзяжы медалёў і інш. у пацярпелых здзейсніла іншая асоба, то рэабілітаваць Юзэпчука ўжо не будзе магчымасці».

Дзяржаўны абвінаваўца, у сваю чаргу, папрасіў калегію Вярхоўнага суда пакінуць прыгавор без змянення. Віна Юзэпчука, паводле яго слоў, цалкам даказана, суд Брэсцкай вобласці разглядзеў усе аспекты яго справы, і парушэнняў крымінальна-працэсуальнага заканадаўства не выяўлена.

— Пасля экспертызаў трупаў пацярпелых жанчын медыкі вызначылі адну і тую ж прычыну іх смерці — механічная асфіксія (удушэнне), — адзначыў дзяржаўны абвінаваўца. — Судова-медыцынскія экспертызы аб'ектыўна пацвердзілі паказанні злачынцаў аб спосабе забойства пацярпелых. Падчас папярэдняга расследавання Юзэпчук і Гучэнка самі расклалі ўсё па палічках: падрабязна расказалі аб тым, як душылі сваіх ахвяраў. У дамы пенсіянерак пранікалі ноччу. Юзэпчук душыў, а напарнік утрымліваў, не даючы супраціўляцца. Суд палічыў іх віну даказанай. Усе забойствы былі здзейснены з мэтай завалодаць грашыма пажылых жанчын. Довады ж, што супрацоўнікі міліцыі збівалі Юзэпчука, паілі гарэлкай, давалі таблеткі, марылі голадам былі прадметам праверкі органаў пракуратуры. Яны не пацвердзіныя. Таму я лічу, што трэба прысуд пакінуць без змянення. Гэты варвар (па-іншаму яго нельга назваць), які здзейсніў забойствы 6 жанчын, пяцярым з якіх было больш за 70 гадоў, і ўчыніў разбой на тэрыторыі Гродзенскай вобласці, уяўляе асаблівую небяспеку для грамадства, таму і пакаранне суд прызначыў адпаведнае. Забойцы павінны панесці заслужанае пакаранне па ўсёй строгасці закону.

Суддзі выслухалі абвінавачванага, яго двух абаронцаў і дзяржаўнага абвінаваўцу — і праз паўтары гадзіны вынеслі свой вердыкт: «Прыгавор пакінуты без змяненняў». Дарэчы, да расстрэлу сёлета прысудзілі не аднаго Васіля Юзэпчука. Нагадаю, што другі смяротны прысуд быў вынесены Мінскім абласным судом 17 ліпеня. Да найвышэйшай меры пакарання прыгаварылі 25-гадовага жыхара Салігорска Андрэя Жука за забойства ў лютым двух супрацоўнікаў СВК «Бальшавік-Агра», якія перавозілі грошы для выплаты зарплаты работнікам сельгаспрадпрыемства.

Надзея ДРЫЛА.

Смяротны прыгавор Васілю ЮЗЭПЧУКУ Вярхоўны суд пакінуў у сіле.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Рэзананс

Пасмейваемся мы? Пасмяюцца і з нас

...Досыць часта сустракаю на старонках «Звязды» артыкулы, тэмы, якія мяне, чытача, як кажуць, чапляюць за «жывое», падбіваюць выказацца.

Апошнім часам з цікавасцю чытаў артыкулы спадароў Валошына і Лабадзенкі пра іх вандроўкі па Еўропе. Асобны дзякуй за аповед пра Скарынаўскія мясціны ў Празе. Я таксама там жыў, таксама блукаў па вулачках! Цудоўна памятаю свае ўражанні, свае пачуцці, калі знайшоў і сам помнік слыннаму земляку, і шыльду на доме...

Гэтаксама ў памяці і маё жаданне абавязкова, ды што там — проста зараз жа, тэрмінова расказаць іншым, дзе гэта знаходзіцца... Таму ўвесь шлях, па якім да гэтых месцаў можна трапіць, я сфатаграфаваў, адзначыў на карце.

І тут узнікла пытанне: як гэту інфармацыю данесці да іншых? Правільна, праз інтэрнэт. Але ж я не праграміст і стварыць свае сайты не ўмею (тым больш, што за іх і грошы трэба плаціць)...

Вось у такой сітуацыі могуць дапамагчы сацыяльныя сеткі («Звязда» таксама пра іх пісала). Яны бясплатныя і даступныя — пры жаданні любы чалавек можа, напрыклад, зайсці на маю старонку і ўбачыць, як у Празе адшукаць помнік Скарыне.

Чаму ён для мяне такі важны? Я па адукацыі гісторык і даўно заўважыў, што іншыя дзяржавы будуюць свой, так бы мовіць, імідж на імёнах слынных землякоў, як могуць, кажучы сучаснай мовай, «раскручваюць» іх. У Чэхіі, як заўважылі журналісты «Звязды», гэта Кафка і іншыя. У нас — Францыск Скарына...

Вялікі дзякуй газеце і за артыкул пра выдатнага дзеяча беларускай гісторыі, гетмана ВКЛ Канстанціна Астрожскага. Калі пашукаць, каго са слынных палкаводцаў можна паставіць з ім побач, прыйдзе на памяць хіба Аляксандр Македонскі. Але ж ён пры гэтым знаны ва ўсім свеце, а Астрожскага не ведаюць нават у Беларусі. Прынамсі, 8 верасня я спытаўся ў вучняў, што гэта за дзень у нашай гісторыі і што за чалавек Астрожскі. Дзеці здзіўлена паціснулі плячыма.

Вось так. Гісторыі сваёй не ведаем, роднай мовы таксама...

Мы ўжо звыкліся з думкай, што яна, беларуская, знікла ў гарадах, але ж (у мяне асабіста) заставаліся яшчэ надзеі на вёску. Марна, спадарства! Не так даўно я ўладкаваўся працаваць па спецыяльнасці — настаўнікам гісторыі. І...

Уявіце сабе: школа — вясковая, беларускамоўная. Думаў — во як пашчасціла, трапіў у сапраўдны асяродак беларускасці! Не і яшчэ раз не! Роднай мовай дзеці не валодаюць. Пачаў выкладаць гісторыю, як і патрабуе праграма — па-беларуску, ужываючы лексіку з падручнікаў, а вучні ў большасці глядзяць на мяне круглымі вачамі, не разумеюць.

Патраціў колькі часу, многае патлумачыў — з разуменнем стала лягчэй, але ж размаўляць на роднай мове, адказваць на пытанні вучням усё адно цяжка, яны ўвесь час збіваюцца на другую дзяржаўную, больш за тое, час ад часу просяць мяне, каб і я гаварыў з імі па-руску, бо ім, маўляў, цяжка ўспрымаць беларускую...

Яшчэ раз падкрэслю, што гэта — вясковая і беларускамоўная школа і што ад мовы адмаўляюцца не сталыя, не старыя людзі, а дзеці — наша будучыня, наш заўтрашні дзень.

Думаю, гэта самым красамоўным чынам паказвае, у якім катастрафічным стане знаходзіцца наша мова.

Зрэшты, ці трэба здзіўляцца таму, што дзеці не разумеюць яе (не любяць, не ведаюць), калі апроч школы яе нідзе не чуваць і не відаць? Тэлебачанне амаль цалкам на рускай, друк — таксама, на ёй жа ўсе шыльды на вуліцах, уся дакументацыя і інш.

У чым выйсце? На маю думку, у тым, каб пераводзіць усё што маглыма на сваю, на першую дзяржаўную, каб яна (на ўзроўні падсвядомасці) уваходзіла ў светаадчуванне беларусаў з самага іх маленства. І рабіць гэта трэба на дзяржаўным узроўні, сёння.

...Не раз чуў, як людзі тутэйшыя пасмейваюцца: украінцы, маўляў, «зусім таго» — на сваю мову перакладаюць розныя мастацкія фільмы. Але, спадарства, ці не здарыцца так, што ў хуткім часе ўкраінцы будуць пасмейвацца з нас. Асабліва калі мы страцім сваю мову, страцім найпершую адметнасць нацыі.

Вадзім ШЫШКО.

РУП «ГОМЕЛЬСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

➢ **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)**
➢ **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

извещает о проведении 3 ноября 2009 г. открытого аукциона по продаже объектов недвижимости, расположенных по адресу: Гомельская область, Гомельский район, Бобовичский сельсовет, севернее деревни Осовцы (карьер «Осовцы») и принадлежащих ОАО «Гомельстройматериалы» на праве собственности

№ лота	Наименование объектов	Краткая характеристика объектов
1	**Ремонтная мастерская**	Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (инв. № 310/С-33356). Отдельно стоящее одноэтажное здание. Общая площадь: 214,1 кв.м. Фундамент: железобетонный. Наружные, внутренние капитальные стены: железобетонные панели, кирпичные. Перегородки: нет. Перекрытия чердачные: ж/бетонные плиты, ребристые. Перекрытия междуэтажные: нет. Крыша: совмещенная. Полы: гравийно-песчаная смесь. Проемы оконные: сплошное деревянное остекление. Ворота: металлические. Наружная отделка: цоколя – оштукатурен; стен – нет. Внутренняя отделка – известковая побелка. Отопление: нет. Электроснабжение: открытая проводка. Вентиляция: естественная.
	Бытовые помещения с материальным складом	Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз МТС, хранилищ (инв. № 310/С-33354). Отдельно стоящее одноэтажное здание с крыльцом, воротами, забором и калиткой. Общая площадь: 91,4 кв.м. Фундамент: железобетонный. Наружные, внутренние капитальные стены: железобетонные блоки, кирпичные. Перегородки: кирпичные. Перекрытия чердачные: железобетонные плиты. Крыша: совмещенная. Полы: линолеум, бетон. Проемы оконные: деревянные двойные. Ворота: щитовые. Наружная отделка цоколя – оштукатурен. Внутренняя отделка: штукатурка, побелка, окраска. Отопление: частичное – электротэн. Электроснабжение: открытая, скрытая проводка. Вентиляция: естественная.
	Низковольтные сети до 0,4 кВт	Назначение: сооружение специализированное энергетики (инв. № 310/С-33353). Кабельная с источником питания КТПН-160/6. Рабочее напряжение 0,4 кВ. Протяженность 58 м. Способ прокладки: подземный.
	Кран-балка	Кран подвесной электрический однобалочный общего назначения. Грузоподъемность – 3,2 т. Максимальная высота подъема – 18 м. Длина крана – 10,2 м. Пролет крана – 6 м. Частота вращения электродвигателя – 1360 об/мин.
	Земельный участок: площадью 1,5429 га с кадастровым номером 321082000002000021. Решение о выделении Гомельского РИК №1030 от 07.12.2004 г.	

Начальная цена продажи лота – 132 497 480 бел. руб. (в т.ч. НДС 18 %). Задаток – 13 249 748 бел. руб. (в т.ч. НДС 18 %).
Цель использования объектов не ограничивается. Шаг аукциона – 7 %.

Аукцион состоится 3 ноября 2009 г. Начало в 10.00 по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 2-6

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00 **по 30 октября 2009 г.** включительно. Подача документов по почте не допускается.

Условия продажи лотов: в аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица.

При подаче заявления участник должен иметь: 1) заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; индивидуальный предприниматель – паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона; представитель индивидуального предпринимателя – паспорт и доверенность; представитель юридического лица (резидент РБ) – паспорт (руководитель – копию приказа, протокола о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидент РБ) – легализованные в установленном порядке

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Крымінал, здарэнні

СПАЛІЎ ШТАНЫ, АЛЕ ЖЫЦЬ БУДЗЕ

З тэрмічнымі апёкамі абедзвюх ног 2 ступені ў Ельскую раённую бальніцу дастаўлены 12-гадовы хлопчык. Яны з сябрам-аднагодкам вырашылі развесці невялікае вогнішча з паперы, якая была мокрай і гарэць ніяк не хацела. Каб працэс запальвання паскорыць, дасталі з багажніка бацькоўскай машыны, што стаяла недалёка, пластыкавую пяцілітровую каністру з бензінам. Полымя імгненна ахапіла не толькі паперу, але і каністру, а потым бензін трапіў на сінтэтычныя штаны аднаго з юных экстрэмалаў. Жыць ён будзе, але ў бальніцы правядзе нямала часу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ГАСТРАЛЁР З БРЭСТА

У Кобрыне 4 кастрычніка былі абрабаваны тры іншамаркі. Злодзей падбіраў ключы і выкрадаў з аўтамашын магнітолы. Кобрынскія міліцыянеры сумесна з супрацоўнікамі ДАІ Брэсцкага РАУС вызначылі, што рабаўніком з'яўляецца 35-гадовы жыхар Брэста.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (3 кастрычніка). Па гарызанталі: Кабачок. Патысон. Навала. Мандат. Лагер. Рык. Розга. Арыя. Жалейка. Сыр. Саржа. Пляж. Скат. Спектр. Гара. Рот. Ізатоп. Ястык. Мэта. Цар. Рака. Фанфара. Вена. Сюжэт. Рэпа. Сон. Ват. Крэмень. **Па вертыкалі:** Баклажан. Кільватар. Голас. Гам. Кватэра. Рэйка. Рота. Чан. Трапак. Адрас. Алюр. Кавун. Жэст. Дазор. Дэпо. Полка. Танк. Траса. Ява. Спіс. Карп. Лакрыца. Дыня. Токар. Жарт. Рашпіль.

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 20 (620)
АДДЗЕЛ РЭКЛАМЫ ☎ 287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Прадаецца

❒ Дом, які патрабуе рамонту, у в. Ціўнавічы Іўеўскага раёна з прысядзібным участкам 20 сотак. Тэл. 8 017 257 63 64, 8 029 389 56 95.

❒ Зруб новы 5х5 у камплекце ўся кроквенная сістэма, цана па дамоўленасці. Тэл. 8 01772 53 926, МТС 550 39 28.

❒ Дом з усімі выгодамі ў райцэнтры Лельчыцы. Тэл. 8 02356 50 157, 8 029 669 76 18.

❒ Кватэра 3-пакаёвая з усімі выгодамі ў Скідалі (28 км ад Гродна), г/пабудовы, 10 сотак зямлі. Тэл. 8 029 658 77 23.

❒ Кватэра 3-пакаёвая ў г. Ашмяны. Тэл. 8 029 118 63 04.

❒ Нісан Прімера 1993 г.в., 1.6 б, чырвоны. У добрым стане. Тэл. МТС 752 01 49.

❒ Рухавік з «Масквіча-412», задні мост, КПП, 4 колы з новай гумай. Тэл. 8 029 556 17 93.

❒ МАЗ-5335 бартавы, 1995 г.в., кузаў металічны, добры тэхнічны стан, цана па дамоўленасці. Тэл. 8 029 964 27 59.

❒ МТЗ-80. Тэл. 8 01596 29 044.

❒ «Форд-сіера» 1991 г.в., седан, чорны, цана па дамоўленасці. Тэл. 8 029 288 56 65, 855 57 73.

❒ Козлік дзесяцімесячны. Раздаём цудоўных кацянят. Тэл. 8 01776 60 023.

❒ Прадам у добрыя рукі разумную, прыгожую рабочую кабылку. Цана па дамоўленасці. Тэл. 8 01797 31 548, 8 029 127 83 45.

❒ «Рэно-Меган-класік» 1997 г.в., 1,9 Д, камплект зімовай гумы, добры стан. Тэл. 8 029 769 23 65.

❒ Карова высокаўдойнай пароды, маладая (Дзяржынскі р-н). Тэл. 8 029 854 24 09.

Куплю

❒ Трактар Т-25. Тэл. 8 029 504 48 58.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:

220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

ПАСІЎНА КУРЫШ — АКТЫЎНА ХВАРЭЭШ

Кінуць курыць

Жанчыны, чые партнёры па шлюбе курацъ, маюць павышаную рызыку развіцця раку лёгкіх. Замежныя даследчыкі паказалі, што каля 40 працэнтаў жанчын, якія не курацъ і маюць дыягназ — рак, маглі не захварэць, калі б іх хатнія не курылі. Рызыка развіцця раку лёгкага ў жонак, чые мужы курылі, павялічваецца ў сярэднім у 2 разы, прычым чым больш цыгарэт дазваляе сабе выкурыць мужчына, тым гэта рызыка вышэйшая.

— Нямала фактаў сведчыць аб цеснай сувязі паміж ростам колькасці курцоў і частатой анкалагічных, сардэчна-сасудзістых і іншых захворванняў, — тлумачыць **навуковы супрацоўнік аддзела эпідэміялогіі раку Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава Галіна БЫЧКОВА**. — Курэнне тытуню звязваюць з развіццём шэрагу формаў раку. У першую чаргу гэта рак лёгкага, стрававода, гартані, ротавай поласці, мачавога пузыра, малочнай залозы, падстраўнікавай залозы, крыху радзей сустракаюцца рак ныркі, страўніка, шыйкі маткі, поласці носа...

Паводле даследаванняў, праведзеных у ЗША, Еўропе і Японіі, да 90 працэнтаў выпадку раку лёгкага ў мужчын і да 86 працэнтаў у жанчын звязаны з курэннем цыгарэт. За апошнія дваццаць гадоў у Швецыі быў адзначаны рост курэння сярод жанчын і адначасова — зніжэнне распаўсюджвання шкоднай звычкі сярод мужчын. Адпаведна смяротнасць ад раку лёгкага сярод жанчын істотна выросла, а сярод мужчын — знізілася.

У Беларусі летась было зарэгістравана 40 744 выпадкі злаякасных новаўтварэнняў. Звыш 13 000 звязаны з курэннем. За 35 гадоў у краіне з-за тытунёвай звычкі толькі на рак лёгкага захварэла звыш 100 000 мужчын.

З'яўляецца ўсё больш звестак аб тым, што так званае пасіўнае курэнне спрыяе развіццю ў тых, хто не курыць, захворванняў, уласцівых курцам. Даказана сувязь пасіўнага курэння з захворваннямі сэрца, ракам лёгкіх, хранічнымі абструктыўнымі хваробамі лёгкіх — бранхіяльнай астмай і бранхітам.

Дзеці, чые бацькі курацъ, у большай ступені пакутуюць ад інфекцый дыхальных шляхоў, у тым ліку бранхіту і пнеўманіі, бранхіяльнай астмы, інфекцыйных хвароб вуха. Ёсць звесткі і аб тым, што такія дзеці больш рызыкуюць захварэць на лейкоз, лімфому, пухліну мозгу. Да таго ж, у дзяцей, чые бацькі курацъ у жылым памяшканні, можа развіцца нікацінавая залежнасць. Найбольш адчувальныя да пасіўнага курэння дзеці першых месяцаў жыцця. У ЗША нават зарэгістраваныя выпадкі раптоўнай смерці немаўлят з-за негатыўнага ўздзеяння тытунёвага дыму.

Святлана БАРЫСЕНКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.20	18.34	11.14
Віцебск —	7.11	18.22	11.11
Магілёў —	7.10	18.24	11.14
Гомель —	7.06	18.22	11.16
Гродна —	7.35	18.49	11.14
Брэст —	7.34	18.51	11.17

Месяц

Поўня 4 кастрычніка. Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Іраіды, Андрэя, Івана, Пятра.*

К. *Ганны, Арнольда, Артура, Браніслава.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

Геамагнітныя ўзрушэнні



Дзве даты

6 кастрычніка

1876 год — у вёсцы Асташына на Навагрудчыне нарадзіўся Ян Булгак, беларускі і польскі этнограф, фалькларыст, майстар мастацкага краязнаўчага фотаздымка. У 1919—39 гадах кіраваў лабараторыяй мастацкай фатаграфіі пры Віленскім універсітэце. Заснавальнік і кіраўнік фотаклуба Польшчы, Віленскага фотаклуба, саюза польскіх майстроў-фотаграфаў, польскага фатаграфічнага таварыства. Апублікаваў тысячы здымкаў беларускіх пейзажаў, вёсак, гаспадарчых пабудоў, сялян з розных этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Большасць ягонай фотатэкі згарэла ў пажары ў 1944 годзе.

1883 год — славуты Усходні экспрэс (апісаны ў тым ліку і Агатай Крысці) накіраваўся ў сваю першую 78-гадзінную паездку па маршруце Парыж—Канстанцінопаль.

Цытата дня:

«Слова павінна быць даклад-ным, дзеянне — рашучым».

Канфуцый (551—479 да н.э.), старажытнакітайскі мысліцель.

ЗВЯЗДА

Рэгіёны Расіі — у Беларусі

Сумесны беларуска-расійскі інфармацыйна-інтэграцыйны праект Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь і рэдакцыі газеты «Звязда»

Кабардзіна-Балкарская Рэспубліка

Арсен КАНОКАЎ:

«У НАС ДАЎНІЯ І ДОБРЫЯ АДНОСІНЫ З БЕЛАРУСКІМ НАРОДАМ»

Кабардзіна-Балкарская Рэспубліка належыць да ліку тых рэгіёнаў Расіі, дзе актыўна працуюць з замежнымі партнёрамі, геаграфія якіх вельмі разнастайная — Італія, Германія, Украіна, Азербайджан, Польшча. Усяго — дваццаць краін блізкага і далёкага замежжа. Як жа на гэтым фоне развіваецца супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь? І ў якой меры гэта ўзаемадзеянне закрануў фінансавы і эканамічны крызіс? На гэтыя і шэраг іншых пытанняў карэспандэнт «Звязды» папрасіў адказаць прэзідэнта Кабардзіна-Балкарскай Рэспублікі Арсена КАНОКАВА.

— Сёння ўзаемны тавараабарот паміж нашымі рэспублікамі параўнальна невялікі і не адпавядае эканамічным патэнцыялам бакоў, — адзначыў Арсен Башыравіч. — І мы гаварылі пра гэта на сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам у жніўні мінулага года. Аснова беларускага экспарту ў КБР — пастаўка мэблі, будматэрыялаў, хімвалакна, прадуктаў харчавання і некаторых відаў тавараў народнага ўжытку. Разам з тым беларускія прадпрыемствы гатовыя пастаўляць у рэспубліку дарожна-будаўнічую, сельскагаспадарчую, кар'ерную, лесатэхнічную, спецыяльную, камунальную тэхніку, прадукцыю аўтамабілебудавання, халадзільнікі. З КБР у Беларусь ідзе нафтапрамысловае абсталяванне, кабельная прадукцыя, алмазны інструмент. Таксама беларускіх спажыўцоў могуць зацікавіць такія тавары з Кабардзіна-Балкарыі, як вальфрам, малібдэн, экалагічна чыстая садавіна і агародніна, мінеральная вада і многае іншае.

Але ўсё ж дзелавыя і гандлёва-эканамічныя сувязі паміж нашымі рэспублікамі развіваюцца ў свабодным рынкавым палёце без усялякіх дзяржаўных прэферэнцый. Існуе таксама праблема, якая тармозіць развіццё гандлёва-эканамічных стасункаў паміж Беларуссю і Кабардзіна-Балкарыяй. Нам даводзіцца закупляць беларускую сельгастэхніку праз шматлікіх пасрэднікаў, хоць працаваць напрамую было б выгадней абодвум бакам. Мы ўсведамляем гэтыя прабелы. І цяпер рыхтуецца пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Кабардзіна-Балкарскай Рэспублікай Расійскай Федэрацыі аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве. Пасля яго падпісання адбудзецца абмен прадстаўнікамі, і, думаю, дакумент надасць імпульс развіццю нашых узаемадачыненняў. У рамках пагаднення можна будзе стварыць такія структуры, як Гандлёвы дом «Кабардзіна-Балкарыя» ў Мінску і Гандлёвы Дом «Беларусь» у Нальчыку. Прычым, «Беларусь» у Нальчыку ў сувязі з цэнтральным размяшчэннем Кабардзіна-Балкарыі на Паўночным Каўказе можа адыграць ролю рэгіянальнага Паўночна-Каўказскага прадстаўніка таваравытворцаў Рэспублікі Беларусь.

Што датычыцца ўплыву крызісу, то значнага змянення аб'ёмаў экспартна-імпартнага тавараабароту па гэтай прычыне ў нас у рэспубліцы не адбылося. Кабардзіна-Балкарыя дынамічна развіваецца, штогод зніжаючы датацыйнасць на пяць—сем працэнтаў і павялічваючы даходнасць бюджэту. У нашым экспарце пераважае харчовая прадукцыя, вырабы з чорных металаў, электрычныя машыны і абсталяванне. Асноўныя пастаўшчыкі экспартнай прадукцыі — акцыянерныя таварыствы «Кабельны завод «Каўказкабель» і «Халвовы завод «Нальчыцкі».

— Якія перспектывы мае развіццё вытворчай кааперацыі паміж Кабардзіна-Балкарыяй і Беларуссю?

— Безумоўна, вытворчая кааперацыя ў форме сумесных прадпрыемстваў можа даць добрыя вынікі. На беларускіх заводах захавалася традыцыйна высокая культура вытворчасці. Яны выпускаюць магутную, надзейную тэхніку, якая саступае лепшым заходнім узорам, магчыма, толькі крыху меншым узроўнем камфорту. Нам добра вядомыя беларускія МАЗы, БелАЗы, трактары, тралейбусы. Кабардзіна-Балкарская Рэспубліка — рэгіён з празмернай прапановай працы. На жаль, прастойваюць некаторыя прадпрыемствы, якія ў савецкія часы з'яўляліся часткай ваенна-прамысловага комплексу. Іх можна выкарыстоўваць для арганізацыі ліній па зборцы абсталявання, вырабу камплектавых частак для тэхнікі, якая рэалізоўваецца беларускімі прадпрыемствамі ў Паўночнакаўказскім рэгіёне. У нас ёсць станоўчы вопыт падобнай кааперацыі з Валгаградскай вобласцю па зборцы аўтобусаў «Валжанін» у адным з гарадоў рэспублікі — Баксане. На працягу шэрагу гадоў з беларускімі вытворцамі абутку, у тым ліку з прадпрыемствам «Белвест», актыўна працуе дзяржаўнае кабардзіна-балкарскае прадпрыемства «Нарбек», якое выпускае ліставы скуркардон, абутковыя заднікі, вусцілкі і мае ўласную абутковую вытворчасць. Пры аптымальна разлічанай эканамічнай мэтазгоднасці міжрэспубліканскі тандэм гэтых прадпрыемстваў можа таксама даць добрыя вынікі.

— Якія рэзервы бачаць у Кабардзіна-Балкарскай Рэспубліцы па актывізацыі супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь у рамках праграм Саюзнай дзяржавы, якія ўжо дзейнічаюць і яшчэ распрацоўваюцца на перспектыву?

— Мы вельмі хочам, каб станаўленне Саюзнай дзяржавы Расійская Федэрацыя — Рэспубліка Беларусь набірала максімальныя абароты і каб цэнтраімклівы рух уцягваў у яго і іншыя краіны былога вялікага Саюза. Кабардзіна-Балкарская Рэспубліка зробіць для гэтага ўсё, што ад яе залежыць.

Як вядома, некаторыя рэгіёны Беларусі пацярпелі ў час чарнобыльскай катастрофы. Кабардзіна-Балкарыя магла б прыняць актыўны ўдзел у аздараўленні людзей, якія прайшлі праз гэту бяду. У савецкія часы наша рэспубліка была добра вядомая як курортна-турыстычная Мекка з найвышэйшай вяршыняй Расіі і Еўропы — Эльбрусам. Тут праходзілі дзясяткі Усесаюзных турыстычных маршрутаў, а гарналыжнікі могуць катацца на горных схілах ледзь не круглы год. У наваколлі Эльбруса размешчана ўнікальная кліматычная здраўніца для астматыкаў. Сталіца рэспублікі — Нальчык — курортная, бальнеалагічная здраўніца, дзе дзякуючы лячэбнай гразі і нарзанам вылечваюцца дзясяткі захворванняў, у тым ліку апорна-рухальнага апарата, скурныя, гінекалагічныя, неўралагічныя і многія іншыя.

Кабардзіна-Балкарыя можа прапанаваць Рэспубліцы Беларусь комплекс курортна-турыстычных паслуг па дагаворы або прапанаваць стаць уладальнікам ці саўладальнікам здраўніц, набываючы іх або інвестуючы фінансавыя сродкі ў курортна-рэкрэацыйны комплекс (www.kbr-invest.ru). У сваю чаргу, для нас уяўляе вялікую цікавасць супрацоўніцтва ў сферах вышэйшай адукацыі, аховы здароўя, культуры, у якіх Беларусь традыцыйна займала высокія пазіцыі.

У народа Кабардзіна-Балкарскай Рэспублікі — даўнія і добрыя адносіны з беларускім народам. На працягу шэрагу гадоў саветнікам пасла Расійскай Федэрацыі ў Беларусі працаваў наш зямляк Анатоль Емузаў. Прадстаўніком культурных інтарэсаў беларусаў у нашай рэспубліцы сёння з'яўляецца кіраўнік грамадскага руху «За яднанне» — «Сябры», дэпутат Парламента Кабардзіна-Балкарскай Рэспублікі Павел Сідарук. Хачу адзначыць, што да беларускай дыяспары шматнацыянальны народ рэспублікі ставіцца з глыбокай павагай. Інакш і быць не можа, таму што кабардзіна-балкарскія беларусы — шчырыя, прыстойныя і працавітыя людзі.

— Якім магло б быць супрацоўніцтва прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнэсу Кабардзіна-Балкарыі і Беларусі?

— Малы і сярэдні бізнэс — гэта першапачаткова мала кіраваныя рынкавыя формы. Яны існуюць, каб запаўняць свабодныя эканамічныя нішы. Думаецца, што Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Кабардзіна-Балкарскай Рэспублікай аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве дазволіць усебакова прааналізаваць рынкі нашых суб'ектаў гаспадарання. Сёння аб ролі малога прадпрымальніцтва ў нашых узаемаадносінах унутры Кабардзіна-Балкарыі мы можам меркаваць толькі па прысутных на нашых рынках беларускіх таварах.

Пытанні задаваў Барыс ЗАЛЕСКІ.

Валагодская вобласць

«УЗЯЦЬ УСЕАГУЛЬНАЕ БЛАГАСЛАВЕННЕ»

У апошні перадшлюбны дзень выкананне ўсіх асноўных абрадаў звычайна пачыналася бліжэй да вечара. Аднак у некаторых рэгіёнах Беларусі, напрыклад, у Пружанскім, Ваўкавыскім, Слонімскім раёнах, маладыя з раніцы павінны былі пайсці ў царкву на споведзь. Але перш трэба было абысці ўсе падворкі ў вёсцы.

● Завітаўшы ў кожны з іх (жаніх і нявеста хадзілі паасобку), яны нізка кланяліся спачатку чырвонаму куту, затым хлебнай дзяжы, а потым і гаспадарам хаты. Пыталіся, ці не вінаватыя яны ў чым-небудзь перад імі. Такі абрад насіў назву перапросіны. Тым самым маладыя прасілі благаслаўлення на добрае сямейнае жыццё не толькі ў бацькоў і сваякоў, але і ў членаў абшчыны, у якой яны жылі.

● У некаторых рэгіёнах гэты абрад называлі «адпраўляцца кланяцца». Пакуль сяброўкі і свахі прыбіралі хату да вяселля, мылі лавы, сталы, падлогу, нявеста з адной сяброўкай абыходзіла ўсе падворкі, кланялася тройчы ў пояс гаспадарам, прасіла прабачэння за ўсе грахі і запрашала на вяселле. А тыя, у сваю чаргу, адказвалі: «Богу святому кланяйся, дзіцятка. Дай жа, Божа, табе шчасця і долі і ўсяго, чаго ты сабе ад Бога просіш».

● Лічылася, што чым больш падворкаў наведае нявеста, тым шчаслівейшым будзе яе сямейнае жыццё. Акрамя гэтага, нявеста запрашала моладзь на дзявочы вечар.

● Калі нявеста была сіратой, то раніцай яна хадзіла на магілу сваіх бацькоў, «каб спытаць благаслаўлення ў сваіх бацькоў-нябожчыкаў».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Дзве сяброўкі:

— Ты чаго такая змрочная з раніцы?

— Ды сон дрэнны прысніўся...

— Які?

— Прыснілася, што да мяне ў кватэру прыйшлі Брус Уіліс і Брэд Піт і пачалі біцца з-за мяне з маім мужам.

— Дык гэта ж мара, а не сон!

— Так, але муж іх пабіў, к-казёл!..

☺

Лёгкімі рухамі нажніц канатаходзец ператвараецца ў Тарзана.

☺

— Нездарма я столькі за дзяўчатамі бегаў — знайшоў сабе такі цуд!

— Яна бегае марудней за ўсіх?!

☺

Ніколі не пакідайце ў прыбіральні кубік Рубіка...

☺

У аптэцы.

— Мой муж пастаянна скардзіцца на боль у грудзях, удушша, курчы і галавакружэнне. У вас прадаюцца бярушы?

☺

Самае цяжкае жыццё — у молі. А вы паспрабуйце зімой у футболках, летам у футрах.

☺

— Афіцыянт, у вас у меню напісана «марожанае з арэхамі», а я ўжо амаль усю порцыю з'еў, а арэхаў не знайшоў.

— Ды ёсць там арэхі, гэта ў вас зубы рэдкія.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 5461. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12